Ленинград, Университет. набережн. 7-а, фундамент. библ. чит. безв. абон. | абон.-1

На змову міжнароднага КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЙНАГА МЕНШАВІЗМУ, выялістаў супроць савецкай пяцігодкі—

БЕЛАРУСКАЯ БЕЛША АДНАСОБНАЕ РАЗГОРТВАНЬНЕМ МАГУТНАГА СТАЛІНСКАГА ПРЫЗЫВУ Ў КАЛГАСЫ

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі

Год выданьня—XV
№ 59 (3963)
ПАНЯДЗЕЛАК, 2 САКАВІКА
1931 г.
Цана нумару 5 коп.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

Праверка павінна даць новы ўздым тэмпаў калгаснага прыліву і падрыхтоўкі да бальшавіцкай сяўбы

Рашучы ўдар па апартуністу і кулаку, па шкодніку і бюракрату, якія зрываюць выкананьне баявых задач веснавой сяўбы і калектывізацыі

Па-сталінску— за калектывізацыю

«Гатакае «расхищение» чалавечых сіл і працы, якое зьвязана з дробнай асобнай гаспадаркай, далей існаваць ня можа. У два і ў тры разы паднялася-б прадукцыйнасьць працы, у два і ў тры разы была-б захавана чалавечая праца для земляробства і народнай гаспадаркі, калі-б ад гэтай раздробленай дробнай гаспадаркі быў зроблен пераход да гаспадаркі грамадзкай».

У гэтых словах Уладзімер Ільліч з гэніяльнай прастатой сфармуляваў адну з «галоўнейшых задач пралетарыяту ў барацьбе за камунізм супроць капіталізму, за пабудову сацыялістычнай грамады.

Аб'яднаць мільёны дробных распыленых гаспадарак, калектывізаваць іх на базе машыннай індустрыі, арганізаваць буйнае с.-г. вытворства, каб вырваць карэньні капіталізму ў нашай краіне, каб перажагчы ў «апошніх і рашаючых баёх» з капіталізмам і буржуазіяй, вырастаючымі «пастаянна, штодзённа, кожную гадзіну, стыхійна і ў масавым маштабе» з дробнай сялянскай гаспадаркі—задача, за ажыцьцяўленьне якой Ленін змагаўся да канца свайго жыцьця, задача, выканаць якую ва што-б там ні стала наказваў Уладзімер Ільліч пралетарыяту і яго бальшавіцкай партыі.

Вялізарныя, нявымерныя перамогі партыі ў ажыцьцяўленьні гэтага ленінскага завету. Вялізарныя, нявымерныя перамогі партыі на фронце сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Вялізарныя, нявымерныя перамогі нашага калгаснага руху.

Капіталістычны сьвет, які задыхаецца ў цісках найглыбейшага эканамічнага крызысу, скрыгоча зубамі ад злосьці і з вочай нянавісьцю глядзіць, як у краіне дыктатуры пралетарыяту адбываецца гістарычная пераробка сельскай гаспадаркі, як асноўныя масы сялянства, круто павярнуўшы на шлях да сацыялізму,—аб'ядноўваюцца ў калгасы.

Цьвёрда памятаючы, што «буйная машынная прамысловасьць і перанясьленьне яе ў земляробства ёсьць адзіная эканамічная база, база сацыялізму, адзіная база для пасьпяховай барацьбы за пабудаваньне чалавецтва ад ярма капіталу» (Ленін), наша партыя, разграмліўшы трацкізм, зруйнаваўшы правы ўхіл, заваявала найбыльшую ў гісторыі тэмпы разгортвання індустрыялізацыі, буйнай машыннай прамысловасьці ў краіне Саветаў. На гэтай падставе мы заваявалі магчымасьць павесьці разьвіцьцё сельскай гаспадаркі па шляху, які ўказан Леніным, па шляху калгасаў і саўгасаў, па шляху калектывізацыі, па шляху арганізацыі буйнога, абагуленага сацыялістычнага с.-г. вытворства. На гэтай аснове, на базе разгортвання суцэльнай калектывізацыі мы змаглі перайсьці ад папіткі абмежаванай эксплёататарскіх тэндэнцый кулацтва да ліквідацыі яго як клясы. На гэтай аснове мы дабіліся таго, што сацыялістычны сэктар заняў рашаючае месца ў сельскай гаспадарцы, што серадняк з саюзьніка рабочай клясы зрабіўся яе апорай у калгасах у раёнах суцэльнай калектывізацыі.

Ці можна не адзначыць, якое гіганцкае гістарычнае значэньне ў гэтых перамогах калгаснага руху адыграў артыкул тав. СТАЛІНА «ГОЛОВОКРУЖЕНИЕ ОТ УСПЕХОВ», артыкул, які адлюстраваў ленінскія ўстаноўкі Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б). Мінуўшы сёньня год з дня апублікаваньня гэтага артыкулу ярка паказвае ўсю яго вялізную ролю ў дасягнутых намі посьпехах у ажыцьцяўленьні суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва як клясы на гэтай аснове. Чым заключаецца гэта роля, у чым гэта значэньне? У тым, што ленінскі Цэнтральны Камітэт артыкулам тав. Сталіна паставіў перад партыяй задачу—«замацаваць дасягнутыя посьпехі і плянамерна скарыстоўваць іх для далейшага прасоўваньня наперад»—задачу, выкананьне якой забясьпечылі цяперашнія перамогі справы суцэльнай калектывізацыі. У тым, што тав. Сталін у сваім артыкуле завастрыў увагу ўсёй партыі, усёй рабочай клясы і асноўных мас сялянства на змаганьні за выпраўленьне памылак і перагібаў, якія былі дапушчаны ў асобных мясцох у практыцы калгаснага руху. У тым, што тав. Сталін сваім артыкулам на аснове бязьлітаснай барацьбы на два фронты выкрыў «левых» апартуністаў, якія прабавалі шляхам ігнараваньня ленінскіх прынцыпаў добраахвотнасьці калгаснага руху, шляхам перагібаў і антысерадняцкіх скажэньняў разьвянчаць справу калектывізацыі, дапамагаючы гэтым самым клясаваму ворагу, граючы гэтым самым на руку праваму апартунізму. У тым, што тав. Сталін, выкрыўшы сутнасьць «головокружения от успехов», якое мела месца ў асобных мясцох, прыкаваў увагу ўсёй партыі да барацьбы за арцель, як «асноўнае зьвяно калгаснага руху», у тым, што яго артыкул зьявіўся разгорнутай праграмай партыі ў барацьбе за суцэльную калектывізацыю і ліквідацыю кулацтва як клясы на гэтай аснове, у тым, што тав. Сталін указаў, як трэба кіраваць калгасным рухам, як трэба праводзіць па-ленінску калектывізацыю.

«Уменьне кіраваць ёсьць сур'ёзная справа. Нельга адставаць ад руху, бо адстаць значыць адарвацца ад мас. Але нельга і забягаць наперад, бо забегчы наперад, значыць страціць сувязь з масамі. Хто хоча кіраваць рухам і захаваць разам з тым сувязі з мільёнымі масамі, той павінен весьці барацьбу на два фронты — і супроць адстаючых і супроць забягаючых наперад» (І. Сталін).

Само жыцьцё даказала ўсю глыбокую правільнасьць гэтых бальшавіцкіх слоў. Само жыцьцё даказала, што толькі рашучае ажыцьцяўленьне задач, ва ўсю вышыню пастаўленых тав. Сталіным у яго артыкуле «Головокружение от успехов» забясьпечыла тыя гістарычныя посьпехі суцэльнай калектывізацыі, сьведкамі якіх сёньня зьяўляемся мы, сьведкамі якіх сёньня зьяўляецца ўвесь сьвет.

Бальшавіцкае прызнаньне, выпраўленьне памылак, якія былі дапушчаны ў асобных мясцох у практыцы калгаснага будаўніцтва, непрымірымая барацьба на два фронты і супроць правапартуністычнай стаўкі на самацёк у калгасным руху і супроць «лявацкіх» скажэньняў, што пльюць ваду на млын клясавага ворага, на млын правага апартунізму,—выклікалі новы магутны ўздым калектывізацыі, новы магутны ўздым калгаснага прыліву.

Паны Рамзіны, Громаны і Кандрацьцевы і іх беларускія агенты—контр-рэвалюцыйныя нацыянал-дэмакраты і шавіністы ўсіх копераў мелі надзею, што перагібшчыкі і апартуністы «зрабілі сваю справу», што дапушчаныя на мясцох перагібы выклікаюць антыкалгасную рэакцыю сярод сялянства, што «з калектывізацыяй скончана» і яны змогуць спакойна падрыхтоўваць рэстаўрацыю капіталізму ў нашай краіне.

Паны здраднікі жорстка памыліліся. Паноў майстроў ад інтэрвэнцыі падсьцерагло жорсткае і глыбокае расчараваньне. Мільённыя масы аднаасобнікаў беднякоў і сераднякоў адказалі на артыкул тав. Сталіна нябывалай хваляй энтузіязму, згуртаваньнем сваіх радоў вакол партыі для барацьбы з кулаком, адказалі масавым уступленьнем усюды ў калгасы. Які бязьлітасны адказ далі першая бальшавіцкая вясна ўсёй гэтай зграі пёкаяў франдускага імпэрыялізму і польскага фашызму.

Перавышаны ў некалькі раз першапачатковыя наметкі пяцігадовага пляну па калгасным будаўніцтве. І канцу пяцігодкі калектывізацыя СССР будзе завершана. Гэта ўжо беспаваротна вырашанае пытаньне. К канцу трэцяга гадоў пяцігодкі папова сялянскіх гаспадарак рэспублікі Саветаў будзе ў калгасах. Расьце і мацнее магутная хваля калгаснага прыліву, захапляючы ўсё новыя і новыя масы аднаасобнікаў—беднякоў і сераднякоў. Рабочая кляса, пад кіраўніцтвам партыі, разам з калгаснікамі і найцырэйшымі бядняцка-сераднякімі масамі сялянства вядзе пераможны штурм апошняга аплоту капіталістычнай эксплёатацыі ў вёсцы—кулацтва.

«Кулацтва асуджана і будзе ліквідавана» (І. Сталін).

Дасягненьні калгаснага будаўніцтва ў нас, у БССР, вялікія. Мы дабіліся 17 проц. калектывізацыі ўсіх бядняцка-сераднякіх гаспадарак. Стаўка контррэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў на хутар, «як адзіную базу прагрэсу ў сельскай гаспадарцы»,—біта самім жыцьцём. Але для нас, бальшавікоў, гэтыя посьпехі, сапраўды вялізарныя, пры нашых магчымасьцях зьяўляюцца невыстарчальнымі, нездавальняючымі. Мы можам і павінны дасягнуць значна большых вынікаў у нашай барацьбе за калектывізацыю Савецкай Беларусі, бо асноўныя масы сялянства за калгасы, бо асноўныя масы сялянства хочуць быць у калгасе. Справа толькі за тым, каб стаць на чале гэтага руху. Справа толькі за тым, каб партыйныя арганізацыі не спадзяваліся на самацёк, як гэта наглядаецца ў цэлым радзе раёнаў, а па-бальшавіцку змагаліся з апартунізмам, рыхтавалі новы калгасны прыліў, змагаліся за новы магутны ўздым суцэльнай калектывізацыі.

Гадавіну артыкулу Сталіна беднякі і сераднякі—аднаасобнікі адзначаюць новым рухам, які нарадзіўся ў мільённых масах—сталінскім калгасным прыліве. Тэлеграф штодзённа прыносіць весткі, што ў радзе раёнаў сталінскі прыліў у калгасы ідзе з нябывалым уздымам. Задача партыйных арганізацый—бездакладна стаць на чале гэтага руху, пабальшавіцку стаць капя руля сталінскага прыліву ў калгасы, не спадзяваца на самацёк, а з сапраўднай ленінскай энэргіяй арганізоўваць і ўзмацняць калгасны прыліў. Для гэтага трэба скарыстаць усе нашы багацейшыя магчымасьці, на гэта павінны быць кінуты ўсе нашы сілы, уся наша энэргія.

Тая партыйная арганізацыя, якая не разгледзіць пабудовы тэмпаў падрыхтоўкі да другой калгаснай вясны, якая не скарыстае гістарычнай здобычы СНК і ЦК аб кантрактацыі для ўзмацненьня калгаснага прыліву, якая не стаіць на чале прыліву ў калгасы, якая ня спалучае калгаснага будаўніцтва з напружанай падрыхтоўкай да другой бальшавіцкай весны і барацьбой за выкананьне загатовак—гэта арганізацыя працуе не пабальшавіцку, гэта арганізацыя працуе дрэнна. І толькі па тым, як кожная раённая арганізацыя змагаецца за бальшавіцкія тэмпы калгаснага будаўніцтва,—можна судзіць аб ле рабоце, аб ле клясавай бязьдзельнасьці.

У гадавіну артыкулу тав. Сталіна, — вышэй тэмпы калгаснага будаўніцтва, вышэй тэмпы падрыхтоўкі да сяўбы, больш энэргіі, больш напорыстасьці ў ажыцьцяўленьні здобыч СНК і ЦК аб кантрактацыі і здобыч X зьезду саветаў БССР аб сканчэньні ўсіх відаў загатовак.

На спробы міжнароднага імпэрыялізму рукамі шкодніка ў, рукамі «прампартыі» і контр-рэвалюцыйных меншавікіх і эсэраўскіх арганізацый (Громана, Суханава, КПП) мільённыя масы беднякоў і сераднякоў адказваюць сталінскім заклікам у калгасы.

Гэты грозны адказ зруйнуе іх нікчэмныя спробы скінуць пралетарскую дыктатуру ў нашай краіне, рэстаўраваць капіталізм у республіцы Саветаў. Нахай аб гэтым памятаюць паны інтэрвэнты з франдускага генэральнага штабу, няхай аб гэтым памятаюць сацыял-здраднікі з меншавіцкага 2-га Інтэрнацыяналу.

14 калгасаў сталінскага прызыву

БАГУШЭЎСК. (Наш кар.).

Раённы зьезд калгасьнікаў Багушэўскага раёну абвясьціў сябе мабілізаваным на арганізацыю сталінскага прызыву ў калгасы. Зьезд у поўным складзе выехаў для работы па месцы.

У выніку работы брыгад зьезду **за 2 дні арганізаваны 9 новых калгасаў з 93 гаспадарак. Уступіла ў існуючыя калгасы 64 гаспадаркі.**

На першым месцы па калектывізацыі ідзе **Сідорыцкі** сельсавет, де калгасамі ахоплена 29 проц. усіх бядняцка-сераднякіх гаспадарак.

Буйнейшай гаспадаркай у гэтым сельсавеце зьяўляецца **польскі калгас «Чырвонае Турава»**, які к мінулым годзе складаўся з 6 гаспадарак, а цяпер налічвае 62.

С. І.

* *

ТАЛАЧЫНО. (Наш кар.). Удзельнікі талачынскага райзьезду калгасьнікаў прыступілі да рэалізацыі пастановы зьезду аб арганізацыі сталінскага прызыву ў калгасы.

За кароткі тэрмін пасьля зьезду па раёне **арганізавана 5 новых калгасаў: імя Леніна** ў Славінскім сельсавеце—з 15 гаспадарак, у вёсцы **Усьвейка**—з 22 гаспадарак, **Вішнёўка**—з 10 гаспадарак і вёсцы **Якубава** — з 12 гаспадарак.

У існуючыя калгасы ўступіла 20 гаспадарак.

П. С.

Уся вёска—у калгас

БОРКАВІЧЫ. (Наш кар.). У выніку разгортваньня масавай работы на арганізацыі сталінскага прызыву ў калгас імя Сталіна, Юзэфаўскага сельсавету, амаль цалкам уступіла вёска Масараўшчына.

У вёсцы Кашалёва ініцыятыўная група арганізацыйна афармляецца ў калгас з 12 гаспадарак.

Ёсьць прыліў і ў другія існуючыя калгасы.

Міскевіч.

Калгасны зьезд мабілізаваў сябе на правядзеньне сталінскага прызыву

ГАРАДОК. (Брыгада «Зьвязды» і «Праўды»).

Другі раённы калгасны зьезд мабілізаваў сябе на арганізацыю сталінскага прызыву.

20 актыўных калгасьнікаў—дэлегатаў зьезду выехалі на два тыдні ў сельсаветы для ліквідацыі прарываў у падрыхтоўцы да веснавой кампаніі, для правядзеньня кантрактацыі і калектывізацыі.

У адказ на выдумкі капіталістаў аб «прымусовай» працы ў СССР, зьезд далучыўся да заклику ленінградзкіх рабочых аб арганізацыі суботніка дапамогі транспарту.

ФАРБЭРАЎ, ГАРБАЧОЎ.

Барысаўшчына ўключаецца ва ўсесаюзную пасеўную эстафэту

КАЛГАС САВЕЦКАЯ КАМЕНКА ПАСТАВІЎ САБЕ ЗАДАЧАЙ КАЛЕКТЫВІЗАВАЦЬ СУСЬ... ВЕСКІ

БАРЫСАЎ. (Наш кар.).

Раённая газета «Барысаўскі ...шчыны», уключыўшы ...ю пасеўную эстафэту і ... праверкі, разгарнула работу ...

Раёнавы ... правядзеньня пасеўнай кампаніі ... сельсаветы накіраваны 32 работнікі на ўвесь час да канца сяўбы.

Фабрычна-заводзкія арганізацыі на лініі шэфтаварыства выдучылі рабочых брыгады ў падшэфныя сельсаветы на дапамогу пасеўнай кампаніі.

З усіх фабрык і заводаў пасланы каўалі для рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтару.

* *

БАРЫСАЎ. (Наш кар.).

Калгас Савецкая Каменка, Дэмільскага сельсавету, **уключыўся ва ўсесаюзную пасеўную эстафэту.** Калгас зьвярнуўся з адозвай да ўсіх калгасаў Барысаўскага раёну разгарнуць сталінскі прызыў у калгасы, паставіўшы сабе задачай ахапіць да клясы ў калгас аднаасобнікаў—беднякоў і сераднякоў суседніх вёсак.

Даньне на 15 гэкт. Плошча пасеву кармавых культур даводзіцца да 52 проц. усёй пасеўнай плошчы. Калгас поўнасьцю ссыпаў пасеўныя фонды. Вылучан фуражны фонд на вясну.

Калгас перайшоў на зьдзельшчыну **і выклікаў на сацспаборніцтва** на лепшае правядзеньне веснавой кампаніі **калгасы Дэмбелеўскага сельсавету** «Чырвоная зьмена» і «Пралетарская перамога». Калектыў Савецкай Каменкі абавязаўся сваячасова выканаць плян веснавой сяўбы, поўнасьцю ўкамплектаваць малочнае стада.

НЭЙДЛІН.

Рад сельсаветаў Капыльшчыны дабіліся зруху

КАПЫЛЬ. (Брыгада «Зьвязды» і «Праўды»).

На 1 лютага па Капыльскім раёне было калектывізавана **9,86 проц.** бядняцка-сераднякіх гаспадарак.

На працягу 20 дзён лютага процант калектывізацыі ўзрос да 11,3, а колькасьць калгасаў—з 48 да 54.

Па асобных сельсаветах процант калектывізацыі значна вышэйшы. Так, **Братноўскі** сельсавет калектывізаваны на 23 проц., **Крывасёлкаўскі**—на 20 проц. і г. д. У паказаных сельсаветах калгасьнікі вядуць вялікую масавую работу сярод аднаасобнікаў. **Сельсаветы стаяць на чале калгаснага руху.** Для прыкладу можна падаць вёску **Братковя**, дзе пасьля веснавога адліву з калгаса засталося толькі 18 гаспадарак з агульнай колькасьці 90. Да студзеня калгас нарос. Зараз у ім налічваецца ўжо 60 гаспадарак (5 заяў яшчэ не разгледжана), што складае 66 проц. калектывізацыі.

У вёсцы **Савічыкі**, дзе налічваецца 16 гаспадарак, **з ініцыятыўнай групы арганізаваўся калгас у 12 гаспадарак.**

Усе гэтыя посьпехі зьяўляюцца вынікам разгортваньня ва апошні час масавай работы ў радах сельсаветаў.

Але ёсьць яшчэ і адстаючыя сельсаветы. Так, у вёсцы **Дзягцяны** арганізавана ініцыятыўная група з 3-х чалавек, але ні адзін член сельсавету ня цікавіцца работай ініцыятыўнай групы і наогул калектывізацыяй. Такое-ж становішча і ў **Прускім сельсавеце**, дзе калектывізавана ўсяго 2,9 проц. бядняцка-сераднякіх гаспадарак, **Ляшнянскім**—2,9 проц., **Ванслеўскім** сельсавеце — 4 проц. і г. д. У гэтых вёсках сельсаветы не вядуць ніякай масавай работы, спадзяючыся толькі на самацёк.

ЦІМАФЕЕНКА.

Саўгасьнікі арганізавалі 3 калгасы

Боркі-Бялевічы заканчваюць падрыхтоўку

СЬВІНАГАДОЎЧЫ САЎГАС **БОРКІ-БЯЛЕВІЧЫ ЗАКАНЧВАЕ ПАДРЫХТОЎКУ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ.**

С.-Г. ІНВЭНТАР ПОЎНАСЬЦЮ АДРАМАНТАВАНЫ. НАСЕНЬНЕ АЧЫШЧАНА НА 100 ПРОЦ.

СТВОРАНЫ РАБОЧЫЯ БРЫГАДЫ ПА ПАЛЯВОДЗТВЕ, СЬВІНАГАДОЎЛІ І ЖЫВЕЛАГАДОЎЛІ.

СЯРОД БРЫГАД РАЗГАРНУЛАСЯ САЦСПАБОРНІЦТВА.

РАБОЧЫМІ САЎГАСУ АРГАНІЗАВАНЫ 3 КАЛГАСЫ, У ЯКІЯ УСТУПІЛА 80 БЯДНІЦКА-СЕРАДНІЯЦКІХ ГАСПАДАРАК, У ДВУХ СЕЛЬСАВЕТАХ АЧЫШЧАНА НАСЕНЬНЕ.

Дапамагчы польскаму калгасу „Ясны паранак"

Нацыянальны польскі калгас «Ясны паранак», Капыльскага раёну, знаходзіцца за 4 кілёмэтры ад мяжы з фашысцкай Польшчай. Калгас арганізаваўся ў студзені 1930 г. з 7-мі гаспадарак і ў цяперашні момант налічвае 15 гаспадарак, **у большасьці бядняцкіх.**

Калгас мае 116 гэктараў пахаці, 10 рабочых коняй, 10 таварных кароў, 8 шт. маладняка.

Калгасьнікі ўпарта змагаюцца з усімі труднасьцямі на шляху калгаснага будаўніцтва. Калгас «Ясны паранак» ідзе наперадзе іншых калгасаў па выкананьні сваіх абавязкаў перад дзяржавай. Замест 31 цэнтнера збожжавых культур ён здаў дзяржаве 43,5 цэнтнэра. У падарунак зьезду саветаў здана 8 цэнтнэраў пшаніцы.

Калгас мае ўсе падставы для далейшага росту і разьвіцьця, але **мясцовыя арганізацыі ня выконваюць дырэктывы партыі аб замацаваньні калгасу і не аказваюць яму належнага падтрыманьня.**

Гэта відаць хаця-б з таго, што за ўвесь час свайго існаваньня калгас ня можа атрымаць крэдытаў.

Абмалот да гэтага часу ня скончан толькі таму, што ў калгасе няма гумна для складаньня збожжа. Апошняе зьвезена з поля і знаходзіцца ў розных мясцох на адлегласьці 10 і больш кілёмэтраў, што ўскладняе работу па абмалоце. **Заўка праўленьня калгасу аб водпуску лесу не задаволена.** Былы кулацкі будынак не перададзены калгасу.

За ўвесь час ні адзін з раённых работнікаў не наведаў калгасу. Раённыя арганізацыі ня цікавяцца яго работай. **Да гэтага часу калгас не зямлеўпарадкаван. Вытворчы плян ужо месяц ляжыць у раённага агранома.**

Кулакі робяць розныя спробы развяліць калгас. Яны правакацыйнымі чуткамі прабуюць абвастрыць адносіны паміж калгасьнікамі і аднаасобнікамі.

Калгасьнікі сваёй упартай работай паказалі наўкольным аднаасобнікам перавагу калектыўнай гаспадаркі над індывідуальнай. Калгас заваяваў аўтарытэт. Настрой у аснoўнай частцы калгасьнікаў бадзёры, здаровы.

Сельсавету і райкалгасаюзу трэба, урэшце, зьвярнуць належную ўвагу на польскі нацыянальны калгас «Ясны паранак», аказаць яму дапамогу ў падрыхтоўцы да сяўбы. Трэба паклаўсьці канец апартуністычнай недаацэнцы работы на замацаваньні калгасу.

Брыгада «Зьвязды» і «Праўды»
Фрыд, Клюйко.

З 16,9 да 21,4 проц.

ШКЛОЎ. (Наш кар.).

Раённы зьезд калгасаў абвясьціў сталінскі прыліў у калгасы і мабілізаваўся на праверку падрыхтоўкі да веснавой сяўбы

ЗЬЕЗД ВЫЛУЧЫЎ 2 БРЫГАДЫ, ЯКІЯ АРГАНІЗАВАЛІ Ў САМЫХ АДСТАЛЫХ СЕЛЬСАВЕТАХ ТРЫ КАЛГАСЫ З 42 ГАСПАДАРАК.

У ЧАСЕ ЗЬЕЗДУ 26 ДЭЛЕГАТАЎ ПАДАЛІ ЗАЯВЫ АБ УСТУПЛЕНЬНІ Ў ПАРТЫЮ, 60 ДЭЛЕГАТАЎ АБВЯСЬЦІЛІ СЯБЕ ЎДАРНІКАМІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ СТАЛІНСКАГА ПРЫЛІВУ Ў КАЛГАСЫ.

Для інструктаваньня новых калгасаў да іх прымацаваны раённыя работнікі і старыя калгасьнікі.

ЗА ЧАС СПРАВАЗДАЧНА-ПЕРАВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ Ў ШКЛОЎСКІМ РАЁНЕ АРГАНІЗАВАЛАСЯ 14 НОВЫХ КАЛГАСАЎ, УСТУПІЛА Ў СТАРЫЯ КАЛГАСЫ 368 БЯДНЯЦКА - СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК.

Процант калектывізацыі ў раёне ўзрос з 16,9 да 21,4 проц.

Калгас „Іскра" даказаў перавагу калектыўнай гаспадаркі над індывідуальнай

ГЛУСК. (Брыгада «Зьвязды» і «Праўды»).

Кампанію ў калгас «Іскра» разгарнуў Глускага раёну, уступіла ...ёк сераднякіх гаспадарак.

Каб развяліць калгас, кулакі ў ...перавыбарчага сходу праўленьня на...лі калгасны будынак з інвэн...карманы. **На гэту тэрарыстычную вы...ку клясавага ворага калгасьнікі ад...запі ўдарнай падрыхтоўкай да веснавой сяўбы, а аднаасобнікі—уступленьнем у калгасы. На другі дзень пасьля пажару ў калгас уступілі дзьве новыя гаспадаркі.**

Калгасьнікі выклікалі на сацспаборніцтва **калгас імя Сталіна.**

Ужо дасягнуты першыя посьпехі ў падрыхтоўцы да весны. **Калгас забясьпечан насеньнем па ўсіх культурах. Насеньне ачышчана. Зараз праводзіцца ачыстка насеньня аднаасобных бядняцка-сераднякіх гаспадарак. Інвэнтар адрамантаваны. Адкрываецца майстэрня па рамонце інвэнтару для аднаасобных гаспадарак. Складзен плян веснавых пасеўных работ. Вызначаны нормы выпрацоўкі.**

...ПОЎ... ...ЦЫЯ... ...ЛЬНЫ... ...ЛЬНЫ... ...ЛЬНЫ

Працэс контр-рэвалюцыйнаи арганізацыі

МЕНШАВІКОЎ-ІНТЭРВЭНТАЎ

У саюзе з „прампартыяй“, „Торгпромом“ і кулацкай групай Кандрацьцева на сродкі буржуазіі і II інтэрнацыяналу— меншавікі імкнуліся затапіць у патоках крыві краіну Саветаў

На контр-рэвалюцыйныя замыслы агентаў Пуанкарэ-вайны, Чэмбэрленаў пралетары Менску адказваюць баявой мабілізацыяй усіх сваіх сіл

УСЕ ЗЛАЧЫНЦЫ БУДУЦЬ ВЫКРЫТЫ ДА КАНЦА

Судовы працэс буржуазнай контр-рэвалюцыйнай арганізацыі «саюзнага бюро» ЦК меншавікоў адразу прыканаў да сябе ўвагу рабочых і працоўных мас СССР і ўсяго сьвету. Ужо прыняты сотні і тысячы рэзалюцый рабочых і калгасьнікаў, якія выказваюць абурэньне агіднымі, контр - рэвалюцыйнымі выступленьнямі сацыял - шкоднікаў і сацыял - інтэрвэнтаў. Па ўсім Савецкім Саюзе ідзе хвала пратэстаў і абурэньня. Да яе далучаюцца рэвалюцыйныя рабочыя капіталістычных краін.

А на другі бок барыкады заварушыліся ўсе асіныя гнёзды здрадніцкага II Інтэрнацыяналу.

Пан Вандэрвэльдэ, літаральна не маргінуўшы вокам, заяўляе, што «руская сацыял - дэмакратыя да гэтага часу супрацьлялася ўсякай контр - рэвалюцыйнай інтэрвэнцыі і ўсялякім спробам паўстаньня». У пана Вандэрвэльдэ няма нават якога-небудзь пачуцьця меры — нават для самай беспардоннай хлусьні. Няўжо пан Вандэрвэльдэ думае, што рабочыя і працоўныя СССР забылі, як па другі дзень пасьля ўстаноўленьня савецкае ўлады ў Петраградзе меншавікі разам з эсэрамі паслалі казацкія палкі пад кіраўніцтвам **манархічнага генэрала Краснова** супроць рэвалюцыйнага гораду. А гэта-ж было зроблена **з санкцыі ЦК меншавіцкай партыі.**

Хіба не меншавікі разам з эсэрамі стварылі ў 1918 годзе рукамі чаха-славацкіх наймітаў францускага імпэрыялізму фронт грамадзянскай вайны ва Волзе і Урале пад сьцягам Устаноўчага Сходу? Ці не меншавікі разам з эсэрамі, кадэтамі і чорнасоценцамі арганізавалі ва Ўфе ў працівагу цэнтральнай савецкай уладзе так званую дырэкцыю, адным з членаў якой быў царскі генэрал Болдыраў, а яго памесьнікам—творца добраахвотнай, нарэшце дзяніцкай арміі, генэрал Аляксеў? Ці ня пан Гарві і К-о на Украіне віталі францускіх акупантаў і праслаўлялі дзяніцкую армію? Ці не меншавікі запрашалі у Баку войскі ангельскага імпэрыялізму?

Ад падтрыманьня замежнай інтэрвэнцыі і ўнутраной контр - рэвалюцыі ў мінулым вядзе просты шлях да сёньняш. падрыхтоўкі да інтэрвэнцыі і да сёньняш. АТР шкоднідтва, якія меншавікі [illegible] ворэнгрыцы усімі ня[illegible] ці і ва [illegible] стала.

[illegible] гісторыя нашай рэвалюцыі і контр-рэвалюцыі ведае [illegible] вігуру **Ікава**, старэйш[illegible] меншавік [illegible] десяткі год **здрадніцкай** [illegible] меншавізму, [illegible] [illegible]ньнальнікаў ліквідатарства, ярага абаронцу ў гады сусьветнай вайны, шаленага бальшавікаеда ў дні лютаўскай рэвалюцыі, адкрытага прыхільніка ўзброенага зьвяржэньня савецкай улады пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Гісторыя ведае **Гінзбурга**, — таксама, як старога, закаранелага меншавіка, таксама, як выдатнага ліквідатара і абаронцу, аднаго з кіраўнікоў кіеўскай меншавіцкай арганізацыі пасьля 1917 году, аднаго з рэдактароў газэты «Киевская мысль», якая стала на пазыцыі інтэрвэнцыі і ўзброенай ліквідацыі савецкай улады і якая абараняла нават манархічны гетманскі ўрад супроць паўстаўшых украінскіх сялян.

Гісторыя ведае шматгадовую ліквідатарскую работу **Шэра** ў маскоўскіх лежальных рабочых арганізацыях, ведае ролю Шэра ў маскоўскім савеце і ў маскоўскай вайсковай акрузе ў 1917 годзе, а пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі Шэр, як ён сам прызнаў у сваіх паказаньнях, таксама стаяў на пазыцыі ўзброенага зьвяржэньня савецкае ўлады.

Мінулае гэтых найбольш «заслужаных» з пункту гледжаньня меншавіцкага партыйнага стажу фігур працэсу асабліва цесна зьвязана з усім здрадніцкім і контр - рэвалюцыйным мінулым партыі меншавікоў, з палітыкай **крывавага задушэньня Кастрычніцкай рэвалюцыі, гвалтоўнага аднаўленьня ўлады буржуазіі.** Сучасная назыцыя Ікава, Гінзбурга, Шэра цалкам вынікае з іх пазыцыі пасьля Кастрычніка.

А калі Громан, Суханаў і некаторыя **іншыя падсудныя ставілі** пэўны час ставку не на ўзброенае зьвяржэньне савецкай улады, а на яе паступовае буржуазнае перараджэньне, на перамогу ў камуністычнай партыі правага апартунізму, які зьяўляецца агентурай капіталістычных элемэнтаў, дык палітыка наступленьня на капіталістычныя элемэнты, посьпехі разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва па ўсім фронце, разгром правага апартунізму павінны былі ўпэўніць гэтых людзей пакінуць усякія надзеі на бяскроўную перамогу капіталізму ў Савецкай краіне.

У свой час лідэры меншавікоў у «Социалистическом Вестнике» адмаўлялі шкодніцкую работу шахцінцаў, упэўнялі самым сур'ёзным чынам, што члены ЦК «прампартыі» узводзяць паклёп самі на сябе. Няўжо-ж гэтыя **«растленные» здрадзікі і пгуны па прафэсіі** прызнаюць цяпер сваю ўласную шкодніцкую работу, калі справа дайшла да іх?

Але была ў мышку ня ўтоіш, колькі-б не прысягаў Абрамовіч... **шкодніцкая работа «саюзнага бюро» ЦК меншавікоў прызнана яе непасрэднымі ўдзельнікамі.** Яна прызнана іх саюзнікамі з групы Кандрацьцева — Чаянава і «прампартыі»—Рамзіна. Яе адчулі на сябе дзесяткі мільёнаў рабочых і працоўных, якіх сацыял - інтэрвэнты прабавалі падняць супроць савецкай улады дэзарганізацыяй рабочага забесьпячэньня і грашовага звароту.

І таксама ня ўдасца «Социалистическому Вестнику» скрыць цясьнейшую сувязь паміж «саюзным бюро» і заграничнай дэлегацыяй. Тактыка «Торгпрома» ў мінулым працэсе не дапаможа цяпер Данам, Абрамовічам і Гарві...

Факты контр - рэвалюцыйнай здрадніцкай работы «саюзнага бюро» ЦК меншавікоў і земежнай дэлегацыі, якая натхняла яго работу, будуць з усёй відавочнасьцю выкрыты на судзе.

Меншавіцкія змоўшчыкі хацелі паталіць у крыві першую ў сьвеце рабочую дзяржаву. На іх мове гэта называлася аднаўленьнем дэмакратыі. Такая дэмакратыя існуе бок аб бок з СССР: у прыбалтыйскіх рэспубліках і Польшчы дзесятні тысяч рабочых, іх сем'і і дзеці паміраюць цяпер з голаду, дзе перадавых змагароў рабочае клясы катуюць і мучаюць фашысцкія каты ў сваіх засьценках, дзе дэмакратычная паліцыя пулпуе на Зах. Украіне дзесятні тысяч сялян. Гэту дэмакратыю хацелі навязаць нашай краіне меншавіцкія змоўшчыкі сіламі замежных штыхоў, выконваючы волю францускага імпэрыялізму.

Арганізатары і натхняцелі змовы — заграничны меншавіцкі цэнтр—2-гі Інтэрнацыянал і зьвязаныя з ім буржуазныя кіруючыя колы — яшчэ па-за межамі дасягаемасьці пралетарскага суда. Але рабочыя масы капіталістычных краін даведваюцца аб фактах, якія адкрываюць ім вочы на ролю сацыял-дэмакратыі, як простай агентуры буржуазіі, рыхтуючай новую крывавую бойню, рыхтуючай антысавецкую контр - рэвалюцыйную вайну.

І гэта дапаможа хутчэйшаму разгортваньню іх пасьпяховай барацьбы **супроць буржуазіі і супроць ня сацыял-фашысцкай, сацыял - інтэрвэнцыяністкай агентуры.** («Правда»).

Выкрыем да канца контр-рэвалюцыйную ролю сац.-дэмакратыі— простай агентуры імпэрыялістаў

Рэзалюцыя пратэсту агульнага сходу работнікаў і асьпірантаў БАН

Агульны сход работнікаў і асьпірантаў Беларускай Акадэміі Навук, заслухаўшы інфармацыю аб выкрыцьці контр - рэвалюцыйнай інтэрвэнцыяністкай меншавіцкай арганізацыі, так званага «саюзнага бюро» ЦК РСДРП, канстатуе:

1. Вялізарнейшыя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва ў краіне дыктатуры пралетарыяту — СССР, які дасягнуты рабочаю клясаю, калгасьнікамі і бядняцка-серадняцкімі масамі сялянства ў выніку ажыцьцяўленьня адзінаправільнай генэральнай лініі камуністычнай партыі, выклікаюць жорсткае, упартае супраціўленьне клясавых ворагаў як унутры краіны, так і шалёную нянавісьць сусьветнай буржуазіі і яе агентуры—II Інтэрнацыяналу.

2. Сусьветны эканамічны і палітычны крызіс, якім ахоплены ў сучасны момант буржуазныя краіны, хутка набліжае разьвязку рашучай схваткі паміж працай і капіталам, паміж эксплёатуемымі і эксплёататарамі. Сусьветны імпэрыялізм, шукаючы выхаду з гэтага крызісу, імкнецца ўсімі спосабамі зьнішчыць СССР — бацькаўшчыну сусьветнага пралетарыяту, цытадэль сусьветнага Кастрычніка.

3. У гэтай падрыхтоўцы да інтэрвэнцыі, накіраванай да зьнішчэньня дыктатуры пралетарыяту, да рэстаўрацыі капіталізму адбываецца кансалідацыя ўсіх сіл буржуазіі і яе лёкаяў і агентуры—сацыял-фашыстаў з II Інтэрнацыяналу. Выкрытая дзейнасьць новай інтэрвэнцыяністкай, шкодніцкай, контр-рэвалюцыйнай арганізацыі, так званага «саюзнага бюро» ЦК РСДРП меншавікоў яскрава аб гэтым сьведчыць. Контр-рэвалюцыйная меншавіцкая арганізацыя ставіла мэту, як і «прампартыя», кулацкая кандрацьцеўшчына, беларускія контр-рэвалюцыянэры, нацыянал-дэмакраты, — крывавае падаўленьне пралетарскай рэвалюцыі ў СССР, аднаўленьне ўлады капіталістаў і памешчыкаў, ператварэньне СССР у калёнію сусьветнай буржуазіі.

4. На інтэрвэнцыяністкую, шкодніцкую контр-рэвалюцыйную работу сацыял-фашыстаў і беларускіх нацдэмаў, рабочая клясa і ўсе працоўныя нашай краіны адкажуць яшчэ больш шчыльным згуртаваньнем сваіх радоў вакол камуністычнай партыі і яе ленінскага ЦК. Яшчэ з большым запалам, з большым энтузіязмам, будуць працаваць па выкананьні пяцігодкі за чатыры гады, па выкарчоўваньні карэньняў капіталізму, па будаўніцтве сацыялізму. Яшчэ больш узмацняць пільнасьць у адносінах да клясавых ворагаў, вядучы бязьлітасную барацьбу з імі.

Сход заклікае ўсіх работнікаў і асьпірантаў БАН і ўсіх вучоных і навуковых работнікаў БССР прыкласьці ўсе сілы, усю энэргію да зьнішчэньня прарываў у БАН, на ліквідацыю рэштак нацдамаўшчыны, каб ператварыць Акадэмію ў аўтарытэтнейшую навуковую марксысцка-ленінскую ўстанову, цытадэль пралетарскай навукі.

Сьмерць шкоднікам - інтэрвэнтам!

Шчыльней рады вакол камуністычнай партыі!

Няхай жыве АДПУ—верны вартавы пралетарскай дыктатуры!

Няхай жыве ленінская партыя—кіраўнік пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва!

Патрабуем бязьлітаснага пакараньня для меншавіцкай банды

Контр - рэвалюцыянэры — меншавікі разам з міжнароднай буржуазіяй, «прампартыі», «Торгпромом» і па загаду сацыял-фашысцкага Інтэрнацыяналу прымалі ўсе меры да таго, каб сарваць пераможнае сацыялістычнае будаўніцтва ў краіне Саветаў. Рэшткі меншавізму ў СССР па заданьнях імпэрыялістаў і ў поўным кантакце з II Інтэрнацыяналам арганізавалі шкодніцкія групы ў важнейшых арганізацыях савецкага апарату, каб нагоршыць становішча Савецкага Саюзу і паскорыць падрыхтоўку інтэрвэнцыі сусьветнага імпэрыялізму супроць СССР.

У адказ на шкодніцтва контр-рэвалюцыянэраў-меншавікоў рабочыя заводу «Камунар» заяўляюць, што яны яшчэ мацней згуртуюцца вакол ленінскай партыі і выканаюць усе заданьні трэцяга рашаючага году пяцігодкі, на гледзячы на ўсе труднасьці.

Самым вузкім месцам зьяляецца ў нас зараз транспарт. Таму **абавязуемся нашай штодзённай работай дапамагаць транспарту шляхам вывучэньня брыгад на дапамогу транспарту.**

Мы патрабуем ад пралетарскага суда самага жорсткага пакараньня для шкоднікаў контр - рэвалюцыянэраў— меншавікоў, агентаў капіталу.

Няхай жыве АДПУ, выкрыўшая гэту контр-рэвалюцыйную арганізацыю!

Няхай жыве ленінская камуністычная партыя!

Няхай жыве штаб сусьветнай рэвалюцыі—Камінтэрн!

У бюро парткалектыву гарбарні „Бальшавік“

Выкрытае контр-рэвалюцыйнае шкодніцтва меншавікоў, якія сумесна і на грошы міжнароднай буржуазіі падрыхтоўваюць інтэрвэнцыю для зьнішчэньня Кастрычніцкіх завяваньняў і аднаўленьня капіталізму ў СССР, не дае нам права заставацца па-за радамі партыі.

Калі ўся міжнародная буржуазія пайшла ў паход супроць адзінай у сьвеце пралетарскай дзяржавы, супроць правільнай генэральнай лініі партыі, мы просім прыняць нас у рады партыі, каб мець магчымасьць у радох партыі змагацца за ажыцьцяўленьне сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

Заклікаем усіх астатніх лепшых ударнікаў заводу пасьледваць нашаму прыкладу.

РУДАКОЎСКІ АНТОН, вытворчы стаж 25 год, ШАПІРА МАЙСЕЙ—стаж 27 год, РУБЕНЧЫК ЛЕЙБА — стаж 10 год, ШНЭЙДЭР ХАІМ — стаж 15 год, ФЭЙГЕЛЬМАН—стаж 12 год, КУДРАВАНАВА (жанчына)—стаж 13 год, БУРДО — стаж 9 год, ШАПІРА—стаж 8 год, ГЕЛЬФАНД Х.—стаж 7 год, ЭНЦІН—стаж 7 год, НОРКІН—стаж 6 год.

Галоўны падсудны—II інтэрнацыянал

„Ротэ Фанэ“ аб працэсе

БЭРЛІН, 28. **«Ротэ Фанэ»** канстатуе, што сацыял-фашысцкі «Форвэртс» у сваім вячэрнім выданьні хлусіць, калі заяўляе, што між 2-м Інтэрнацыяналам і абвінавачанымі меншавікамі-інтэрвэнцыяністамі няма ніякай сувязі. Што гэта паклёп, пацьвярджаецца хоць бы тым, што ў раніншім выданьні таго-ж «Форвэртса» апублікаваны ліст Вандэрвэльдэ, накіраваны ў Маскву СНК СССР, у якім аўтар у якасьці старшыні выканаўчага камітэту 2-га Інтэрнацыяналу пацьвярджае, што 2-гі Інтэрнацыянал меў [illegible] сувязь з рэшткамі расумненьня, што гэтыя сувязі да гэтага часу існуюць. Вандэрвэльдэ ў сваім лісьце, між іншым, заяўляе:

«Выканаўчы камітэт сацыялістычнага Інтэрнацыяналу непарўўна знаходзіцца ў цеснай сувязі з сацыял-дэмакратычнай партыяй Расіі і пільна сочыць за яе дзейнасьцю». Гэта, — піша «Ротэ Фанэ», — вельмі каштоўны дадатак да абвінавачаўчага заключэньня супроць Громана і іншых. Гэты ліст, зразумела, рэзка супярэчыць спробам «Форвэртса» адмаўляць усялякую сувязь».

Значэньне гэтага працэсу, — піша далей газэта, — заключаецца ў тым, што ён пакажа сацыял-дэмакратычным рабочым, якія ўсё яшчэ сумняваюцца, **што лідэры і іх «Інтэрнацыянал» дабіваюцца зьвяржэньня савецкай сыстэмы.** Усе напады злосьць і бессаромныя спробы [illegible]ленньня з боку сацыял-дэмакратыі ня друку зьяўляюцца толькі выр[illegible]сьільнай злобы ілжывага сацыял[illegible], з прычыны немагчымасьці [illegible] выкрыцьцю інтэрвэнцыяністкай актыўнасьці 2 Інтэрнацыяналу на працэсе. **На лаве падсудных у Маскве сядзіць ня толькі Громан, ці другі лёкай міжнароднага фінансавага капіталу, — канстатуе «Ротэ Фанэ», — а сядзіць у якасьці галоўнага абвінавачанага 2-гі Інтэрнацыянал, і, не ў апошнім радзе, нямецкая сацыял-дэмакратыя, як ідэалёгічныя натхняцелі інтэрвэнцыі і контр-рэвалюцыйнага паўстаньня супроць Савецкага Саюзу.**

Ударнымі брыгадамі і „воскресниками“— пралетары Гомелю б'юць па меншавіцкай бандзе

ГОМЕЛЬ. (Наш карэспандэнт).

28-га лютага, як толькі дайшлі весткі аб апублікаваньні абвінаваўчага заключэньня па справе контр - рэвалюцыйнай меншавіцкай арганізацыі ГРОМАНА і іншых, стыхійна на ўсіх прадпрыемствах Гомелю адбыліся шматлюдныя бурныя мітынгі рабочых. У сваіх пастановах рабочыя патрабуюць ад ураду самага суровага пакараньня для шкоднікаў меншавіцкай банды, агентаў імпэрыялізму.

У адказ на гэта, — гаворыцца ў рэзалюцыях «ГОМСЕЛЬМАША» і «ПРАЛЕТАРА», — мы запэўняем ЦК нашай партыі і ўрад, што мы прыкладзем усе намаганьні да пасьпяховага правядзеньня другой бальшавіцкай вясны.

«Пралетарцы» ўзялі на сябе абавязак дабіцца ў падшэфным сельсавеце ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ СЯЎБЫ НА 102 ПРОЦ., што раўняецца ВЫКАНАНЬНЮ ПЛЯНУ ДРУГОГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ.

СТВОРАНА НОВАЯ БРЫГАДА З УДАРНІКАЎ «ПРАЛЕТАРА», «ЛАНЦУЦКАГА» ДЛЯ ДАПАМОГІ ЧЫГУНАЧНАМУ ТРАНСПАРТУ.

Па ініцыятыве камсамольскага калектыву заводу «ПРАЛЕТАРЫ» АРГАНІЗОЎВАЕЦЦА «ВОСКРЕСНИК» ПА ЗБОРЫ ЛОМУ. КАМСАМОЛЬЦЫ «ПРАЛЕТАРА» ВЫКЛІКАЮЦЬ УСЕ КАМСАМОЛЬСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ БЕЛАРУСІ АРГАНІЗАВАЦЬ ПАХОД КАМСАМОЛУ НА ЗБОР ЛОМУ МАРТЭНАМ.

Арганізуюць рамонтныя брыгады для дапамогі транспарту

Заслухаўшы інфармацыю аб контр-рэвалюцыйнай арганізацыі меншавікоў з «саюзным бюро» ЦК РСДРП на чале, мітынг **рабочых і работніц заводу «Камінтэрн» канстатуе:**

1. Няўхільна ажыцьцяўляючы задачы індустрыялізацыі краіны, рабочая клясa пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі дабілася вялізарнейшых посьпехаў у выкананьні ленінскага лёзунгу «дагнаць і перагнаць» у тэхнічна-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны.

Магутны рост індустрыі СССР забясьпечыў круты паваот асноўных мас сялянства на шырокі шлях калектывізацыі. Дзякуючы правільнай ленінскай лініі партыя дабілася значнага росту і умацаваньня сваіх радоў за лік перадавых рабочых у горадзе, батракоў, беднякоў, калгасьнікаў і лепшай часткі сераднякоў — на вёсцы.

2. Працэс «прампартыі» выразна паказаў усяму Савецкаму Саюзу, і сусьветнаму пралетарыяту, што магутны рост сацыялістычнай гаспадаркі Савецкага Саюзу не дае спакою міжнародным імпэрыялістам, якія шаленымі тэмпамі рыхтуюць узброеную інтэрвэнцыю супроць краіны Саветаў. Выкрытая контр-рэвалюцыйная арганізацыя меншавікоў прасьледвала тым-жа самым моты, што і «прампартыя», а іменна—зьвяржэньне савецкай улады і аднаўленьне ў СССР капіталістычнага ладу.

Гэта ўстаноўка на сваёй сутнасьці зьяўлялася ўстаноўкай II Інтэрнацыяналу і міжнароднай буржуазіі, якая ўвесь час маральна і матэрыяльна дапамагала гэтай меншавіцкай бандзе праводзіць контр-рэвалюцыйную і шкодніцкую работу ўнутры СССР. Выходзячы з гэтага, мітынг пастанаўляе:

Патрабаваць ад Вярхоўнага суда СССР самага суровага пакараньня контр-рэвалюцыйных меншавікоў, гэтых здрадзікаў і дапаможнікаў інтэрвэнтам.

У адказ на выкрытую контр-рэвалюцыйную арганізацыю, рабочыя і работніцы абавязваюцца выканаць і перавыканаць прамфінплян трэцяга рашаючага году пяцігодкі, арганізаваць рамонтныя брыгады для ліквідацыі прарываў на транспарце.

Яшчэ больш разгарнуць работу па інтэрнацыянальным выхаваньні рабочых, сыстэматычна насьляючы ў камуністычную партыю лепшых рабочых ударнікаў.

Няхай жыве ленінская партыя — правадыр рабочае клясы!

Няхай жыве АДПУ — верны вартаўнік дыктатуры пралетарыяту!

Няхай жыве сусьветны Кастрычнік!

1-га сакавіка

Вячэрняе пасяджэньне

Яшчэ задоўга да ўпуску публікі ў калённую залю, Дом Саюзаў асаджаецца вялізарным натоўпам. Роўна ў 5 гадзін адчыняюцца дзьверы Дому Саюзаў. Вялізарная заля шпарка напаўняецца... У 6 гадз. 15 хв. уводзяць падсудных. У 6 гадз. 20 хв. за судзейскім сталом зьяўляецца старшыня спэцыяльнай прысутнасьці Вярхоўнага суда СССР **т. Швэрнік,** члены прысутнасьці **т. т. Муракаў і Антонаў - Саратаўскі** і запасныя члены суда т. т. **Арцюхіна і Пранішнікаў.**

За пракурорскім сталом — т. т. Крыленка і Рагінскі.

На мясцох для абароны члены Маскоўскай калегіі абаронцаў **т. т. Камодаў і Браўдэ.** Першы абараняе падсудныя Фін-Енатаеўскага, другі — падсудных Рубіна і Воўкава.

Дзяржаўны абвінаваўца т. Крыленка ўзьнімае перад судом хадайніцтва аб выкліку 6 сьведак.—На судзе патрэбна ўстанавіць існаваўшую сувязь паміж так званым «саюзным бюро» РСДРП (меншавікоў) і кулацкай контр-рэвалюцыйнай групай, якая называла сябе «Трудовой крестьянской партией»,—гаворыць таў. Крыленко. Таму ён просіць суд выклікаць у якасьці сьведак ідэёлага кіраўніка і натхняцеля гэтай групы былога праф. Кандрацьцева.

Для ўстанаўленьня сувязі «саюзнага бюро» з другой контр-рэвалюцыйнай групай—«прампартыяй» абвінавачаньне просіць выклікаць у якасьці сьведак ужо засужаных на працэсе «прампартыі» Рамзіна і Ларычава.

Абвінавачаньне таксама просіць выклікаць у якасьці сьведак Гвазьдзёва, Някрасава і Жалудкова, сьледства над якімі вядзецца і справа якіх вылучана.

Абарона і падсудныя не супярэчаць супроць прапановы дзяржаўнага абвінаваўцы. Спэцыяльная прысутнасьць задаволіла хадайніцтва пракуратуры.

Потым сакратар чытае абвінаваўчае заключэньне.

У фашысцкай Польшчы

Эканамічны крызіс Польшчы паглыбляецца

Гаспадарчае становішча ў фашысцкай Польшчы з кожным днём усё больш і больш пагаршаецца. Катастрафічны упадак польскай прамысловасьці і зямляробства падкрэсьлівае ўся фашысцкая прэса.

«Банк краявой гаспадаркі» эканамічную сытуацыю на сёньняшні дзень малюе вельмі цьмянымі фарбамі. Стан зямляробства, дзякуючы далейшаму зьніжэньню цэн на збожжа і жывёлагадоўчыя прадукты, у асабліваесьці на сьвіней, вельмі пагоршыўся.

На павялічэньне гаспадарчых труднасьцяй меў значны ўплыў упад у студзені таварнага экспарту, а іменна збожжа, сьвіней і яек; збыт цукру моцна скараціўся і заграніцай і ў краіне.

Спыненьне савецкіх заказаў на дастаўку жалеза і іншых вырабаў цяжкой металюргіі моцна ўдарыла па жалезапрацоўчай прамысловасьці. Тут, як і раней, панує крызіс і няма надзеі на паляпшэньне. Металюргічная прамысловасьць у значнай меры не выкарыстоўвае сваёй вытворчай магутнасьці. Тлумачыцца гэта сэзонным застоем і аслабаньнем попыту на машыны. Адбылося таксама далейшае зьніжэньне прадукцыі ў тэкстыльнай вытворчасьці.

Экспарт дрэва параўнальна са сьнежнем мінулага году зьвяліўся амаль на палову.

Такі-ж крызісны стан перажываюць і такія галіны прамысловасьці, як **папяровая, гарбарная, хэмічная і мінэральная, прадукцыя** якіх ня толькі не павялічваецца, але наадварот, **усё больш зьмяншаецца з прычыны адсутнасьці рынку збыту.**

Польскія капіталісты для павялічэньня прыбытку пры дзейным падтрыманьні фашысцкай улады і **сацыял-фашызму** праводзяць жорсткае наступленьне на рабочую клясу Польшчы. Усюды пачалося зьніжэньне зарплаты і скарачэньне колькасьці рабочых. Так, орган фашысцкай эндэцыі «Газэта Варшавска» ад 21-га лютага паведамляе, што ў **Катавіцах закрыты амаль усе цынкавыя заводы.**

Саюз фабрыкантаў зьнізіў «зарплату ў яшчэ занятых рабочых на 7 проц. У Катавіцах канфэрэнцыя горнапрамысловцаў абвясьціла аб **15-процантным зьніжэньні зарплаты.**

Кампанія зьніжэньня зарплаты асабліва жорстка праводзіцца на **дзяржаўных прадпрыемствах.** Так, дзяржаўны дзяржаўных лясоў **у Гайноўцы правяла зьніжэньне зарплаты на 30-50 проц.**

Дзякуючы разьвіцьцю эканамічнага крызісу, беспрацоўе ў Польшчы дайшло да катастрафічных разьмераў. Паводле апошніх афіцыйных даных у Польшчы налічваецца звыш **350.000 беспрацоўных.**

Такім чынам, сама фашысцкая проса прызнае, што **гаспадарка Польшчы шпарка ідзе да поўнага руйнаваньня.**

КАТАРЖНЫЯ ПРЫСУДЫ НАД РЭВАЛЮЦЫЙНЫМІ РАБОЧЫМІ

Разгул фашысцкага тэрору ў Польшчы ў апошнія часы набыў нячуваныя разьмеры. Разьюшаная паліцэйшчына разграмляе ўсе рэвалюцыйныя арганізацыі пралетарыяту і працоўнага сялянства. Няма таго дня, каб фашысцкая прэса не паведамляла аб масавых арыштах, якія адбываюцца па ўсіх гарадох і вёсках Польшчы. Катаржныя шматгадовыя прысуды фашысцкага суда сыплюцца на лепшых прадстаўнікоў рэвалюцыйнага лягеру, як з «рога ізобілія». Так, афіцыяльны орган пілсудчыны «Газэта Польска» ад 21-га лютага паведамляе, што «Любліньскім акруговым судом 13 рэвалюцыйных рабочых засуджаны:

П. Рыбак і Ф. Сьпіўка на 8 год катаржных работ кожны, В. Іванашко, А. Езёр, І. Багаволя, Ф. Гольдблят, С. Ганкевіч — па 7 год, М. Рубінштэйн І. Эрпіхман, В. Развадоўскі — па 6 год катаргі, Н. Грунбаўм, С. Манкевіч — па 4 гады катаргі, І. Дубаля — 1 год катаргі. У агульнай суме 13 асоб кінута ў каменныя мяшкі на 80 год.

Той самы фашысцкі афіцыёз ад 22 лютага падае аб новым палітычным працэсе, які адбыўся **ў Беластоцкім акруговым судзе.** На гэты раз з лавы падсудных абвінавацілі 8 асоб па абвінавачэньні нібы ў камуністычнай дзейнасьці. Судовы фарс адбыўся **бяз прысутнасьці абвінавачаных, якія за дэманстрацыю супроць фашысцкага суда былі выведзены з судовай залі. У выніку 3 асобы [illegible] суджаны на 6 год катаржных работ [illegible] ны, 3 асобы — на 3 гады кожны і [illegible] ба на 1 год катаргі.**

Адначасова палітычны працэс адбыўся і ў Горадзенскім акруговым судзе. Адказвалі за прыналежнасьць ніби да камуністычнай партыі Заход. Беларусі **Г. Родшуль** і былы вучань беларускай Віленскай гімназіі **Таўпека.**

Пасьля кароткага разгляду **фашысцкі суд прысудзіў першага на 6 год, а другога—на 4 гады катаргі.**

ГАЛОДНЫЯ ДЗІЦЯЧЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ У ВАРШАВЕ

ВАРШАВА, 26. Паводле падлікаў варшаўскага магістрату, у варшаўскіх пачатковых школах ёсьць у даны момант **16.000 галодных і напалову галодных дзяцей, бацькі якіх ня маюць работы.** Паводле другіх даных, 40 проц. дзяцей, дасягнуўшых школьнага ўзросту, застануцца ў будучым навучальным годзе па-за школай з тэй-жа прычыны. Зразумела, што па-за школай аказваюцца **дзеці беднякоў і ў першую чаргу беспрацоўных.** У Варшаве на працягу апошніх дзён адбылося даўже дэманстрацыі соцень пралетарскіх дзяцей. Галодныя, босыя дзеці выпаі на вуліцу стройнымі радамі. Яны несьлі плякаты з надпісамі: «Работы нашым бацькам, хлеба — маткам». Дзеці прайшлі па вуліцах гарадзкой беднаты.

Нязвычайная дэманстрацыя — галодны паход дзяцей — рабіла вялізарнейшае ўражаньне. Жанчыны, праходзячыя па вуліцах, плакалі, гледзячы на паход змораных ад голаду дзяцей. З-над брам дамоў гарадзкой беднаты жанчыны выносілі дзецям хлеб і інш. харчы. Паліцыя кінулася на дзяцей з гумовымі палкамі і пачала іх разганяць. Над паліцыі дзеці вымушаны былі разыйдзіся. Але доўга яшчэ чутна былі дзіцячыя крыкі на вуліцах «дайце нам хлеба, мы галодныя. Далоў фашызм і капіталізм».

Новы наркамфін БССР тав. Хацкевіч

Пастановай апошняй сэсіі ЦВК тав. Хацкевіч назначан народным камісарам фінансаў БССР.

***

Хацкевіч, Аляксандр Ісакавіч, нарадзіўся ў 1895 годзе, на нацыянальнасьці — беларус, рабочы лесапільных заводаў, з бедных сялян. У камуністычную партыю ўступіў у сакавіку 1917 г. Пры нямецкай акупацыі т. Хацкевіч за надпольную работу прасьледваўся, падпадаў вобыскам і арыштам.

Партыйна-савецкую работу на Беларусі тав. Хацкевіч пачаў з старшыні пчэйкі ва ўкоме і валрэўкоме. З 1920 г. па працягу 5 год тав. Хацкевіч быў старшынёй павятовага і акруговага выканаўчых камітэтаў (Барысаў, Магілеў). Потым быў народным камісарам унутраных спраў БССР. Прадстаўніком БССР пры ўрадзе СССР у Маскве, а потым на працягу 4-х год сакратаром ЦВК БССР.

З 1920 году т. Хацкевіч выбіраецца ў кіруючыя органы КП(б)Б — ЦБ КП(б)Б і потым ЦК КП(б)Б.

У сучасны момант член прэзыдыуму ЦВК СССР і кандыдат у члены бюро ЦК КП(б)Б.

Новы сакратар ЦВК БССР тав. Гнілякевіч

На першай сэсіі ЦВК БССР 10-га скліканьня тав. Гнілякевіч выбран сакратаром ЦВК БССР.

***

Тав. **Гнілякевіч,** Міхась Паўлавіч, нарадзіўся ў 1892 г. у Навагрудзкім павеце. Бацькі—батракі.

З 9-ці год пайшоў на заработкі падпаскам, а потым самастойным сельгасрабочым у маёнтку. З 1907 да 1914 г. працаваў сьлесарам на заводах Пецярбургу. З 1910 г. член саюзу мэталістаў. У партыю бальшавікоў уступіў у 1912 годзе. Да канца 1918 г. працаваў на заводзе «Трэугольнік». Дзе прыняў удзел у арганізацыі Чырвонай Гвардыі. У 1919 годзе камандыруецца ЦК партыі ў БССР старшынёю вучастковай сьледчай камісіі. У канцы 1920 г. працаваў інструктарам ЦВ КП(б)Б. Быў членам калегіі Наркамзему Беларусі. З кастрычніка 1921 г. да 1927 г. займаў рад адказных работ па прафэсыянальнай лініі: старшыня ЦП саюзу сельгасрабочых БССР, адначасова член прэзыдыуму ЦК саюзу с.-г. рабочых. Член прэзыдыуму Савпрафбелу і член УсеЦСПС. З 1921 г. член ЦВК БССР, член ЦК КП(б)Б з 1924 г.

Да ўсіх рабочых і працоўных усяго сьвету

Адозва чужаземных рабочых і спэцыялістаў гор. Менску

Замежныя рабочыя і спэцыялісты, якія працуюць на прадпрыемствах і ва ўстановах гораду Менску, сабраўшыся на нараду 28-га лютага 1931 г. канстатуюць, што шырокае разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва і індустрыялізацыі краіны спрыяла прыезду ў СССР значнай колькасьці кваліфікаваных замежных рабочых і спэцыялістаў.

Мы, замежныя рабочыя і спэцыялісты, дапамагаем сваімі ведамі і вытворчым вопытам ажыцьцяўляць будаўніцтва буйнейшых заводаў, фабрык, электрастанцый і прамысловых камбінатаў першай у сьвеце краіны пралетарскай дыктатуры.

Мы з вялікім энтузіязмам далучыліся да вялікага будаўніцтва сацыялізму ў СССР.

Будучы яшчэ ў межах буржуазных краін, мы былі відавочцамі падрыхтоўкі ваеннага нападу на СССР. Працэс Рамзіна выкрыў усю маханіку інтэрвэнцыяністкіх плянаў Пуанкарэ, Рабушынскіх і К°.

Сусьветная буржуазія і II Інтэрнацыянал сацыял-фашысцтаў узмоцнілі ў апошні час шалёную кампанію хлусьні супроць Савецкага Саюзу, распаўсюджваючы брахню аб ужываньні, быццам «прымусовай працы» у краіне Саветаў.

Мы, замежныя рабочыя і спэцыялісты, маючы магчымасьць навочна параўнаць умовы працы ў капіталістычных краінах і ў СССР, з усёй адказнасьцю і катэгарычнасьцю перад тварам пралетарыяту ўсяго сьвету заяўляем:

**У КРАІНЕ САВЕТАЎ НЯ МОЖА БЫЦЬ І ГУТАРКІ АБ ПРЫМУСОВ

X Усебеларускі зьезд саветаў

БССР ШПАРКА ІДЗЕ ПА ШЛЯХУ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

Даклад тав. ГРЫСЕВІЧА аб дзейнасьці ВСНГБ*)

Кіруючая роля прамысловасьці ў Савецкім Саюзе за апошнія гады значна вырасла. У 1930 г. удзельная вага прамысловасьці Саюзу ва ўсёй народнай гаспадарцы складае 66,7 проц., а ў 1931 годзе будзе складаць 69,2 проц. Такім чынам, з гэтых 2-х лічбаў з усёй паўнатою відаць, як краіна Саветаў ператвараецца ў сапраўды пераважную індустрыяльную краіну.

У 1929 г. валавая прадукцыя прамысловасьці складала толькі 24,5 проц., а сельскай гаспадаркі — 75,5 проц. У 1930 г. валавая прадукцыя прамысловасьці складала 35 проц., а сельскай гаспадаркі — 65 проц. У 1931 г доля прамысловасьці дасягне 45 проц., а сельскай гаспадаркі — 65 проц.

Такім чынам, з гэтых некалькіх лічбаў відаць, што мы ўзялі сапраўды бальшавіцкія тэмпы на выкананьні пяцігодкі за чатыры гады.

Па пяцігодцы на 1928-29 і 1929-30 г.г. праектавалася капітальных укладаньняў 65 млн. руб., а фактычна мы ўклалі 68.100 тыс. руб. Валавая прадукцыя рэспубліканскай прамысловасьці на працягу двух год узрасла на 150 проц. — і на 87 проц. супроць меркаваньняў пяцігадовага пляну. У 1929-30 г. прырост валавой прадукцыі прамысловасьці склаў 67,7 проц. супроць 48 проц. у 1928-29 г. Фактычна рост прадукцыі прамысловасьці ў 1929-30 г. перавысіў пляновыя заданьні пяцігодкі на 32,7 проц.

За гэты час колькасна ўзрасла работная клясa, узьнялася роля жанчын у прамысловасьці.

Паводле пяцігодкі меркавалася на 1929-30 г. давесьці колькасьць рабочых у прамысловасьці да 36.400 чалавек, а ў 1929-30 г. у сярэднім у нас было ўжо 46.800 чалавек рабочых. Колькасьць жанчын у прамысловасьці павысілася за год з 34,5 да 39,6 проц.

Намінальная зарплата рабочага ўзрасла за два гады больш чым на 16 проц. Значна павялічыўся ахоп рабочых сацыяльна - бытавым абслугоўваньнем (ясьлі, сталоўкі, дамы адпачынку, курорты і інш.).

За гэтыя два гады пераведзена на 7-мігадзінны рабочы дзень 52,3 проц. рабочых, занятых у рэспубліканскай прамысловасьці, на бесьперапынны тыдзень пераведзена 79,4 проц. усіх рабочых.

У БССР, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, у асноўным ліквідавана беспрацоўе. Выціснут прыватны сэктар з цэнзавай прамысловасьці.

Арганізован цэлы рад новых галін прамысловасьці, якіх раней ня было на тэрыторыі нашай Савецкай Беларусі. Такія прадпрыемствы, як Бабруйскі, Гомельскі дрэваапрацоўчыя камбінаты, Гомсельмаш, Магвалакнабуд, Віцебская шэйная фабрыка, Менская шэйная фабрыка, заналкавая фабрыка «Пралетарская перамога», ільназаводы, заналкавая фабрыка ў Рэчыцы, цагельныя заводы ў Барысаве, Віцебску, Гомелі і Магілеве — зусім зьмянілі твар нашай прамысловасьці.

Адначасова з гэтым мы значна рэканструявалі і пашырылі ўсе існуючыя прадпрыемствы. Такія заводы, як «Бальшавік», «Камунар» і «Энэргія» ў Менску карэнным чынам перабудаваны.

За апошнія часы праведзена вялікая работа з боку нашых дасьледчых устаноў для адшуканьня і скарыстаньня мясцовага сырцу. Новапабудаваныя і рэканструяваныя прадпрыемствы далі магчымасьць значна павялічыць выпуск валавой прадукцыі прамысловасьці. З 1928-29 г. мы ў гэтых адносінах маем рост да 48,6 проц., у 1929-30 г. да 67,7 проц.

Рост валавой прадукцыі па асобных галінах прамысловасьці

Металяапрацоўчая прамысловасьць павялічыла прадукцыю на 118 проц. пры заданьні росту паводле пяцігадовага пляну на 55,9 проц. Такім чынам, па гэтай галіне прамысловасьці першыя два гады даюць перавыкананьне пяцігадовага пляну на 39,8 проц. Трэба адзначыць, што разам з колькасным ростам металяапрацоўчая прамысловасьць мае значныя дасягненьні ў галіне ператварэньня не з рамонтнай у масавую вытворчасьць рознага роду складаных машын і варштатаў, якія адыгрываюць значную ролю ня толькі ў гаспадарцы БССР, але ўсяго Саюзу.

Асабліва разгортвалася тарфяная прамысловасьць. Выпуск прадукцыі ў 1929-30 г. супроць 1927-28 году ўзрос на 194,7 проц.

Шклянная прамысловасьць дае значнае [illegible] заданьня пяцігадовага [illegible] выпуску прадукцыі за два гады [illegible] 3,9 проц. супроць заданьня і паводле пяцігадовага пляну — 14,1 проц.

[illegible] рэспубліканскай прамысловасьці ВСНГБ [illegible] невыстарчальнае і адстае ад нашых запатрабаваньняў.

У першыя два гады пяцігадовым пляном прадугледжан рост аб'ёму вытворчасьці хэмічнай прамысловасьці на 389 проц. Гэтыя меркаваньні перавыкананы на 58 проц. Тэмпы развіцьця хэмічнай прамысловасьці ўсё-ж такі невыстарчальныя. За два гады рост прадукцыі дрэваапрацоўчай прамысловасьці склаў 86,8 проц. супроць 37,2 проц., вызначаных паводле пяцігадовага пляну.

Разам з пэўнымі посьпехамі лясная прамысловасьць БССР у 1929-30 годзе і асобным квартале мела рад прарываў. Асабліва вялікія прарывы мелі месца ў вывазцы дроў і лесаматар'ялаў у асобным квартале.

Папяровая прамысловасьць пры заданьні росту прадукцыі ў 1929-30 годзе супроць 1927-28 году на 30,7 проц. дасягнула павялічэньня выпуску прадукцыі на 91,8 проц.

На базе значнага будаўніцтва і рэканструкцыі, якую мы мелі ў нашай гарбарна-абутковай прамысловасьці, мы маем павышэньне выпуску прадукцыі супроць меркаваньняў пяцігодкі на 60,6 проц.

Швэйная прамысловасьць за гэты год узрасла ў параўнаньні з нашымі меркаваньнямі на 133 проц.

Адзіная галіна прамысловасьці, якая [illegible] ад бальшавіцкіх тэмпаў — гэта нечаўная прамысловасьць. Яна недавыканала заданьня на 20 проц.

За апошнія гады мы маем значнае пашырэньне выпуску прадукцыі нашай прамысловасьці па 9 парт.

Капітальныя ўкладаньні і энэргетычная база

Калі пару год назад мы экспартавалі палоўным чынам лес, дык за апошні час мы экспартуем і іншыя віды прамысловасьці.

За першыя два гады і асобны квартал на рэспубліканскай прамысловасьці і саюзнай выдаткавана на капітальнае будаўніцтва 91 млн. руб., а на 1931 г. мяркуецца на гэтых-жа прадпрыемствах выдаткаваць каля 67 млн. руб. Такім чынам, мы ў асноўным на капітальным будаўніцтве на нашай рэспубліканскай прамысловасьці заканчваем пяцігодку за чатыры гады.

Калі ўзяць выкананьне пляну па капітальных укладаньнях, дык яны характарызуюцца наступнымі лічбамі. У 1928-29 годзе мы выкналі капітальнае будаўніцтва на 93 проц. ад усіх сум, якія прызначаліся. У 1929-30 г. мы выканалі яго на 112 проц. За два гады пяцігодка выканана па капітальным будаўніцтве на 105 проц.

Нашы капітальныя ўкладаньні ішлі на арганізацыю новых вытворчасьцяў, рэканструкцыю ўсіх існуючых. Пры гэтым, асноўнай нашай установкай у будаўніцтве было падведзеньне энэргетычнай базы пад прамысловасьць БССР.

Практычным ажыцьцяўленьнем пляну электрыфікацыі БССР зьяўляецца пабудова раённай электрастанцыі імя Сталіна, якая ахоплівае сваёй высокавольтнай сеткай прамысловасьць, гарадскую і сельскую гаспадарку ў раёне Віцебску, Воршы, Магілева.

Але-ж Асіпаўская станцыя нездавальняе ліччу ўсе патрэбы на энэргію нават у гэтых раёнах.

На лініі прамысловасьці за апошнія гады пабудаваны цэнтралі: у г. Бабруйску — на дрэваапрацоўчым камбінаце (3.500 клвт.), на папяровай фабрыцы ў Добрушы (3.500 клвт.), на заводзе «Дубіцель» у Рэчыцы (400 клвт.) і ў Магілеве (250 клвт.), а ўсяго — на 10.150 клвт.

Будуецца станцыя на фабрыцы штучнага валакна ў Магілеве—на 5.000 клвт., на лесакамбінаце ў Гомелі — на 1.000 клвт., на цэмантным заводзе ў Крычаве — на 2.500 клвт., на цэтонавым заводзе ў Быхаве — на 300 клвт. Усяго—на 8.800 клвт.

Такім чынам, за першыя два гады пяцігодкі па БССР, ня ўлічваючы дробных станцый, пабудаваны і пашыраны электрычныя станцыі агульнай магутнасьцю ў 8.800 клвт., а ўсяго, такім чынам, мы маем 16.700 клвт.

Расьце мясцовая прамысловасьць

Шпаркія тэмпы развіцьця народнай гаспадаркі БССР за мінулыя два гады пяцігодкі захапілі ў значнай меры і мясцовую прамысловасьць, падпарадкаваную раённым выканаўчым камітэтам і гарсаветам.

Ход выкананьня пяцігодкі за першыя два гады па мясцовай прамысловасьці з усёй навочнасьцю паказвае, што ўзятыя тэмпы разгортваньня мясцовай прамысловасьці забясьпечваюць выкананьне пяцігодкі ня толькі за чатыры гады, а мяжуюць амаль па ўсіх галінах прамысловасьці выканаць заданьне пяцігадовага пляну ў 3½ гады, а па асобных галінах (апрацоўка дрэва, металю) ужо ў 1929-30 годзе пяцігодка перавыкананa.

Аднак, патрэба адзначыць невыстарчальную загружанасьць прадпрыемстваў мясцовай прамысловасьці, што прыніжае вызначаную эфэктыўнасьць утворных капіталаўкладаньняў.

План вырабу сырцу і выпуску цэглы за 1929-30 год недавыканан у сярэднім на 30 проц., а па асобных прадпрыемствах (Віцебск, Гомель, Полацак і інш.) прарыў у выкананьні прамфінпляну дасягнуў 50-55 проц. Тэткае-ж становішча было ў 1929-30 годзе і па іншых відах будаўнічых матар'ялаў: чарапіца, клінкер, ванны і г. д.

Мы гледачы на праведзеную рэарганізацыю, сучаснае становішча справы планаваньня і рэгуляваньня гэтай прамысловасьцю як з боку ВСНГБ, так і выканаўчых камітэтаў нездавальняючае. У сувязі з перадачай функцый кіраўніцтва месцам, справа планаваньня і рэгуляваньня мясцовай прамысловасьцю дыктуе неабходнасьць перабудовы работы РВК і гарсаветаў на шляху сапраўднага паваароту тварам да вытворчасьці.

За апошнія часы значны зрух зрабіла саматужна-прамысловая кааперацыя. Калі ўзяць 1928-29 год, дык яна выпускала 34.864 млн. валавой прадукцыі. У 1929-30 годзе яна выпусьціла — 58 млн. 213 тыс.

Адначасова з ростам нашай прамысловасьці як па лініі рэспубліканскай, так і па лініі мясцовай і саматужнай, перад намі стаяла задача па разьвіцьці і забясьпячэньні прамысловасьці рабочымі і тэхнічнымі кадрамі. Мы за гэты час атрымалі ад Наркамасьветы 2 палітэхнікумы—Менскі і Віцебскі, адкрылі 3 новыя тэхнікумы, рэарганізавалі ў тэхнікумы 2 прафшколы, рэарганізавалі Менскі палітэхнікум у два самастойныя тэхнікумы.

Такім чынам, ВСНГБ падпарадкавала зараз 8 дзённых тэхнікумаў, у якіх навучаецца 1.872 студэнты і 3 вячэрнія тэхнікумы з 653 студэнтамі. Адкрыта 5 вышэйшых тэхнічных навучальных устаноў. Ёсьць 10 рабфакаў. Апрача гэтых навучальных устаноў, у ВСНГ ёсьць 21 школа фабрычна-заводзкага вучнёўства з 4.247 вучнямі.

На працягу гэтага году ў нас у сэнсе разгортваньня фабрычна-заводзкіх школ адбываецца пэўны зрух. Але дасягнутае нас не задавальне. Мы павінны надалей разгортваць будаўніцтва ФЗВ, бо гэтая школа зьяўляецца асноўнай формай падрыхтоўкі кваліфікаванай рабочай сілы.

У справе якасьці работы нашых навучальных устаноў ня ўсё добра. З боку гаспадарнікаў няма выстарчальнага пералому ў сэнсе клапот аб нашых навучальных установах. Таму зараз паўстае задача, каб кожны гаспадарнік, асабліва нашы аб'яднаньні, сапраўды клапаціліся аб навучальных установах, імкнуліся да таго, каб выпускіць такіх спэцыялістаў, якія патрэбны прамысловасьці.

Востры недахват кадраў высоўвае перад прамысловасьцю на 1931 г. задачу фарсаваньня капітальнага будаўніцтва ВТНУ, тэхнікумаў і асабліва школ ФЗВ.

Нашы посьпехі—вынік непрымірымай барацьбы за генэральную лінію партыі

Посьпехі ў нашай прамысловасьці, якія мы маем ад IX да X зьезду саветаў атрыманы рабочымі Савецкай Беларусі дзякуючы правільнаму кіраўніцтву КП(б)Б і яе Цэнтральнага Камітэту.

Правыя апартуністы два гады таму назад супроцьстаўлялі пяцігадоваму пляну сваю двухгодку. Яны ня верылі ў вызначаныя ЦК нашай партыі тэмпы, ня верылі ў сілы рабочае клясы і вялі барацьбу супроць генэральнай лініі партыі. Жыцьцё адкінула іх тэорыю, тэмпы, вызначаныя пяцігодкай, выконваюцца і перавыконваюцца. Партыя таксама выкрыла і нанесла руйнуючы ўдар па права-«лявацкім» беспрынцыпным блёку Сырцова-Ламінадзэ.

За гэты перыяд на тэрыторыі БССР мы выкрылі шкодніцкую групу беларускіх нацдэмаў, якія вялі падрыўную работу, рыхтавалі інтэрвэнцыю супроць СССР. У адказ на карканьне шкоднікаў усіх масьцей, рабочая класа Савецкага Саюзу і БССР на грунце ўдарніцтва і сацэнаборніцтва паказвае высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва.

Ударніцкім рухам на 1-га верасьня 1929 году было ахоплена рабочых, занятых у рэспубліканскай прамысловасьці, з проц. У сьнежні 1929 году гэты процант павялічыўся на 16 і на 1 сакавіка 1930 г. дасягнуў — 45.

Апошнія месяцы 1930 г. былі месяцамі разгортваньня і узьнялыцьця ударнага руху на вышэйшую ступень. На 1-га лістапада 1930 г. па выбарным абсьледваньні на 41 прадпрыемстве процант ударнікаў дасягнуў 63. Гэта — лепшы сьведка магутнага росту энтузіязму рабочае клясы, зарука выкананьня пяцігодкі за чатыры гады.

Нашы дасягненьні і вялізарныя посьпехі ў сацыялістычным будаўніцтве асабліва вызначаюцца, калі мы параўнаем наша становішча з тым, што перажывае цяпер капіталістычны сьвет.

Пачынаючы з сярэдзіны гэтага году, адбываецца агульнае падзеньне канъюнктуры ў капіталістычных краінах. Прамысловая прадукцыя зьнізілася на 5 проц. Сельска-гаспадарчая прадукцыя таксама значна скарацілася.

У той час, як у капіталістычных дзяржавах з году ў год расьце беспрацоўе (беспрацоўных налічваецца зараз звыш 35 млн. чалавек) — у нас, у Савецкім Саюзе, у асноўным ліквідавана беспрацоўе і ва ўсю шырыню паўстала праблема надрыхтоўкі кадраў.

У нас, у краіне Саветаў, правільнае плянавае вядзеньне гаспадаркі; там — анархія, крызысы. Адсуль зусім зразумела, чаму за апошнія часы буржуазная зграя пачала шумець аб тым, што ў нас нібы ўся работа будуецца на прытчаньні, што ў нас «прымусовая праца».

Мне здаецца, што [illegible] з'ездзе саветаў, з кусьнаў рабочых, шырокіх колаў працоўнага сялянства, працоўнай інтэлігэнцыі [illegible] паклёпы, якія робяць супроць нас, заціскуцца ў абдымках свайго капіталістычнага крызысу, буржуазія.

Мы стварылі моцны грунт для высокіх тэмпаў прамысловага будаўніцтва ў 1931 г.

Нашы дасягненьні за два гады далі партыі і ураду магчымасьць на 1931 г. намецець ліччу больш высокія тэмпы індустрыялізацыі краіны. Мы атрымалі на 1931 г. на лініі ВСНГ на тую прамысловасьць, якую плянуе ВСНГ, 43.680 тыс. руб. Гэтыя сродкі, галоўным чынам, ідуць на скончэньне будаўніцтва, якое было распачата ў мінулыя гады.

На будаўніцтва на ўсёй прамысловасьці мы затрачаем у гэтым годзе 71 млн. руб., з іх—43 млн. на капітальнае будаўніцтва на лініі ВСНГ. Для таго, каб скончыць распачатае будаўніцтва, нам патрэбна звыш 60 млн. руб., а мы маем—43. Такім чынам, цэлы рад аб'ектаў, якія мы пачалі ў гэтым годзе, мы ня зможам скончыць. Таму максымум сродкаў патрэбна ўлажыць у тыя галіны прамысловасьці, якія ўжо на працягу 3-4 кварталу гэтага году і ў першы квартал 1932 г. дадуць валавую прадукцыю народнай гаспадарцы.

Разьмеркаваньне сродкаў на капітальныя ўкладаньні ідзе наступным чынам:

Металёвая прамысловасьць—сума капітальных укладаньняў 7.400 тыс. Значная частка гэтых укладаньняў пойдзе на скончэньне Гомсельмаша (3.400 тыс.), астатнія 4.000 тыс. на агульнае машынабудаўніцтва.

На шкляной прамысловасьці значная частка трошчай (5 з паловай млн. руб.) пойдзе на скончэньне гомельскай металізаванай гуты, а некаторая частка сродкаў на рэканструкцыю іншых заводаў.

На лініі хэмічнай прамысловасьці мы будзем мець адну новую пабудову, астатняя частка сродкаў пойдзе на скончэньне тых пабудоў, якія былі распачаты на працягу 1929-30 г.

Наогул, капіталаўкладаньне на групе «А» ў гэтым годзе вызначаецца ў суме 35.420 тыс. руб., а на групе «Б»—5.920 тыс. руб. з якіх па гарбарна-абутковай прамысловасьці—1.020 тыс. руб., заналкавай—960 тыс. руб., на паліграфічнай—500 тыс., на швэйнай—500 тыс. руб. і па ільназаводах—2.340.

Па валавой прадукцыі мы намячаем у параўнаньні з пяцігодкай па тым коле прадпрыемстваў, якія знаходзяцца ў ВСНГ, рост на 105 проц., зьніжэньне сабекошту намечана 8 проц., прадукцыйнасьць працы—30 проц., рост заработнай платы—на 6 проц.

На сацыяльна-бытавое абслугоўваньне рабочае клясы вызначана выдаткаваць 6.500 тыс. руб., з іх: жыльлёвае будаўніцтва—355 тыс. руб., сталоўкі—932 тыс. руб., ясьлі—265 тыс. руб., ахова працы—839 тыс. руб., на клюбнае будаўніцтва—177 тыс. руб.

На бесьпераперыўку будуць пераведзены 91 проц. усіх прадпрыемстваў.

Падцягнуць адстаючыя вучасткі

Адзначаючы вялікія посьпехі ў прамысловасьці БССР, трэба асабліва падкрэсьліць цяперашні бакі яе работы.

Прамысловасьць БССР, перавыкаўшы ўсе наметкі пяцігодкі, усё-ж дае недавыканаўчае гадавога пляну 1929-30 г., і асобнага кварталу, як па колькасных, так асабліва па якасных паказьніках.

У 1929-30 г. прамысловасьць недавыканала гадавое плянавае заданьне па выпуску прадукцыі амаль на 5 проц. Значнае недавыканаўчае маецца па тарфяной прамысловасьці (каля 30 проц.), па будматар'ялах (37 проц.), на акулярнай фабрыцы (13,7 проц.), ільнапрацоўчай—(12,5 проц.), бавоўна-пашыровай (19,3 проц.), гарбарна-абутковай (19,1 проц.) і галантарэйнай (16,1 проц.).

Прамфінплян за ўдарны квартал па валавой прадукцыі выканан на 88,7 проц. Заданьне па зьніжэньні сабекошту за ўдарны квартал, замест запраектаваных 72,2, выканана толькі — 2,2. Прарыў у гэтай частцы даў значны прарыў і ў фінпляне, прычым, некаторыя галіны замест зьніжэньня сабекошту далі нават узрост. Фанэрны, замест зьніжэньня на 0,6 проц., даў рост на 14,4 проц.; рымарна-сядзельнае, замест зьніжэньня на 3, дала ўзрост 9,8 проц., шкло, замест зьніжэньня на 6,2 проц., дало ўзрост 5 проц.

Прарывы атрымаліся таму, што гаспадарчыя, прафэсыянальныя і некаторыя партарганізацыі на месцах не змаглі замацаваць узьнятыя энтузіязм рабочае клясы, не змаглі мабілізаваць увагу рабочых на штодзённую барацьбу за выкананьне пляну.

Слабым вучасткам нашай работы зьяўляецца плянаваньне на прадпрыемствах і цэхах і арганізацыя сыстэмы гаспадарчага разрахунку цэху.

У выкананьні дырэктывы ЦК УсеКП(б) аб адзінаначальні мы яшчэ маем цэлы рад скажэньняў як з боку нашых гаспадарнікаў, так і з боку нашых профорганаў. Фактаў можна падаць шмат. Але-ж ёсьць і выпадкі, калі гаспадарнікі прыкрываюцца адзінаначальнем, скажаюць сапраўднае адзінаначальне, лічачы, што «я нікому не падпарадкоўся і ніхто не павінен уменшаць ў мяне работу».

Якасьць прадукцыі нашай прамысловасьці яшчэ стаіць не на патрэбнай вышыні. 1931 год нашай пяцігодкі павінен быць і ў справе паляпшэньня якасьці нашай прадукцыі таксама рашаючым.

1929-30 г. і асобны квартал [illegible] нашых [illegible] заканчваю, што [illegible] адстаўваньне ў фінпляне. [illegible] пункту зьніжэньня сабекошту. Ад выкананьня гэтай дысцыпліны і ад значнай меры залежыць паказ [illegible] фінансавага пляну.

У справе рацыяналізацыі, скарыстаньня шырокай творчай ініцыятывы рабочых мас і рабочых вынаходнікаў за гэты перыяд адбыўся вялікі пералом.

Колькасьць рабочых прапаноў па рацыяналізацыі значна павялічваецца. Па больш буйных прадпрыемствах уведзены пасады нам. дырэктараў прадпрыемстваў па выкананьні рабочых прапаноў.

Але-ж трэба адзначыць, што ў справе рабочага вынаходніцтва і прапаноў становішча яшчэ нездавальняючае. Асноўнымі прычынамі пэўных перашкод зьяўляецца невыстарчальасьць інжынэрна-тэхнічнай дапамогі рабочым па распрацоўцы і афармленьні імі вынаходстваў; з другога боку мы сустракаемся яшчэ з бюракратычнымі адносінамі нашых гаспадарнікаў да справы вынаходніцтва.

Трэба, каб рабочыя прапановы, якія выходзяць з прадпрыемства, адразу-ж рэалізаваліся на месцы і толькі тое, што мае шырэйшы маштаб чым дадзенае прадпрыемства, можа разглядацца ў вышэйшых інстанцыях.

Увага ўсяго рабочага калектыву інжынэрна-тэхнічных сіл, пачынаючы ад дырэктара будаўніцтва і канчаючы радавым рабочым, павінна быць зьвернута на выкананьне дырэктыў ураду па зьніжэньні сабекошту, на разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва. Мы часта гаворым, што ў нас недахоп будаўнічых матар'ялаў і рабочай сілы. Гэта зусім правільна, але ў той-жа час мы невыстарчальна маноўруем тымі будаўнічымі матар'ялямі, тэй рабочай сілай, якая ў нас ёсьць. Ёсьць выпадкі, калі замест 8-мігадзіннага дня працуюць 4-5 гадзін. Ёсьць такія факты, калі на будаўніцтве машыны невыстарчальна скарыстоўваюцца. Дырэктывы партыі і ўраду аб поўным скарыстаньні будаўнічага сэзону не заўсёды выконваюцца.

Задача кожнага гаспадарніка, пачынаючы ад ВСНГ і канчаючы прадпрыемствам—устанавіць каляндарныя тэрміны работ, зьвязаных з будаўніцтвам, устанавіць каляндарныя тэрміны атрыманьня абсталяваньня, вызначыць адказных людзей за кожны вучастак работы.

Трэба навучыцца пускаць у эксплёатацыю асобныя гатовыя цэхі прадпрыемствы, якія будуюцца, не чакаючы пакуль будзе гатова ўсё прадпрыемства.

Трэба паставіць, як належыць, пытаньне перад нашымі каапэрацыйнымі органамі, каб яны арганізавалі забясьпячэньне рабочых прадпрыемстваў будаўніцтва ў межах вызначаных ім фондаў, патрабуючы якасьці, як грамадзкага, так і ўсяго харчаваньня. Задачай гаспадарнікаў зьяўляецца дапамагчы каапэрацыі ў справе забясьпячэньня рабочых.

Адзнай з прычын недавыкананьня прамфінпляну зьяўляецца нездавальняючая работа па забясьпячэньні сырцом нашых прадпрыемстваў. Гэта адбываецца і па віне транспарту.

Побач з тым, што мы сапраўды маем недахват патрэбных нам матар'ялаў, мы самі ў сябе на мясцох ня ўсё робім для таго, каб забясьпечыць тым сырцом, які ёсьць на тэрыторыі рэспублікі, каб прамысловасьць не перажывала перабояў у забясьпячэньні, а значыць і ў сваёй рабоце.

Мы павінны хутчэй перабудаваць работу нашых забясьпечваючых органаў у духу пастановы апошняй канферэнцыі гаспадарнікаў, бо сыстэма іх пабудовы (органаў забясьпячэньня) вельмі дрэнна да гэтага часу была арганізавана.

Справа мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў мае непасрэдны ўплыў на паскарэньне працэсу капіталазвароту, на поўнае скарыстаньне ўсяго абсталяваньня. Трэба ліквідаваць той самацёк у справе мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, які назіраецца ў 1929-30 г. і на працягу асобнага кварталу.

Напружанае становішча з апалам ставіць перад намі задачу максымальнай эканоміі данбаснага і іншага прывазнога апалу і пераходу на мясцовыя віды апалу (торф).

На вялікі жаль, на гэтую галіну пра[illegible] [illegible] ў 1929-30 г. і на працягу асобнага кварталу.

Напружанае становішча з апалам ставіць перад намі задачу максымальнай эканоміі данбаснага і іншага прывазнога апалу і пераходу на мясцовыя віды апалу (торф).

На вялікі жаль, на гэтую галіну прамысловасьці ў нас часта не зварочваецца выстарчальнай увагі.

Мы ўпэўнены, што ў часе ўдарнага месячніка загатовак па вывазе лесу і торфу будзе зроблена ўсё для таго, каб торф быў вывезен на нашыя прадпрыемствы і тым самым будзе забясьпечан апалавы баланс нашай прамысловасьці.

Пэрспэктывы далейшага разьвіцьця прамысловасьці

Нам прыдзецца ў далейшым захаваць павышэньня тэмпы ў разьвіцьці прамысловасьці, у параўнаньні з Савецкім Саюзам, у зьвязку з тым, што прамысловасьць, як такая, у БССР пачала бурна разьвівацца толькі пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Асабліва ўвага павінна быць зьвернута на разьвіцьцё тых галін прамысловасьці, якія працуюць на мясцовым сырцы. Трэба павысіць іх удзельную вагу ва ўсім разьвіцьці нашай прамысловасьці.

Аднак, наколькі нашы мясцовыя сыр цовыя рэсурсы абмежаваны і не забясьпечваюць выстарчальнае разьвіцьцё прамысловасьці, мы павінны і надалей разьвіваць тыя галіны прамысловасьці, якія працуюць на прывазным сырцу.

Асноўная ўвага на бліжэйшы час павінна быць зьвернута на скарыстаньне мясцовых багацьцяў.

Скарыстаньне балот на службу буйных электрастанцый пачалося толькі пасьля пуску электрычнай станцыі імя Сталіна. Злабыцьцё торфу знаходзіцца ў самым пачатковым становішчы. Да вопыту каксаваньня торфу прыступлена толькі простым ямным парадкам. Да заводзкай пераапрацоўкі мы яшчэ не прыступілі.

На працягу 1930-31 г. мы павінны будзем прыступіць да апрацоўкі торфу фабрычным спосабам. Між, іншым, запасы торфу ў БССР вызначаны—звыш 3 мільярдаў кубаметраў, на плошчы ў 460 тыс. гэкт.

На 1931 г. праграма, зацьверджаная ВСНГ Саюзу, па БССР прадугледжвае здабычу торфу каля 600 тыс. тон. Удзельная вага торфу ў апалавым балянсе, такім чынам, будзе складаць 28 проц.

Адсюль перад намі паўстае задача максымальна павялічыць і пашырыць здабычу торфу, у першую чаргу для скарыстаньня ў якасьці апалу ня толькі ў прамысловасьці, але ў гарадох і сельскай гаспадарцы.

Торф павінен стаць важнейшай апалавай базай для электрыфікацыі БССР і сыр'явой—для прамысловасьці.

Другая галіна нашай гаспадаркі—гэта лес. Разьвіцьцё гэтай галіны гаспадаркі за апошні год дасягнула значных разьмераў. Асноўная задача ў адносінах да лясной гаспадаркі заводзіцца да не правільнай арганізацыі.

Мы часта сустракаемся з [illegible] галі нашы [illegible] ім'кнуцца распрацоўваць асноўныя дачы, якія ляжаць блізка каля рэк, чыгуначнага транспарту, шасэйнага шляху і г. д., і ў глыбінныя пункты ня хочуць ісьці.

Таму гэты 1931 год павінен зьявіцца годам рашучага пералому ў бок паваароту нашых лесазагатоўчых арганізацый у глыбінныя пункты.

У адносінах да лесараспрацоўкі і лесасьвязкі, асноўнай задачай зьяўляецца правільная арганізацыя работ, мэханізацыя гэтых работ, будаўніцтва чыгуначных веткі. Мы павінны быць ня толькі гаспадарамі па эксплёатацыі лесу, наколькі лес перашоў да прамысловасьці, але і клапаціцца наконт лесанасаджэньня.

Дрэваапрацоўчая прамысловасьць павінна ісьці па шляху далейшай, больш глыбокай пераапрацоўкі сырцу мясцовага значэньня, праз арганізацыю вытворчасьці буйнічых дэталяй, зборных дамоў, мэблі і г. д.

Асабліва ўвага павінна быць аддадзена разьвіцьцю лесахэмічнай прамысловасьці, арганізацыі канфольных заводаў.

Папяровая прамысловасьць на паасобных гатунках прадукцыі—папера для пісьма—займае значную ўдзельную вагу ва ўсёй папяровай прамысловасьці Саюзу і выключна прадстаўлена старымі фабрыкамі, якія за апошнія гады значна рэканструяваны.

Таму і надалей мы павінны будзем рэканструяваць нашы фабрыкі і на грунце гэтага набудаваць цэлюлёзны камбінат, які вызначан нашай пяцігодкай.

Трэба фарсаваць паглядную прамысловасьць. Гэта праца павінна праводзіцца ня толькі ў галіне рэспубліканскай, але мясцовай і саматужнай прамысловасьці.

На вялікі жаль, часта саматужная прамысловасьць хоча будаваць таксама буйныя заводы, цягнецца за рэспубліканскай прамысловасьцю замест таго, каб будаваць накольныя печы і тут-жа на месцы забясьпечыць тыя запатрабаваньні, якія цяпер выклікаюцца нашым сацыялістычным будаўніцтвам.

Ільнаняньковую прамысловасьць мы толькі, я-бы сказаў, за апошні годзе пачалі разьвіваць.

У мінулым годзе мы атрымалі 1.700 [illegible] руб. на гэтую галіну прамысловасьці. У гэтым [illegible] рублёў і таму на[illegible] задача заключаецца ў тым, [illegible] мысловасьці ў нас часта не зварочваецца выстарчальнай увагі.

Мы ўпэўнены, што ў часе ўдарнага месячніка загатовак па вывазе лесу і торфу будзе зроблена ўсё для таго, каб торф быў вывезен на нашыя прадпрыемствы і тым самым будзе забясьпечан апалавы баланс нашай прамысловасьці.

Вузлавыя пытаньні

[illegible] ЭНЦІН—стаж [illegible]

[illegible] Тольдблят, Г. Родшуль і былы вучань беларуская

трэцяга рашаючага

(Прамова тав. Васкабойнікава)

Таварышы! Вынікі работы нашай прамысловасьці за першыя два гады пяцігодкі сьведчаць аб тым, што работная клясa Савецкай Беларусі, пад кіраўніцтвам нашай партыі, ня толькі выканала, але ў значнай ступені і перавыканала тыя асноўныя паказьнікі ў працы прамысловасьці, якія былі вызначаны пры складаньні нашай пяцігодкі.

Асноўны ўпор у разьвіцьці нашай прамысловасьці быў вызначан дырэктыўнымі пастановамі пленумаў і зьезду нашай партыі, а таксама і зьездамі саветаў.

Калі мы падводзім вынікі першых двух год работы нашай прамысловасьці, мы павінны адзначыць, што гэта дырэктыва яшчэ цалкам ня выканана—цалкам не скарыстаны нашы мясцовыя магчымасьці. Пытаньне скарыстаньня ўсіх мясцовых багацьцяў і мясцовага сырцу яшчэ да гэтага часу поўнасьцю ня вырашана.

У разьвіцьці нашай прамысловасьці назіраецца яшчэ значнае адставаньне іменна па тых галінах прамысловасьці, якія ў значнай ступені грунтуюцца на мясцовым сырцы. Мы яшчэ слаба разьвілі нашу харчовую прамысловасьць, хэмічную, лесахэмічную і асабліва палыбленую пераапрацоўку лесу.

Што-ж датычыць апошняга пытаньня—пытаньня паглыбленай пераапрацоўкі лесу, дык яно ва ўмовах БССР набывае вялікае значэньне ў сувязі з тым, што лес у нас (у БССР) зьяўляецца адзнай з асноўных сырцовых баз, на якой павінна разьвівацца прамысловасьць БССР.

Да гэтага часу мы ў значнай ступені секлі наш лес і, не пераапрацоўваючы, накіроўвалі ў другія часткі Савецкага Саюзу. Гэтым самым мы значна заграмаждвалі наш транспарт, прамысловыя прадпрыемствы па апрацоўцы лесу арганізоўвалі ня ў тых раёнах, дзе ёсьць асноўныя лясныя масывы.

Такім чынам, пытаньне адносна палыбленай пераапрацоўкі лесу зьяўляецца такім пытаньнем, якое павінна стаць у цэнтры ўвагі ўсіх гаспадарнікаў і нашага ўраду.

Я ня буду тут падаваць усе лічбы капіталаўкладаньняў, якія мы зрабілі за апошнія два гады ў галіне нашай прамысловасьці. Тав. Грысевіч у сваім дакладзе з усёй выразнасьцю адзначыў усе гэтыя дасягненьні ў лічбах. Даволі будзе сказаць, што мы укладваем вялікія сумы ў капітальнае будаўніцтва нашай прамысловасьці, што мы пабудавалі такія прадпрыемствы, якія могуць быць пабудаваны ў Савецкай Беларусі толькі пры ўмове, калі гаспадаром, калі кіраўніком дзяржавы зьяўляецца рабочая кляса. Але мы яшчэ да гэтага часу ня можам дакладна адказаць на адно пытаньне — з якой эфэктыўнасьцю мы скарыстоўваем ўсе ўкладваемыя сродкі ў наша капітальнае будаўніцтва?

Тут ужо тав. Васэрман зусім правільна адзначыў, што мы вядзем і былі ў значнай ступені пада будаўніцтва такім чынам, што пачыналі на ўсёй тэрыторыі Савецкай Беларусі, будавалі скрынкі і не завяршалі ўсіх працэсаў капітальнага будаўніцтва.

Такім чынам, пытаньне адносна эфэктыўнасьці ўкладваемых сродкаў у капітальнае будаўніцтва зьяўляецца адным з асноўных.

Некалькі дзён назад урад БССР заслухаў наш даклад і судакład РСІ, як мы скарыстоўваем наша абсталяваньне.

Мы правялі абсьледваньне скарыстаньня абсталяваньня, як замежнага, так і нашага.

Да якіх вынікаў прыйшоў урад, калі ён азнаёміўся з тымі матар'ялямі, якія мелі пасьля нашага абсьледваньня? Урад адзначыў, што пытаньне адносна скарыстаньня абсталяваньня, як замежнага, так і нашага (савецкага знаходзіцца ў такім становішчы, што калі мы далей будзем скарыстоўваць так сродкі, якія мы ўкладваем, мы ня зможам атрымаць чаканай эфэктыўнас

За бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі

Судаклад старшыні Калгасцэнтру тав. МІЦЬКОВА па дакладу аб саўгасным і калгасным будаўніцтве*)

Мы ўступілі ў перыяд сацыялізму. У выніку пасьпяховага выканаўня першых двух год пяцігодкі партыйнай настаўлена гістарычная важнасьці задача завяршэньня пабудовы фундаменту сацыялістычнай эканомікі ў гэтым годзе.

Посьпехі ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва зьяўляюцца вынікам правільнай генэральнай лініі партыі, шырока разгорнутага па ўсім фронце рашучага наступленьня на капіталістычныя элементы і бязьлітасная барацьба з правым ухілам—кулацкай агентурай у радах партыі, «левым» апартунізмам і прымірэнцтвам да ўхілаў.

Прароцтвы апартуністаў абвергнуты жыцьцём

Пяцігадовы плян, і асабліва вызначаныя меркаваньні па саўгасным будаўніцтве і калектывізацыі, былі спатканы, пачынаючы ад капіталістаў і канчаючы людзьмі, якія пасуюць перад пяжкасьцямі—правымі і «левымі» апартуністамі, а варожасьцю і іроніяй. Орган «меншанікоў» — «Сацыялістычны вестнік» у свой час пісаў, што «толькі ўзьлётам неабузданай фантазіі можна тлумачыць разьлікі, па якіх да канца пяцігодкі 40 проц. тавараднага хлеба будзе атрымана з калгасаў і саўгасаў». А што аказалася на справе? Аказалася тое, што рабочая кляса СССР пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі не да канца пяцігодкі, а толькі за першыя два гады забясьпечыла атрыманьне ад калгасаў і саўгасаў ня 40,—а 50 проц. тавараднага хлеба.

Троцкі 11 месяцаў таму назад выступіў з такім прароцтвам: «З сялянскіх гох і сялянскіх ключ, хоць і аб'яднаных, нельга стварыць буйной сельскай гаспадаркі, як нельга з сумы рыбацкіх лодак зрабіць параход».

Адхіляючы гэтыя гарожыя прароцтвы, рабочая кляса Савецкага Саюзу ўжо ў канцы другога году пяцігодкі забясьпечыла звыш 30 проц. калектывізацыі бяднацка - серадняцкіх гаспадарак. У радзе абласьцей завяршаецца правядзеньне суцэльнай калектывізацыі і на гэтай аснове канчаткова ліквідуецца кулацтва, як кляса.

З боку правых ухілістаў мы таксама чулі прароцтвы такога-ж прыкладна парадку. М. І. Бухарын гаварыў, што «саўгасы і калгасы дадуць натроўную колькасьць хлеба праз пяць-дзесяць год, а там трэба выкручацца зараз-жа». Ад такіх ён, і ўсе правыя ўхілісты рабілі вывад, што ня трэба крыўдзіць і ён «вгоріць» нас сваім хлебам. Рабочая-ж кляса, адпаведжаньне, на асноўскіх акцыях калектывізацыі, корчасьць кінскую армію? ю саўгасаў у Біку вопыт ла рыхлікуму?

Ад падтрыманьня замацыі і ўнутранай контрмінуным вядзе пра... падпрыхтоўкі ...Беларусі і а боцы правых беларускіх нацдэмам, а боку прышчэпа... Рэд. ...ванамістаў, працадовым пляне праектавае... пяцігодкі разьвяртаць... ...ыналькі ліквідацыю... абаронну ў гады сусьветн... ...кляса, перамагаючы розныя перашкоды на шляху сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, лікячы сурацыўленьне клясавага ворага, разграмілы прышчэпаўшчыну, шпаркім тэмпам правядзіць сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, шпаркім тэмпам будуе буйныя сацыялістычныя фабрыкі хлеба, мяса і сыру.

На IX Усебеларускім зьезьдзе саветаў быў зацьверджан пяцігадовы плян калектывізацыі. Гэты плян да X зьезду саветаў мы ня толькі выканалі, але і перавыканалі. Паводле пяцігадовага пляну вызначалася арганізаваць 4.560 калгасаў, а на 20-II-31 г. мы маем 4.700 калгасаў, а на 20-II-31 г. мы маем 4.700 калгасаў. Колькасьць абагульненьня у калгасы бядняцка-серадняцкіх гаспадарак вызначалася ў 79.390, а ўжо на 20 лютага мы маем 136.000 калектывізаваных гаспадарак; заданьне выканана на 171 проц. Сярэдні разьмер калгасаў на плошчы, паводле пяцігадовага пляну, вызначаўся ў 166 га, а мы ў пачатку другога году пяцігодкі маем сярэдні разьмер калгасу ў 400 га. Паводле пяцігодкі вызначалася 12 проц. калектывізаваць бяднацка-серадняцкіх гаспадарак, а на 20 лютага г. г. мы ўжо маем—18 проц. Гэта вялікія посьпехі ў справе калектывізацыі за апошнія два гады.

Зараз рад раёнаў набліжаецца ўжо да раёнаў суцэльнай калектывізацыі. Але працэс калектывізацыі па асобных раёнах праходзіць не аднолькава. Звыш 30 проц. калектывізаваных гаспадарак мы маем у 9 раёнах, ад 20 да 30 проц.—у 20 раёнах, ад 18 да 20 проц.—у 11 раёнах ніжэй сярэдняга, г. зн. ніжэй 18 проц. калектывізацыі—у 59 раёнах. Асабліва адстаюць у калектывізацыі 10 раёнаў. Такімі «героямі» зьяўляюцца: **Гарадоцкі** раён, дзе калектывізавана толькі 7,5 проц. гаспадарак, **Дубровенскі**—9,2 проц., **Бешанковіцкі**—8,5 проц., **Межанскі** — 9,4 проц., **Багушэўскі** — 9,5 проц., **Бабруйскі**—9,4 проц., **Рэчыцкі**—8,9 проц., **Гомельскі**—9 проц., **Церахаўскі**—9,8 проц., **Старадарожскі**—9,9 проц. Я павінен адзначыць, што ў гэтых раёнах няма якіх-та асаблівых умоў, якія-б не давалі магчымасьць разгорнуць там калектывізацыю. Слабыя тэмпы калектывізацыі тлумачацца сабой работай на мясцох. Разглядаючы пытаньне калектывізацыі, як важнейшую аснову сацыялістычнай рэканструкцыі гаспадаркі, і выходзячы з таго, што калектывізацыя зьяўляецца рашаючым фактарам у выкананьні асноўных праблем, пастаўленых перад сельскай гаспадаркай, зьезд ня можа прыняць здавальняючымі тыя тэмпы калектывізацыі, якія мы маем зараз.

Вырашэньне праблемы тэхнічных культур, сырцу, мясной праблемы, тлушчовай праблемы і г. д. мы ня зможам выканаць інакш, як на падставе насаджэньня саўгасаў і калгасаў. Прыняты на 1931 год выторчны плян і выкананьне яго цішкам [illegible] ад таго, як мы спрацюмся з задачай калектывізацыі. Так, Сталін, гаворачы аб праблемах, якія [illegible] перад сельскай гаспадаркай і аб ролі саўгасаў і калгасаў у вырашэньні гэтых праблем, кажа так: «Лёс сельскай гаспадаркі і яе [illegible] ...ўць вызначаць ...ных праблем ...аркі, а саўгасы і калгасы». Мы ня можам вырашыць мясной праблемы на падставе дробненькіх аднаасобных гаспадарак, таксама, як і тлушчовай праблемы, і праблемы тэхнічных культур. Адсюль нашу работу па насаджэньні саўгасаў, па ўзмацненьні тэмпу калектывізацыі мы павінны будаваць так, каб гэтыя праблемы былі вырашаны ў найбольш кароткі тэрмін.

Выторчую праграму на 1931 год па разьвіцьці тэхнічных культур і жывёлагадоўлі зможам выканаць толькі тады, калі выканаем кантрольныя вызначэньні па калектывізацыі, г. зн. мець увесну бягучага году 30 проц. калектывізаваных бяднацка-серадняцкіх гаспадарак.

Стаўка на самацёк—асноўная прычына адставаньня

Прычыны яўна нявыстарчальных тэмпаў калектывізацыі заключаюцца, па першае, у тым, што ня ўсюды праводзілася рашучая барацьба з кулацтвам, да апошняга часу ў радзе раёнаў справа калектывізацыі ідзе самацёкам, што зьяўляецца яўна апартуністычнай практыкай. На другое, гаспадарча-палітычныя кампаніі, якія праводзіцца на [illegible]чы, ня ўвязваюцца з задачамі разгорнуваньня калгаснага ру[illegible]. Мы павінны сваю работу арганізаваць так, каб усе кампаніі ўвязваць з асноўнай задачай узмацненьня тэмпаў калектывізацыі. Трэцяя прычына заключаецца ў тым, што да апошняга часу масавая работа на вёсцы пастаўлена вельмі кепска. Асабліва кепска праводзіцца работа сярод працоўных жанчын. Гэтыя недахопы выкарыстоўвае кулацтва ў сваёй барацьбе супроць калгаснага будаўніцтва. І, нарэшце, значнай перашкодай у далейшым разгортваньні калектывізацыі зьяўлялася тое становішча, што нашы сельсаветы не павярнуліся яшчэ тварам да калгасаў, да задач калгаснага будаўніцтва. Сельсаветы да апошніх перавыбараў не кіравалі работай калгасу і ў большасьці сваёй не займаліся, як сьлед, справай арганізацыі і ўзмацненьня калгасаў. Таксама надарэмна кепска працуе наш калгасны апарат, які павінен быў-бы ў першую чаргу, праводзіць і арганізоўваць работу па калектывізацыі.

Да апошняга часу ў радзе раёнаў панае апартуністычная недаацэнка работы з беднатой. А чым можна тлумачыць слабую пастаноўку работы сярод беднаты? Тым, што ў многіх раёнах мясцовый работнікі ня бачылі клясавага ворага, не знаходзілі кулака.

Тыдні два таму назад у нас налічвалася звыш 20 раёнаў, якія ня здолелі вынайсьці ні аднаго кулака для абкладаньня надаткам у індывідуальным парадку. А калі няма кулака, дык супроць каго-ж арганізаваць беднату? Так разважалі многія мясцовыя работнікі. Вось у чым прычыны слабай работы беднаты. Таварышы не крыкмячалі, што робіцца пад носам у калгасах і вакол калгасаў.

Замест таго, каб замацоўваць батрацка-бяднацкае ядро ў калгасах, каб арганізоўваць беднату вакол калгасаў, замест таго, каб ачышчаць калгасы ад кулацкіх элементаў, у многіх выпадках распаўсюджваліся апартуністычныя тэорыі аб тым, што кулака ў раёне няма, у той час, калі кулак, прабраўшыся ў калгас, разбурваў гэты калгас энтуры. Гэта-ж факт, што ў калгасах Сеньненскага раёну выкрыта звыш 100 кулакоў. Гэта-ж факт, што зараз, праводзячы чыстку калгасаў, выкідваецца з іх па 50-60 кулакоў у раёне. Зразумела, што кулацкія элементы праводзілі работу супроць нас, супроць калектывізацыі, за развал калектыўных гаспадарак.

Кулак нашчупвае самыя слабыя месцы ў калгасным будаўніцтве для таго, каб перашкаджаць далейшаму калгаснаму руху. Кулак вядзе работу супроць увядзеньня цьвёрдых норм выпрацоўкі, за ядзіцкія прынцыпы разьмеркаваньня прыбытку і ўраджаю, за не ўвядзеньне норм корму для жывёлы і г. д. Па гэтай дзейнасьці кулакоў трэба бязьлітасна біць, давесьці да канца ачышчэньне калгасаў ад кулацкіх элементаў, выкрываць і перамагаць апартуністычную практыку ў калгасным будаўніцтве.

Наша задача заключаецца ў тым, каб разгарнуць работу па ўзмацненьні новых калгасаў. Мала арганізаваць калгас. Яго трэба замацаваць, сваячасова стварыць пасеньня фонды, абагуліць асноўныя сродкі вытворчасьці і арганізаваць працу ў калгасе. Калі мы цяпер не замацуем таго, што маем, не замацуем ксбага калгаснага грыліву, дык можам сустрэцца з такой небясьпекай, што ўвесну можа быць адліў. Разам з правядзеньнем работы па арганізацыі новых калгасаў трэба праводзіць сыстэматычную работу па ўзбуйненьні існуючых дробных калгасаў.

Як мага хутчэй трэба ліквідаваць недаацэнку значэньня МТС у справе разгортваньня калгаснага руху. Ужо зараз раёны, дзе будуюцца МТС, пачынаюць ісьці наперадзе астатніх раёнаў у справе калектывізацыі. Гэтыя раёны ў сапраўднасьці павінны ісьці першымі па выкананьні ўсіх заданьняў. Мабілізацыю сродкаў на будаўніцтва МТС трэба рашуча ўзмацніць, інакш мы сарвем будаўніцтва МТС.

За апошнія гады мы дабіліся значных посьпехаў калектывізацыі ня толькі беларускага насельніцтва, але і бяднацка-серадняцкіх мас нацменшасьцяй. Па лініі калектывізацыі польскіх, латыскіх, літоўскіх-сельсаветаў, па лініі ўцягненьня дзёрэйскай беднаты ў калгасы мы маем процант калектывізацыі значна больш, чым сярэдні па рэспубліцы.

Перавагі калектыўных гаспадарак

Калгасы БССР ужо ў гэтым годзе—у першым годзе масавай калектыўнай работы—паказалі вялізарныя перавагі перад аднаасобнымі гаспадаркамі. Перавагі кожнага калгасу над дробнай суседняй аднаасобнай гаспадаркай павінны быць відомы кожнаму аднаасобніку. Мы невыстарчальна скарыстоўваем гэтыя перавагі ў нашай рабоце за арганізацыю новых калгасаў, за арганізацыю новага калгаскага прыліву.

Мы толькі ў выніку складаньня простых сродкаў вытворчасьці і калектыўнай працы ў калгасах значна падвысілі і забясьпечылі больш эфэктыўнае скарыстаньне інвэнтару, чым у аднаасобных гаспадарцах.

Ураджайнасьць у калгасах значна вышэй ураджайнасьці ў аднаасобнай гаспадарцы. Напрыклад, з аднаго га ў калгасе назьбіваецца жыта 8,8 цэнтнераў, а ў аднаасобніку—7,9 цэнтн., аўса—у калгасе—9,2 цэнтн., у аднаасобніка—8,3., ячменю ў калгасе—7,5, у аднаасобніка—6,9., бульбы ў калгасе—100, у аднаасобніка—96.

Мы маем перавагі ня толькі ў галінах палявых культур, а дасягнулі некаторага эруху і палепшэньня ў справе жывёлагадоўлі.

Нарэшце, таварышы, надзвычайна цікавыя прыклады пераважнасьці калектыўнай гаспадаркі над дробнай аднаасобнай заключаюцца яшчэ і ў тым, што на апрацоўку аднаго га, засеў і абмалот у калгасе траціцца значна менш часу, чым у аднаасобнай гаспадарцы. Для таго, каб апрацаваць 1 га жыта (сюды ўключаецца ўся работа ад пачатку да канца) у калгасе затрачана ў гэтым годзе 21,9 дзён, а ў аднаасобніка—37,8.

На апрацоўку аднаго га аўса ў калгасе затрачана 19,7 дзён, у аднаасобніка—33 дні. Па ячмені аднаведна—21,6 і 40; па бульбе—69,4 і 26, па ўзборцы сенажаці—9,1 і 11, 9.

Адзначаючы гэтыя перавагі, трэба канстатаваць, што затраты і ў калгасах зьяўляюцца яшчэ надзвычайна высокімі і ні ў якім разе яны пас ня могуць задаволіць. Лепшая арганізацыя працы, працэс мэханізацыі сельскай гаспадаркі і вытворчасьці з кожным годам будуць даваць усё больш высокую эфэктыўнасьць. Маніўлізацыя і паступовая энэргізбраенасьць работы калгасьнікаў з кожным годам у нас павялічваецца.

У сувязі з тым, што мы маем значныя перавагі ў выкарыстаньні сродкаў вытворчасьці, мы маем і большыя матэрыяльныя вынікі ад работы калгасьнікаў у параўнаньні з работай аднаасобнікаў. Валавы прыбытак на адну сям'ю у калгасе ў гэтым годзе складае каля 1.000 руб., а чысты прыбытак, як правіла, у калгасьнікаў значна вышэй таго прыбытку, які яны мелі будучы на аднаасобнай гаспадарцы і таго, які мае суседні калгасьнік што не ўвайшоў яшчэ ў калгас.

Аднак, гэтыя посьпехі і перавагі зьяўляцца яшчэ першапачатковымі. Гэта толькі пачатак вялікай работы. Мы далёка яшчэ не выкарыстоўваем поўнасьцю тыя вялізарныя магчымасьці, якія дае калгас для арганізацыі высокатаварнай гаспадаркі. Гэта тлумачыцца тым, што мы невыстарчальна працуем над упутранай арганізацыяй гаспадаркі ў калектыве.

Мы маем яшчэ ў радзе арцеляй сярод калгасьнікаў шырока распаўсюджаныя дробнабуржуазныя настроі і пыхкалёгію. Гэта пыхкалёгія адразу не ліквідуецца як нельга вынішчыць у адзін дзень. Мы павінны працаваць над выхаваньнем калгасу. Між тым, у гэтых адносінах мы працуем надзвычайна слаба. Калі мы працуем надзвычайна слаба. Калі мы арганізавалі сельска-гаспадарчую арцель, дык ужо лічым, што асноўнае нами зроблена, што далей калгас будзе сам ца сабе арганізоўваецца.

У выніку таго, што мы невыстарчальна працуем над арганізацыяй гаспадарки ў калгасе, мы маем у многіх калгасах наўпасьць безгаспадарчасьці і нізкую працоўную дысцыпліну, нізкія паказальнікі працы, кепскае выкананьне раду гаспадарчых заданьняў і г.д. У прыватнасьці, яшчэ ў радзе калгасаў ня скончан абмалот да гэтага часу.

Работу калгасаў—на рэйкі гаспаборніцтва і ўдарніцтва

Асноўная прычына незадавальняючых якасных паказальнікаў у калгасе заключаецца ў невыстарчальнай арганізацыі працы, у несваячасовым і няправільным у радзе месц, разьмеркаваньні прыбытку і ўраджаю. Да першага студзеня ў 60% калгасаў ня былі яшчэ ўведзены нормы выпрацоўкі і працаваў кожны столькі, колькі ён хацеў. У 24% калгасаў да 10-га лютага ня было праведзена канчаткова разьмеркаваньня прыбытку і ўраджаю. Неправядзеньнем да гэтага часу канчаткова разьмеркаваньня прыбытку і ўраджаю аказваецца лепшая паслуга і дапамога кулаку ў яго рабоце супроць калгаснага будаўніцтва.

Нарэшце, мы ў выкананьні задачы па арганізацыі працы маем вельмі слабы разгорнутае сацспаборніцтва. Сацспаборніцтвам у нас ахоплена толькі 26,7% калгасаў, толькі ў 26% калгасаў мы маем ударныя брыгады.

На даная ступені калгаснага будаўніцтва мала ўжо займацца толькі арганізацыяй калгасаў, а трэба ставіць з усёй сілай з усёй рашучасьцю задачы і патрабаваньне высокіх якасных паказальнікаў. Мала толькі пытацца сколькі і ў [illegible] арганізаваць новых [illegible] ...ры умовах, калі ў кіраўніцтве ня будзе правых апартуністаў. Трэба зараз пытацца ўжо колькі пастаўлена ў вас у калгасах таварных малочных гаро[illegible], колькі гэта таварнае малочнае стада дало малака, колькі ў нас у калгасах пастаўлена сьвінаматак, колькі гэтыя сьвінаматкі далі адкормленых сьвіней і г.д.

Адным словам, барацьба за якасныя паказальнікі, за высокую таварную прадукцыю павінна быць пастаўлена ў цэнтры ўвагі і на выкананьне гэтай задачы павінна быць мабілізавана ўся калгасная маса. Высокую якасьць паказальнікаў працы можна забясьпечыць выключна толькі на падставе правільнай арганізацыі працы, правільнага і поўнага выкарыстаньня працоўнай сілы.

Як у нас скарыстоўваецца рабочая сіла зараз? Мы праверылі, вывучылі гэта пытаньне на 9 калгасах. Даныя вывучэньня гаворяць аб тым, што рабочая сіла скарыстоўваецца ў сярэднім толькі на 55%. У найбольш напружаныя часы работы гэты процант падымаецца да 62%. У сяцыялізаваных сьвінародных і жывёлаводных калгасах гэты процант некалькі вышэй, адна, далёка яшчэ да поўнага выкарыстаньня рабочай сілы. Правільная арганізацыя рабочай сілы павінна даць нам высокую таварную гаспадарку і прадаставіць магчымасьць аслабаніць лішкі рабочай сілы для нашай сацыялістычнай прамысловасьці і для сэзонных работ.

Нам трэба цьвёрда перайсьці на вучот працы ў працадзёнах, а не ў грашовых вылічэньнях. Разьмеркаваньне прыбытку і ўраджаю праводзіць выключна па колькасьці і якасьці затрачанай працы кожным калгасьнікам. У сувязі з надыходзячай веснавой сяўбой трэба ўжо зараз растлумачыць калгасьнікам, што разьмеркаваньне прыбытку і ўраджаю мы будзем праводзіць выключна выходзячы з таго, колькі гэты калгасьнік працаваў і як працаваў. Устанаўленьне цьвёрдых норм выпрацоўкі, зьдзельшчыны трэба шырока растлумачыць сялянству, як належыць, работу ў гэтым напрамку. Трэба абавязкова ўзмацніць тэмпы камплектаваньня, прыцягнуць калгасныя масы да задач камплектаваньня, зацікавіць іх, растлумачыць, што сьвінагадоўля ў калгасе зьяўляецца адной з прыбытковых галін гаспадаркі, трэба абавязкова палепшыць догляд жывёлы, арганізаваць прэміяваньне тых калгасьнікаў і калгасьніц, якія даглядаюць сьвіней. Неабходна значна палепшыць адкорм, узьняць эфэктыўнасьць адкорму і стварыць кармовую базу.

Бальшавіцкія тэмпы—другой калгаснай вясьне

Ступень падрыхтоўкі да веснавой сяўбы не забясьпечвае таго, каб веснавая пасеўная кампанія была праведзена па-бальшавіцку. Незадавальняючая рамантуецца сельска - гаспадарчы інвэнтар, кепска ідзе засыпка насенных фондаў і надзвычайна слаба праходзіць загатоўка насеньня. Падрыхтоўку да сяўбы трэба неадкладна забясьпечыць бальшавіцкае правядзеньне другой калгаснай вясны.

У нас справа з пасеньнем кармавых траў і гародных культур у гэтым годзе настолькі цяжкая, што калі мы не скарыстаем усіх магчымасьцяй для загатовак гэтых культур, мы зможам сарваць праграму сяўбы траў і гародных культур і гэтым самым сарваць выкананьне заданьняў па арганізацыі гародаў і стварэньні кармовай базы.

Ня гледзячы на такое напружанае становішча, мы маем рад раёнаў, дзе справа насеньнаводзтва зусім недаацэнена. Школнікі ў сваёй дзейнасьці адным з аб'ектаў школьніцтва іменна бралі і насеньнаводзтва, імкнуліся стварыць такія ўмовы, якія пазбаўлялі-б нас магчымасьці стварыць кармавую базу і арганізаваць необходную колькасьць гародаў і г. д. Ня гледзячы на гэтыя цяжкасьці, мы павінны забясьпечыць становчае вырашэньне пытаньня насеньнаводзтва. Соромна ўвозіць з-за мяжы і траціць валюту на такое насеньне, як рэдзька, капуста, пятрушка і інш. Мы самі павінны арганізаваць вырашчываньне гэтых культур у калгасах.

У рабоце па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, па арганізацыі калгаснага прыліву мы павінны ўзяць сапраўдным бальшавіцкія тэмпы, па-баявому разгарнуць работу ў гэтым напрамку выкананьня задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі, вядучы бязьлітасную барацьбу з апартуністычнай практыкай, «левацкімі» загібамі ў калгасным будаўніцтве.

2-я чарговая сэсія савету Белкаапсаюзу,

адкрываецца 2-га сакавіка ў 7 гадзін вечара ў памяшканьні Дому Селяніна.

Фракцыя савету—у 6 гадзін

Месцы як для членаў савету, так і для запрошаных з месц забраніяваны ў Доме Селяніна, куды ўсім прыяжджаючым і патрэбна зьявіцца.

ПРАЎЛЕНЬНЕ БЕЛКААПСАЮЗУ.

*) Судаклад надаецца ў скарочаным выглядзе.

ДАГНАЦЬ І ПЕРАГНАЦЬ КАПІТАЛІСТЫЧНЫЯ КРАІНЫ—НАША АСНОЎНАЯ ЗАДАЧА

ПРАМОВА тав. БЭНЭКА

Таварышы, Х-ты зьезд саветаў Беларусі сабраўся ў пачатку 3 рашаючага году пяцігодкі. Наметкі першых двух год пяцігодкі, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, рабочай клясай у саюзе з асноўнымі масамі сялянства выкананы а посьпехам. Мы амаль па ўсіх паказальніках маем перавыкананьне намётак пяцігадовага пляну. Калі мы паглядзім на лічбы росту нашай гаспадаркі на працягу двух апошніх год, мы ўбачым, што мы можам ня толькі раўняцца ў росьце з якімі-небудзь краінамі, але мы ня ўбачым ніколі ў гісторыі такіх вялізарных тэмпаў будаўніцтва, якія мае наш Савецкі Саюз. Нашы посьпехі на будаўніцтве нашай гаспадаркі праходзілі ня толькі ў барацьбе супроць клясавых ворагаў, супроць кулака на вёсцы і нэпмана ў горадзе, супроць шкоднікаў — агентаў міжнародная буржуазіі. Гэтых посьпехаў партыя дабівалася таксама ў барацьбе супроць правага ўхілу, які зьяўляецца найбольш небясьпечным на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва, і супроць усякіх праяў «левых» загібаў і г. д. І толькі дзякуючы таму, што гэта лінія партыі праводзілася Саветамі, што гэтую лінію падтрымлівалі найшырэйшыя масы рабочых і сялян, мы можам зараз, падлічваючы нашы посьпехі, накрэсьліваць новыя плыны і ісьці далей па шляху разгортваньня нашага будаўніцтва і выкананьня пяцігодкі за чатыры гады.

З-ці год пяцігодкі, у які мы зараз уступілі, зьяўляецца рашаючым годам. І таму тэмпы, якія мы зараз бярэм, у некалькі раз перавышаюць па паасобных галінах народнай гаспадаркі тыя тэмпы, якія мы мелі ў папярэднія два гады пяцігодкі. Таму, таварышы, мы маем рад дадатковых труднасьцяй, якія трэба будзе перамагчы выразнай пастаноўкай працы, лепшай працай у папых савецкіх установах і яшчэ большай мабілізацыі працоўных мас на выкананьне пяцігодкі. Зараз мы ставім перад сабой задачу ня толькі выкананьня пяцігодкі за чатыры гады, а стаўім ужо пытаньне аб тым, каб на працу 3-га рашаючага году выканаць па паасобных рашаючых галінах нашай прамысловасьці пяцігодку за 3 гады. У гэтым годзе па паасобных галінах нашай вытворчасьці ўжо даганяем такія краіны, як Англія. Мы ў гэтым годзе калі выканаем наш плян (а мы ўпэўнены ў тым, што ён будзе выкананы), дагонім і нават перагонім Англію ў вытворчасьці мэталю. Гэта значыць, што па справе ажыцьцяўляецца лёзунг партыі — дагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны ў тэхніка-эканамічных адносінах.

Зараз, таварышы, наша краіна, дазнаўшы [illegible] ...ходзку ў больш [illegible] чым раней вызначылі, мае магчымасьць ліквідаваць беспрацоўе амаль цалкам. [illegible] ...ка справа з кваліфікаванымі кадрамі. У той час, як буржуазны сьвет перажывае вялізарныя труднасьці, калі ў капіталістычным сьвеце ёсьць 35 мін. беспрацоўных, калі ў Бэрліне — сталіцы Нямеччыны —у гэтым годзе было каля 2-х тысяч самагубстваў на грунце голаду, на грунце беспрацоўя, наш Савецкі Саюз мае значны рост. З другога боку, калі мы паглядзім на той страшэнны эканамічны крызіс, які мацца ва ўсім сьвеце, для нас, таварышы, зусім ясным стане, што капіталістычны сьвет ня выйдзе з гэтых труднасьцяй.

Зараз супроць нас буржуазія высоўвае новыя «абвінавачаньні» (гэта ўжо апошнае, як кажуць, вынаходзтва буржуазіі), што ў нас у Савецкім Саюзе існуе «рабскій праца», што ў нас працуюць усе, як рабы. І цікавая рэч — як гэта «рабы» будуюць сацыялізм і падымаюць культуру і тэхніку. У той час, калі амаль ва ўсіх краінах маюцца мільёны беспрацоўных, якія шукаюць работы, у той час, як у многіх буржуазных краінах маюцца мільёны рабоў, якія прадаюцца і купляюцца, буржуазія зараз рабочым усяго сьвету, сваім рабочым хоча расказваць аб тым, што ў нас маецца «рабскій праца». Буржуазія, вразумелая рэч, хлусіць. У гэта ня толькі рабочыя іншых краін не паверацъ, але гэтаму не паверацъ нават і некаторыя здраўмысьлячыя і некалькі велаючыя Савецкі Саюз — буржуазныя дзеячы.

Ня гледзячы на ўсе тыя кампаніі, якія вядуцца супроць Савецкага Саюзу, ня гледзячы на ўсе гэтыя труднасьці і перабоі, якія мы зараз наглядаем, мы цьвёрда перад сабой ставім задачу ў гэтым годзе ўсё вызначаныя паказальнікі пяцігадовага пляну ў трацім рашаючым годзе пяцігодкі выканаць і нават перавыканаць.

Я хачу спыніцца на некалькіх, акрамя гэтага, канкрэтных пытаньнях, у сувязі з дакладам тав. Галадзеда. Мы зараз знаходзімся ў такім становішчы, калі амаль усе пытаньні гаспадарчага будаўніцтва ўпіраюцца ў транспарт. Мы, таварышы, у гэтым годзе, а таксама і ў мінулым годзе ўклалі значную суму сродкаў у наш транспарт, у наша шляховае будаўніцтва, але трэба адзначыць, што калі мы можам пахваліцца ва ўсіх галінах значнымі посьпехамі, то ў галіне транспарту, дарожнага будаўніцтва мы далёка адстаем ня толькі таму, што мы даем мала сродкаў на гэта, але таму, што да гэтай справы няма ўвагі на мясцох. У гэтым годзе ў дарожнае будаўніцтва мы ўкладаем 18 міл. рублёў. Гэта сума немаленькая, гэта сума значная і калі мы на раённых зьездах саветаў, на ўсялякага роду сходах можам пачуць гутаркі аб чым хочаце, то наконт дарожнага будаўніцтва мы чуем вельмі і вельмі мала. Трэба справу дарожнага будаўніцтва вынесьці на шырокае абгаварэньне працоўных мас, трэба гэтую справу паставіць у сельсаветах, у калгасах. Трэба мабілізаваць вакол гэтай справы савецкую грамадасьць, трэба ажывіць работу аўтадору і справу дарожнага будаўніцтва трэба паставіць пад грамадзкі кантроль, чаго да гэтага часу ў нас ня было. Трэба, каб аб важнасьці дарожнага будаўніцтва ведалі працоўныя масы. Мы да канца гэтага году будзем мець ужо аўтамабілі, якія будуць налічвацца дзесяткамі тысяч па СССР. Гэта, таварышы, ужо не старая Расія, а гэта Савецкі Саюз, які пераходзіць на машыны, на трактары, на аўтамабілі і г. д., і таму трэба гэтым машынам даць дарогу. Трэба заставаць горад з вёскай, чаго да гэтага часу мы не ажыцьцяўлялі цалкам, але што мы павінны ажыцьцявіць. Я, таварышы, лічу, што калі мы будзем заставацца з такімі дарогамі, як да гэтага часу, мы не пасьпеем на фабрыках выраблянць машыны, бо мы іх будзем вельмі часта ламаць. Ёсьць такая ўстаноўка: «лайце машыну, дарога будзе». Гэта прагільна, я з гэтым згаджаюся, што калі мы дадзім машыну, [illegible] ...ложыць сабе дарогу. Але чакаць таго часу, покуль машына прыдзе і нічога зараз не робіць, [illegible] ...гадзіны.

...даркі значна [illegible] Вы ўсе ведаеце, а якімі труднасьцямі нам прышлося сустрацца. У гэтым годзе пры бульбазагатоўках, калі мы бачылі, як селяніне якіх-небудзь 25 кілёмэтраў ехаў на працягу 7-10 гадзін і варочаўся да сабе на вёску бяз воза. Чаму? — Таму, што і воз у яго дрэнны, а дарога яшчэ горшая. Мы да гэтага часу выкарыстоўвалі вельмі дрэнна машы посавыя дарогі. На будучы год мы вызначаем больш магутны рух наперад. Мы лічым, што мы павінны пасеяць каля 700 тысяч га бульбы — гэта тэхнічная культура, адна з асноўных у БССР; мы павінны пасеяць 260 тыс. га ільну, канапель.

Далей наконт сувязі. Пытаньне сувязі зараз набывае вялізарнейшае значэньне, бо сувязь таксама зьязвае калгасную вёску з пралетарскім цэнтрам, з пралетарскім горадам.

Мы праз сувязь можам нямат чаго даць вёсцы, можам даць канцэрты, можам даць сваячасова ўсякага роду весткі аб тым, што робіцца на сьвеце, можам чытаць лекцыі. Мы ня можам паслаць у кожную вёску падрыхтаванага лектара, а гэта можна зрабіць з усім лёгка пры радыё. А ў нас сувязь, трэба прызнацца, пастаўлена дрэнна. Сувязь не адпавядае тым запатрабаваньням, якія ставіць перад намі растучая сацыялістычная гаспадарка, і запатрабаваньням працоўных мас Савецкай Беларусі.

Таму трэба на мясцох сувязі аддаць больш увагі, чым да гэтага часу аддавалася. Таксама трэба будзе, каб нашы працаўнікі сувязі працавалі лепш, чым да гэтага часу працуюць.

А што мы маем на справе? На самай справе мы маем цэлы рад прарываў, якія трэба будзе ліквідаваць.

І апошняе, над чым я хацеў спыніцца — гэта наконт нашых раёнаў і гаспадарчых арганізацый, якія працуюць у раёнах. Трэба, каб райвыканком быў гаспадаром. Нельга ставіць так пытаньне, як многія ставяць — чаму ты нічога не зрабіў, — таму, што райвыканком нічога не зрабіў. Як быццам, райвыканком павінен рабіць за ўсіх, а вялікія штаты ў нашых леспрамгасах, у саўгасах, у начальніках будаўнічых работ і г. д., зьяўляюцца безадказнымі і могуць нічога не рабіць. Яны ня хочуць пайсьці да селяніна, яны ня хочуць пагаварыць з селяніном аб той ці іншай справе, якую трэба зараз праводзіць. Яны прывыклі да таго, каб увесьці гужпавінасьць, каб праводзіць працу адміністрацыйным, а не палітычным шляхам. Трэба будзе прывучыць да таго, што райвыканком адказвае за ўсю работу ў раёне.

За агідпасьці ў саміх арганізацыях павінны адказваць іх кіраўнікі.

(Голас з месца — правільна).

Вазьмеце вы загатоўкі. У гэтым годзе плян загатовак ідзе нездавальняюча ў некаторых галінах, ня гледзячы на тое, што працуюць усе—і ячэйкі, і сельсаветы, і РВК, не працуе толькі загатоўчы апарат, не працуе каапэрацыя. Нават тое, што сельсаветы загатовяць шляхам разгортваньня грамадзкасьці і арганізацыі бяднацка-серадняцкіх мас, не заўсёды, як сьлед, прымае наша загатоўчая сетка.

Мы маем цэлы рад выпадкаў, калі прыказчык адносіцца да селяніна, да калгасьніка ня так, як павінен адносіцца савецкі працаўнік, савецкая каапэрацыя да працоўных. Трэба будзе зрабіць так, каб мы ў будучую загатоўчую кампанію сустрэліся з іншым апаратам.

Таксама трэба пераглядзець тыя арганізацыі, якія займаюцца дарожным будаўніцтвам. Ёсьць у нас у Беларусі дзесяткі тысяч рабочых, сялян-беднякоў, якія ўсё сваё жыцьцё працавалі ў лесе, якія маюць вялікую практыку. Іх трэба даць некаторыя веды, іх трэба навучыць проста пісьменнасьці і яны будуць добрымі дзесятнікамі, лепшымі чым многія тыя «спэцыялісты», якія ў нас зараз працуюць [illegible] ...таваччаных трэба за ...хацець гэта зрабіць [illegible] ...біт і тады будуць [illegible] ...загатоўкі, у пе... ...ваньсьці загатоўка лесу, пройдуць лепш. Мы маем выпадкі, калі прыходзяць у [illegible] ...ны прыказчыкі [illegible] ...ны раён выдаткоўвае 40-50 тысяч рублёў, а некаторыя гарады дазволілі сабе выдаткоўваць 300.000 рублёў на-за ўсялякіх плянамі, па-за ўсялякімі бюджэтамі. Гэта падалей цярпець немагчыма ні ў якім выпадку. У нас маецца 100 раёнаў і акрамя таго маецца некалькі самастойных гарадзкіх саветаў. Калі ўсё пачнуць так рабіць, дык будуць увесь час прарывы ў бюджэце і ў пляне і тады мы ня зможам, як сьлед, выконваць тых намётак, якія маюцца ў нашым пляне. Таму дысцыпліна ў нашай працы павінна адыгрываць большую ролю, чым да гэтага час

Новымі ўдарнымі брыгадамі

работніц і калгасьніц, разгортваньнем магутнага калгаснага прыліву—сустрэнем Міжнародны камуністычны жаночы дзень

Масавую работу парт'ячэек сярод працоўных жанчын— НА ВЫШЭЙШУЮ СТУПЕНЬ

Пад знакам змаганьня за калектывізацыю

3-га сакавіка, Міжнародны камуністычны жаночы дзень, павінен быць праведзен у калгасах, як вялікая палітычная кампанія па растлумачэньні шырокім масам калгасьнікаў і калгасьніц сучаснага міжнароднага і ўнутранага становішча СССР і БССР.

Небясьпека ваеннага нападу на Савецкі Саюз — бацькаўшчыну міжнароднага пралетарыяту з боку сусьветнага імпэрыялізму ўзрастае з кожным днём. Імпэрыялісты арганізуюць паход на Савецкі Саюз, каб узброенай сілай спрабаваць пасьпяховае будаўніцтва сацыялізму ў СССР. Адгэтуль задача: у адказ на шапёную падрыхтоўку імпэрыялістаў ваеннага нападу на Савецкі Саюз — павышаць тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, пасьпяхова перавыконваць заданьні пяцігадовага плану.

З пастановамі апошніх пленумаў ЦК і ЦКК УсеКП(б) і КП(б)Б, якія вызначаюць вялікія пляны работ на 3-ці разлічны год пяцігодкі, павінны быць ахоплены шырокія масы калгасьнікаў і калгасьніц.

У гэту вясну неабходна мабілізаваць масы на ўзьняцьце новай магутнай хвалі калгаснага прыліву бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы. Дасьвецці процант калектывізацыі да 30 ж канца веснавой пасеўнай кампаніі і 45 проц. да канца году, поўнасьцю выканаць пляны веснавой сяўбы, ставшыць буйныя таварныя: жывёлагадоўчыя і сьвінаводчыя гаспадаркі, поўнасьцю і ў тэрмін выканаць заданьні па всіх відах загатовак, вядучы рашучае змаганьне з права - апартуністычнай стаўкай на самацёк, «левымі» загібамі і прымірэнцтвам да іх—вось вузлавыя пытаньні работы, якія забясьпечаць большэйшыя тэмпы ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Уся падрыхтоўчая праца да сьвяткаваньня Міжнароднага камуністычнага жаночага дня ў калгасах, павінна быць праведзена як генэральны агляд працы парт'ячэек сярод калгасьніц, праверка пастаноўкі масавай сыстэматычна - выхаваўчай работы з калгасьніцамі.

Неадкладна распачынаючы падрыхтоўка да правядзеньня Міжнароднага камуністычнага жаночага дня, калгасы павінны скласьці практычныя пляны падрыхтоўчай працы. Неабходна вызначыць мерапрыемствы па ўцягненьні калгасьніц на ўсе галіны калгаснай гаспадаркі. Трэба арганізаваць перакваліфікацыю калгасьніц, выпушчаных із школ, пад кіраўнічую работу па асобных галінах ужытку, трымаючы ... з тым, каб на менш 30 проц. жанчын у адносінах да агульнага складу, былі на кіраўнічай рабоце калгасу. Пытаньні павышэньня ўдзелу жанчын у калгасным гаспадарцы павінны быць абгавораны на дэлегацкіх сходах і агульных сходах калгасьніц.

Неабходна разгарнуць шырокую работу па папулярызацыі на сходах бяднячак і сераднячак - аднаасобніц пераваг працы і быту калгасьніцы перад аднаасобніцай. Пры правядзеньні гэтага трэба асабліва падкрэсьліць ролю жанчыны ў будаўніцтве калгасаў, прыкладнасьць асобных ударніц - калгасьніц. Як практычнае мерапрыемства павінны быць арганізаваны вярбовачныя камісіі, атрады жанчын — агітатараў за калгас з прыкладных калгасьніц-ударніц. Вярбовачныя камісіі і атрады жанчын—агітатараў за калгас, павінны стаць актыўнымі арганізатарамі магутнай хвалі прыліву ў старыя калгасы і арганізацыі новых. На дэлегацкіх сходах жанчын са складу дэлегатак - аднаасобніц арганізаваць ініцыятыўныя групы па арганізацыі калгасаў. Як практычны вынік гэтай працы—усе дэлегаткі некалгасьніцы павінны быць уцягнуты ў калгас. КОЖНАЯ АКТЫВІСТКА КАЛГАСЬНІЦА ДА 8-га САКАВІКА ПАВІННА ЎЦЯГНУЦЬ НЯ МЕНШ 1 БЯДНЯЦКА - СЕРАДНЯЦКАЙ ГАСПАДАРКІ Ў КАЛГАС.

У парадку правядзеньня працы да вес навой пасеўнай кампаніі па ўсіх раёнах трэба правесьці раённыя нарады, канфэрэнцыі жанчын - калгасьніц пры ўдзеле батрачак, бяднячак і сераднячак аднаасобніц, зьлёты жанчын грамадзкіх работніц (сельсавецкага актыву і інш.), арганізуючы экскурсіі іх у калгасы, паказальныя па пастаноўцы сваёй працы.

На бліжэйшых жаночых дэлегацкіх сходах трэба абгаварыць пляны веснавой пасеўнай кампаніі. Неабходна праверыць рацыянальнае скарыстаньне жаночай працы ў калгасах, уцягваючы жанчыну калгасьніцу ва ўсе галіны працы калгасу.

У тых мясцох, дзе пераважна скарыстоўваецца жаночая работа трэба арганізаваць асобныя жаночыя вытворчыя нарады. Гэта дасьць магчымасьць больш уцягнуць калгасьніц у справу па ўмацаваньні калгасаў.

Праўленьні калгасаў павінны распрацаваць пытаньне аб ахове працы жанчын у калгасах, вызначыўшы адпачынек па цяжарнасьці і забесьпячэньне на гэты час з фонду непрацездольнасьці. У кожным калгасе, дзе налічваецца на менш 20 дзяцей ясельнага, або дашкольнага ўзросту, разгарнуць масавую працу па арганізацыі дзіцячых устаноў у калгасах.

Усе пытаньні парадку дня зьезду ... Міжнароднага ... калгасах, павінна праходзіць пад знакам шырокага разгортваньня сацыпаборніцтва і ўдарніцтва як паміж асобнымі брыгадамі, так і паміж калгасамі, з тым, каб правядзеньне сьвяткаваньня паслужыла арганізатарам магутнага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва ў калгасах і асабліва сярод калгасьніц.

А—іч.

Мабілізуем сродкі на індустрыялізацыю

СХОД АКТЫВУ РАБОТНІЦ ФАБРЫКІ «ДНЯПРОЎСКАЯ МАНУФАКТУРА» (ДУБРОЎНА) У АДКАЗ НА ШАЛЁНУЮ КАМПАНІЮ ХЛУСЬНІ І ПАКЛЁПАЎ СУСЬВЕТНЫХ КАПІТАЛІСТАЎ НА САВЕЦКІ САЮЗ БЫЦЦАМ У КРАІНЕ БУДАЎНІЦТВА САЦЫЯЛІЗМУ ЎЖЫВАЕЦЦА ПРЫМУСОВАЯ ПРАЦА, ПРЫСТУПІЛ ДА РАБОТЫ ПА МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ.

НА ФАБРЫЦЫ МЕЎ МЕСЦА ПРАРЫЎ У СПРАВЕ РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ «ПЯЦІГОДКА—ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ». 300 РАБОЧЫХ ФАБРЫКІ НЯБЫЛІ АХОПЛЕНЫ ПАДПІСКАЙ.

ЗА АДЗІН ДЗЕНЬ БРЫГАДА РАБОТНІЦ АБЫШЛА ЎСЮ ЗЬМЕНУ І НА ЎСЁ 100 ПРОЦ. АХАПІЛА РАБОЧЫХ ПАДПІСКАЙ НА ПАЗЫКУ. ЗАРАЗ БРЫГАДА ПРАЦУЕ СЯРОД РАБОЧЫХ ІНШЫХ ЗЬМЕН.

НА ГЭТЫМ-ЖА СХОДЗЕ 17 РАБОТНІЦ ПАДПІСАЛІСЯ НА АКЦЫІ ТРАКТАРАЦЭНТРУ Ў СУМЕ 170 РУБ. І АБВЯСЬЦІЛІ СЯБЕ ЎДАРНІЦАМІ ПА РАСПАЎСЮДЖВАНЬНІ АКЦЫІ.

ВАЎЧОК.

Калгасьніц—на кіруючую работу

Гады 2 таму назад у ВУЛЬСКІМ РАЁНЕ на кіруючай работе ў савецкім і гаспадарчым апараце амаль зусім ня было жанчын. Праз некаторы час, праўда, вельмі нэпэўнена высунулі актывістку-калгасьніцу Мацієўскую на пасаду старшыні сельсавету. Першы пэрыяд працаваць было цяжка, але з работай у асноўным спраўлялася. Мацієўская была выбрана членам АВК і ЦВК БССР. Зараз працуе жанарганізатарам РК КП(б)Б.

Тав. Трапач працавала такоама старшынёй сельсавету. Зараз--старшыня РКСУ. У апошнія перавыбары сельсаветаў на кіруючую работу выбраны новыя актывісты з калгасьніц, батрачак і бяднячак. Рад жанчын працуюць старшынямі і сакратарамі сельсаветаў.

А. МІКУЦКІ.

КП(б)Б БЯЗЬЛІТАСНА У ЗМАГАНЬНІ за ажыцьцяўленьне ленінскай нацпалітыкі

БЕСПАВАРОТНА ГНАЦЬ З НАШЫХ РАДОЎ НАЦЫЯНАЛ-АПАРТУНІСТАЎ І ШАВІНІСТАЎ УСІХ КОЛЕРАЎ

Яўрэйскі шавініст Сосіс выключан з партыі

Супроць бундаўскай контр-рэвалюцыйнай ідэалёгіі

Мы сёньня друкуем пастанову прэзыдыуму МенгарКК КП(б)Б па справе Сосіса. Гэта пастанова выцякае з нашай барацьбы за правільную ленінскую нацыянальную палітыку.

Цяперашні этап сацыялістычнага будаўніцтва зьяўляецца этапам завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР. Гэта — этап, калі мы ліквідуем апошнюю буржуазную клясу ў краіне — кулака — на базе суцэльнай калектывізацыі, якая пасьпяхова праводзіцца ў нашай краіне. Гэты пэрыяд, які ня мае сабе роўнага ў гісторыі, пэрыяд рашучага сацыялістычнага наступленьня на ўсім фронце, вельмі багаты вялікімі клясавымі перамогамі пралетарыяту. Адчуваючы свой заняпад, бачачы сьмерць перад вачыма, адміраючая буржуазная кляса ня хоча ўступіць сваіх пазыцый і, змагаючыся за свае клясавае існаваньне, прабуе актыўна супроцьпаставіць сябе савецкай уладзе і наступаючаму сацыялізму.

Клясавы вораг прабуе таксама скарыстаць супроць наступаючага сацыялізму зброю нацыяналізму — выпрабаваную зброю эксплёатацыі і дзікага цкаваньня, рабства і прыгнечаньня, зброю, якой буржуазія і абшарнікі карысталіся на працягу многіх стагодзьдзяў і якой на сёньняшні дзень карыстаюцца ўсе сацыял-нацыянал-шавіністы ў капіталістычных краінах у іх барацьбе супроць рэвалюцыйнага руху пралетарыяту і працоўных у краінах капіталу і калёніях. У нашай краіне шавінізм служыць сьцягам клясавых ворагаў, сьцягам усіх тых, хто дапамагае замежным імпэрыялістычным інтэрвэнтам. На XVI партзьезьдзе тав. Сталін указаў, што малюнак ухілаў быў-бы няпоўным, калі ня быў-бы адзначан шавіністычны ухіл. «Паўзучыя ухілы» зьяўляюцца аднаго і таго-ж характару, што і правы і «левы» апартунізм, яны зьяўляюцца агентурай кулака, клясавага ворага, яны імкнуцца прарваць фронт сацыялістычнага будаўніцтва і стварыць тэрмін магчымасьці для буржуазнай рэстаўрацыі, асабліва палітычную згуртаванасьць працоўных мас і даць імпэрыялізму магчымасьць працягнуць сваю руку на сацыялістычную бацькаўшчыну — на СССР.

Гаворачы на XVI партзьезьдзе аб нашых ... ў яўрэйскай рабоце некаторых органаў і арганізацый у БССР у мінулы час. Яшчэ больш. Тады, калі было ўстаноўлена, што праграмы яўрэйскай сэкцыі Пэдфаку пры БДУ, выпрацаваныя пры актыўным удзеле Сосіса (ён быў некаторы час загадчыкам яўсэкцыі), праскінуты ня толькі яўрэйскім нацыяналізмам, але апалёгіяй яўрэйскай старажытнасьці і вострай гэбраіскай тэлдэцыяй, Сосіс не знайшоў нават патрэбным дапамагчы партыі змагацца з гэтай устаноўкай, даць самакрытыку гэтай сваёй дзейнасьці.

Яўрэйскі нацдэмакратызм—гэта родны брат нацдэмакратызму іншых нацыянальнасьцяй. Важна падкрэсьліць невыпадковасьць таго, што Сосіс ня толькі не дапамагаў барацьбе партыі супроць беларускага контр-рэвалюцыйнага нацдэмакратызму, але фактычна з ім салідарызаваўся. Такім чынам, Сосіс паказаў клясычны прыклад кансалідацыі нацдэмакратычных сіл усіх нацый супроць партыі. Вельмі характэрна, што на выразнае пытаньне кантрольнай камісіі ў Сосіса, чаму ён ня вёў барацьбы супроць беларускага нацдэмакратызму, ён адказаў: «Я ня мог весьці гэтай барацьбы, бо мне нешнаёма беларуская культура». Гэтыя разважаньні наконт адчужанасьці ад беларускай пралетарскай культуры, мы чулі ад многіх вялікарасійскіх і яўрэйскіх шавіністаў і нацдэмакратаў. Сосіс гэтым давёў, што ён стаіць з імі ў адным радзе. Ён гэтым давёў, што выключыў сябе з барацьбы, якую вядзе партыя супроць шавінізмаў па ўсім фронце. І таму плядзіва, што ў момант вострага змаганьня супроць беларускага нацдэмакратызму, Сосіс падаў брацкую руку Маруку ў часе яго нацдэмакратычнай вылазкі. Сосіс ажыць цявіў гэтым адзіны фронт з беларускім нацыянал-дэмакратызмам.

Зусім невыпадкова і тое, што Сосіс ня прымаў удзелу ў партыйным і грамадзкім жыцьці і што уся яго праца ня была падпарадкавана актуальным задачам сацыялістычнага будаўніцтва. Нават тады, калі ён, пад нацыскам пралетарскай грамадзкасьці, зрабіў першую спробу выступіць супроць яўрэйскай буржуазна-фашысцкай навукі, за мяжой, супроць белых эмігрантаў і вучоных з яўрэйскага Навуковага Інстытуту ў Вільні, Сосіс ня мог сабе дазволіць паказаць сапраўдную партыйную фізіяномію гэтых «вучоных» і лічыў сваім абавязкам сьпявань дыфірамбы пану Шыпэру — члену ЦК сіяністу, якія зьяўляюцца агентурай ангельскага імпэрыялізму.

З гэтым ... курсе аб гісторыі яўрэйскага рабочага руху. Для Сосіса гэта ня ёсьць гісторыя росту бальшавіцкага ... руху яўрэйскіх рабочых мас, які ... шоў супроць волі яўрэйскіх шавіністычных і сацыял-шавіністычных арганізацый і контрэвалюцыйна-буржуазных партый. Не, для Сосіса яўрэйскі рэвалюцыйны рабочы рух роўны бундаўскаму руху, для яго бундаўскі рух — гэта рух яўрэйскіх рэвалюцыйных мас. Гэту песеньку мы ... раз чулі ад тых, якія ідэалізуюць Бунд і замяняюць ім бальшавізм. Недарма Сосіс ігнараваў Леніна ў яго працы па яўрэйскім рабочым руху, абмінаючы такім чынам крытыку дробна-буржуазнага, нацыяналістычнага і контрэвалюцыйнага характару Бунду.

Стоячы на нацыянал-дэмакратычных пазыцыях, маючы за сабой доўгія гады бундаўскай практыкі, маючы за сабой практыку супрацоўніцтва ў буржуазных выданьнях, скарыстоўваючы струвіцкі «аб'ектыўны» мэтад, Сосіс праводзіў нацыянал - дэмакратычны бундаўскі меншавіцкі погляд у пытаньнях гісторыі рэвалюцыйнага руху сярод яўрэйскіх рабочых. Гэтым Сосіс праводзіў работу нашага клясавага ворага, гэтым ён праводзіў работу шкодніка на ідэалёгічным фронце. Таму ён ня можа мець месца ў радах камуністычнай партыі. Тэорыя Сосіса і ўсіх яго вучняў павінна быць выкрыта перад масамі.

Справа з Сосісам паказвае нам тамма, наколькі правільна ўстаноўка партыі аб партыйнасьці ў навуцы. Нема навукі, якая была-б над палітыкай, нема навукі, якая была-б на-за або над клясамі. Навука зьяўляецца зброяй клясавай барацьбы і вучоны служыць інтарэсам тэй ці іншай класе. Сосіс служыў інтарэсам клясавага ворага пралетарыяту. Таму ён і пастаўлен на-за межы камуністычнай партыі.

Для рабочых і працоўных ясна, што барацьба супроць шавіністаў выкрывае Сосіса зьнішчае перашкоды для далейшых высокіх тэмпаў яўрэйскага культурнага будаўніцтва, якое зьяўляецца сацыялістычным па зьмесьце і нацыянальным па форме. Сосісы-ы хацелі нацыянальную форму запоўніць буржуазна-нацыяналістычным зьместам. Барацьба супроць іх павінна быць ... мальна разгорнута. Толькі ... супроць шавіністаў ... будаўніцтва і культуры ... супроць апартунізму усіх відаў мы здолем да далейшых посьпехаў у ажыцьцяўленьні ленінскай нацпалітыкі.

Пастановы зьезду—у практыку баявых работ

Заключная прамова т. ЧАРВЯКОВА на X зьезьдзе саветаў

X Усебеларускі зьезд саветаў увойдзіць у гісторыю, як першы зьезд пэрыяду ... якога зьявілася мабілізацыя сіл рабочае клясы і ўсіх працоўных пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі на завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі савецкай краіны.

Усе пытаньні парадку дня зьезду разглядаліся з пункту погляду вырашэньня гэтай асноўнай задачы. Зьезд адзначыў, што палітычная лінія ўрэду цалкам адпавядае генэральнай лініі партыі.

Зьезд ухваліў практычную дзейнасьць ураду Беларусі. Гэта значыць, што рабочая кляса і найшырэйшыя масы працоўных Савецкай Беларусі прызналі здавальняючай усю тую вялізарнейшую работу саветаў Беларусі, якая была накіравана на разгортваньне індустрыялізацыі краіны, на сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі і ліквідацыю на базе суцэльнай калектывізацыі кулацтва як класы, на разгортваньне задач культурнай рэвалюцыі, на правядзеньне мерапрыемстваў па паляпшэньні дабрабыту рабочае клясы і ўсіх працоўных.

Яркімі сьведкамі дасягненьняў Савецкай Беларусі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва за мінулы час зьявіліся тыя прывітаньні рабочых ад фабрык і заводаў, саўгасаў, калгасаў, гд культурных устаноў, што былі заслуханы за час работы зьезду. Амаль у кожным з гэтых прывітаньняў гаварылася аб новых фабрыках і заводах, саўгасах, калгасах, навучальных установах, што пабудаваны ў Савецкай Беларусі за апошнія гады.

Трэба яшчэ і яшчэ раз падкрэсьліць, што ўсе гэтыя дасягненьні зьявіліся вынікам вялікага ўздыму энтузіязму з боку рабочае клясы і ўсіх працоўных БССР.

Асноўнай фігурай у сацыялістычным будаўніцтве зараз зьяўляецца ўдарнік на фабрыцы, заводзе, калгасе. Паказваючы сапраўды камуністычныя адносіны да працы, ударныя брыгады ўзьнімаюць самыя шырокія масы працоўных на барацьбу за ўзьняцьце прадукцыйнасьці працы, за паляпшэньне якасьці, на ўдарнае перамаганьне труднасьцей, што сустракаюцца на шляху сацыялістычнага будаўніцтва.

Аб гэтай асаблівасьці сучаснага пэрыяду выразна сьведчыць таксама склад X Усебеларускага зьезду саветаў, дэлегатамі якога ў большасьці зьяўляюцца ўдарнікі фабрык, заводаў, калгасаў.

Вялізарнае гістарычнае значэньне маюць пастановы зьезду саветаў аб далейшых задачах БССР у справе сацыялістычнага будаўніцтва. Гэтыя пастановы яшчэ раз падкрэсьліваюць, што работа саветаў і савецкага ўраду павінна праходзіць на аснове бязупыннай барацьбы за генэральную лінію партыі, супроць правага і «левага» апартунізму, на падставе выкананьня тэй разгорнутай праграмы сацыялістычнага будаўніцтва, што вызначана XVI зьездам УсеКП(б) і XIII зьездам КП(б)Б.

Важнейшымі задачамі гэтай праграмы зьяўляюцца:

Выкананьне і перавыкананьне плянаў будаўніцтва сацыялістычнай прамысловасьці, колькаснае і асабліва якаснае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Другая задача заключаецца ў бязупыннай барацьбе за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, за суцэльную калектывізацыю і на гэтай аснове ліквідацыю кулацтва як клясы.

Той магутны рух у калгасы, які назіраецца ў нашай вёсцы з боку бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, даў магчымасьць паставіць задачу ўцягненьня ў калгасы за час веснавой сяўбы каля 30 проц. усіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Важнейшым вучасткам нашай работы зьяўляецца справа культурнага будаўніцтва. Пасьпяховае скончэньне мерапрыемстваў па ўсеагульным навучаньні дзяцей школьнага ўзросту, паліквідацыя школы, ліквідацыя няпісьменнасьці сярод дарослых, падбор і выхаваньне кадраў ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва, шырокае разгортваньне навукі і літаратуры, мастацтва, вы... сацыялістычнага будаўніцтва, узятае павінна садзейнічаць магутнаму ўздыму будаўніцтва і культуры нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце.

ТРЭБА, КАБ КОЖНЫ ПРАЦОЎНЫ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ ЦЬВЁРДА ЎЯВІЎ САБЕ ЎСЮ ВАЖНАСЬЦЬ І АДКАЗНАСЬЦЬ ГЭТЫХ ЗАДАЧ І НАПРУЖВАЎ УСЕ СВАЕ СІЛЫ ДЛЯ ІХ ВЫКАНАНЬНЯ.

Барацьба сацыялістычнага ладу з рэшткамі капіталізму ў нашай краіне на даным этапе набыла надзвычайную вострасьць. Чым больш разгортваецца сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце, тым з большай жорсткасьцю адбываюцца супраціўленьні аджываючых клясаў. Гэта клясавая барацьба адбываецца на кожным вучастку сацыялістычнага будаўніцтва, у кожным зьвяне нашай работы. Клясавы вораг імкнецца затрымаць бязупынны пераможны ход сацыялістычнага будаўніцтва, імкнецца выкарыстаць кожны выпадак для сваіх контр-рэвалюцыйных мэт. Гэта вымагае ад усіх нас асаблівай клясавай пільнасьці, пралетарскай загартаванасьці, бальшавіцкай самаддадасьці.

Труднасьці, што сустракаюцца на нашым шляху, зьяўляюцца труднасьцямі росту. Для таго, каб хутчэй перамагчы гэтыя труднасьці, мы павінны ня толькі ня спыняць узятых намі тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, але наадварот, яшчэ больш іх разгортваць, УЗЬНІМАЦЬ НА ВЫШЭЙШУЮ СТУПЕНЬ. Усякаму імкненьню клясавых ворагаў выкарыстаць труднасьці нашага будаўніцтва для сваіх контр-рэвалюцыйных мэт мы і далей будзем даваць зьнішчальны адпор.

Асаблівасьцю сучаснага пэрыяду зьяўляецца тое, што абвастрэньне клясавай барацьбы выключае магчымасьць прыкрывацца нэйтральнасьцю. Сёньня барацьба за сацыялізм патрабуе ад кожнага асаблівага выразнага адказу: з кім ён ідзе, на якім баку барыкады ён знаходзіцца? Гэта мы ярка бачым на прыкладзе тэй інтэлігенцкай праслойкі, у дачыненьні да якой выявілася, што за пазыцыяй «нэйтральнасьці» таіліся іх дапамога імпэрыялістычным інтэрвэнтам у барацьбе супроць улады Саветаў. Гэта таксама добра відаць і на прыкладзе групы беларускіх контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў, якія зьяўляюцца агентамі польскага фашызму ў падрыхтоўцы да інтэрвэнцыі супроць Савецкай Беларусі.

У выніку пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва база савецкай улады ўсё больш пашыраецца як у горадзе, так і ў вёсцы. Асноўныя масы працоўнай інтэлігенцыі шчыльна зьвязалі свой лёс з лёсам рабочае клясы, яны ідуць пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі за перамогу сацыялізму. Асноўная маса працоўнай інтэлігенцыі ў выглядзе настаўніцтва, на якую ў першую чаргу разьлічвалі нацдэмы, верна дынтатуры пралетарыяту і разам з рабочай клясай вядзе барацьбу супроць усіх ворагаў, за перамогу сацыялізму. Гэта дало падставы партыі і ўраду Беларусі ЎЗНАГАРОДЗІЦЬ НАСТАЎНІЦТВА БССР ОРДЭНАМ ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЬЦЯГУ.

Мы маем права выказаць упэўненасьць у тым, што іншыя праслойкі працоўнай інтэлігенцыі Савецкай Беларусі ў сваёй масе таксама зьяўляюцца вернымі справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Самае важнае ў нашай далейшай рабоце заключаецца ў тым, каб кожны біўся за хутчэйшае і поўнае выкананьне пастаўленых партыяй задач. Праверка выкананьня на кожным кроку—вось зарука пасьпяховага руху наперад. Кожную справу, якую даручае нам партыя і ўлада, вывучаць дасканала для таго, каб умець сапраўды кіраваць гэтай справай. Тав. Сталін наказваў кіраўніком прамысловых прадпрыемстваў, каб яны аўладалі тэхнікай для таго, каб быць сапраўднымі чырвонымі дырэктарамі. Мы павінны гэту важнейшую дырэктыву тав. Сталіна пашырыць на ўсе галіны нашага будаўніцтва.

Асаблівая важная роля ... сацыялістычнага будаўніцтва адыгрываюць сельсаветы і райвыканкомы. У сувязі з ліквідацыяй акруг раённыя зьвяньні савецкай сыстэмы зьяўляюцца апорнымі пунктамі кіраўніцтва. Гэта патрабуе ад нас узмацненьня кіраўніцтва работай сельсаветаў і райвыканкомаў.

X Усебеларускі зьезд саветаў ужо вынес пастанову аб разгортваньні ўдарнай работы па выкананьні плянаў загатовак і мабілізацыі грашовых рэсурсаў. Значэньне гэтых задач выразна відаць з таго, што зьезд 25 проц. свайго складу мабілізаваў для непасрэднай работы ў гэтай галіне. НА ВЫКАНАНЬНЕ ГЭТЫХ ЗАДАЧ МЫ ПАВІННЫ МАБІЛІЗАВАЦЬ УСЕ НАШЫ СІЛЫ.

ЦК партыі і Савет Народных Камісараў ускладаюць на мясцовыя партыйныя арганізацыі і выканкомы такую задачу, каб за сваячасовае выкананьне пастановы ЦК і СНК па транспарце, як за выкананьне важнейшых палітычных кампаній: збожжазагатоўкі, веснавая сяўба, прамфінплян і г. д. Пытаньню работы транспарту трэба аддаць больш увагі тэму, што разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва нашай краіны цесна зьвязана са станоўішчам транспарту.

Важнейшай задачай, якая стаіць перад намі, зьяўляецца пасьпяховае правядзеньне другой бальшавіцкай вясны. X Усебеларускі зьезд саветаў устанавіў перахсдны сьцяг для ўзнагарэды лепшага раёну па выкананьні задач другой бальшавіцкай вясны і калектывізацыі.

Мне хочацца выказаць упэўненасьць у тым, што гэта пастанова зьезду будзе спрыяць шырокаму разгортваньню сацыялістычнага спаборніцтва паміж раёнамі, сельсаветамі, калгасамі, саўгасамі і вёскамі для лепшага правядзеньня веснавой сяўбы.

У часе работы зьезду мы заслухалі цэлы рад выступленьняў пасаобных рабочых, калгасаў, якія абвясьцілі сябе ўдарнікамі у гонар X Усебеларускага зьезду саветаў.

Вось, таварышы, адна з такіх заяў ад былога дамандзіра—арганізатара чырвонага партызанскага атраду Цэвана, Ціхана Сільвестравіча:

«У ДНІ ЗАВАЯВАНЬНЯЎ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ Я ПРЫМАЎ ВЯЛІКІ ЎДЗЕЛ У БАРАЦЬБЕ З БЕЛАГВАРДЗЕЙЦАМІ. Я ВЁЎ БАРАЦЬБУ РАЗАМ З ВЯЛІКІМІ МАСАМІ БЕДНЯКОЎ І БАТРАКОЎ. НАМ УДАЛОСЯ ЗАВАЯВАЦЬ УЛАДУ САВЕТАЎ. МЫ НЯСЕМ НАЗВУ ЧЫРВОНЫХ ПАРТЫЗАН. У СУЧАСНЫ МОМАНТ, ПРЫ ВЫКАНАНЬНІ ПЯЦІГОДКІ ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ У САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПЕРАБУДОВЕ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ ПРАЗ САЎГАСЫ І КАЛГАСЫ, Я ТАКСАМА АБВЯШЧАЮ СЯБЕ ЎДАРНІКАМ У ГЭТАЙ БАРАЦЬБЕ, ДАЮ ЎРАЧЫСТАЕ АБЯЦАНЬЕ, ШТО БУДУ ТАКСАМА ЦЬВЁРДА І НАСТОЙЛІВА ВЕСЬЦІ БАРАЦЬБУ ЗА ПАБУДОВУ КАЛГАСАЎ, САЎГАСАЎ НА ВЁСЦЫ, УЦЯГВАЮЧЫ БАТРАКОЎ, БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ У КАЛГАСЫ, А ТАКСАМА БУДУ ЎДАРНІКАМ У БАРАЦЬБЕ З КУЛАЦТВАМ».

Мне думаецца, таварышы, што X Усебеларускі зьезд саветаў у адказ на гэтыя жаданьні, у адказ на гэтыя патрабаваньні з боку працоўных Савецкай Беларусі павінен АБВЯСЬЦІЦЬ СЯБЕ ЎДАРНЫМ. Дэлегаты зьезду саветаў, разьехаўшыся на месцы, павінны ўжыць усе крокі для таго, каб мабілізаваць шырокія масы працоўных на пасьпяховае выкананьне задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі, на пасьпяховае выкананьне задачы завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў нашай краіне.

Пад кіраўніцтвам слаўнай камуністычнай партыі мы павінны дабіцца таго, каб VI Усесаюзнаму зьезду саветаў рапартаваць:

— САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ЎДАРНАЙ РЭСПУБЛІКАЙ САВЕТАЎ НА ВАЖНЕЙШЫМ ВУЧАСТКУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА.

Пастанова прэзыдыуму Менскай гарКК КП(б)Б

ад 3/II 1931 г.

па справе Сосіса І. Д.

Сосіс, Ізраіль Давідаў, год нараджэньня 1878. Член КП(б)Б з мая 1921 г., яўрэй, па сацыяльным паходжэньні—бацькі буйныя гандляры, па сацыяльным становішчы—служачы. Асьвета вышэйшая (скончыў у даваенны час унівэрсытэт, прафэсар БДУ па катэдры гісторыі яўрэйскага рабочага руху. У старой, белай і Чырвонай арміях ня служыў. У іншых партыях быў—у Бундзе 11 год (з 1902-1908 і з 1917-1921 г. г.).

За час знаходжаньня ў КП(б)Б займаў пасады: загадчыка яўрэйскага аддзяленьня Ленінградзкага аддзелу Наркамнаца, настаўніка яўрэйскага педагагічнага інстытуту ў Ленінградзе і выкладчыка ў рабфаку.

Абвінавачваецца ў тым, што:

1. Працуючы на адказнай навуковай рабоце ў яўрэйскім сэктары Беларускай Акадэміі Навук і яўрэйскай сэкцыі пэдфаку БДУ, Сосіс сыстэматычна праводзіў у сваёй працы на пытаньнях яўрэйскай гісторыяграфіі і гісторыі яўрэйскага рабочага руху апортпартыйную лінію, лінію яўрэйскага шавінізму, нацыянал-дэмакратызму. Валяючы марксізм-ленінізм Сосіс у сваёй працы падмяняў буржуазным Струвісцкім «аб'ектывізмам» і меншавіцка-бундаўскімі поглядамі. Замест ускрыцьця клясавых карэньняў гістарычнага працэсу, Сосіс, як яўрэйскі шавініст, нацыянал-апартуніст, базаваў свае погляды на яўрэйскую гісторыю па тэорыі «нацыянальна-адзінага народу», змазваючы клясавыя супярэчнасьці ўнутры нацыі.

Ідэалізуючы ў сваіх навуковых творах яўрэйскі патрыярхальны быт, змазваючы ў гэтых творах контр-рэвалюцыйны характар сіяністу, Сосіс не падпарадкаваў свае работы задачам сучаснасьці—задачам клясавай барацьбы і сацыялістычнага будаўніцтва.

2. У сваёй практычнай дзейнасьці па катэдры гісторыі яўрэйскага рабочага руху ў БДУ Сосіс ігнараваў адпаведныя ленінскія мазар'ялы, радчы студэнтам у якасьці падручніка навытрыманую з пункту гледжаньня ленінізму кнігу Рафэса «Нарысы па гісторыі Бунду».

Яўна ідэалізуючы гісторыю меншавіцкага Бунду, Сосіс утойваў сацыял-фашысцкі характар Бунду ў сучаснасьці і зьвязваўся з сваёй дзейнасьці з буржуазнымі навуковымі коламі за мяжой.

3. Ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы пры актывізацыі пяліка-буржуазнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, і шавінізму беларускага, яўрэйскага і інш. колераў, Сосіс, прытрымліваючыся тэорыі нацыянальнага адзінства і нацыянальнай абмежаванасьці ў сваёй яўрэйска-шавіністычнай і антыпартыйнай пазыцыі, адначасова змазваўся з беларускім нацыянал-дэмакратызмам (Маруком і інш.), адмаўляючыся ад якой-бы там ні было барацьбы з контр-рэвалюцыйнымі беларускімі нацдэмамі, як-бы з-за пяведаньня гісторыі беларускай культуры (з выступленьня Сосіса на пасяджэньні Мен. гарКК).

4. Гэтыя свае нацыяналістычныя і антыпартыйныя погляды Сосіс упарта адстойваў, ня гледзячы на крытыку ў друку яго поглядаў («Зьвязда», «Акцябр» і «Штэрн»), ня гледзячы на ... станоўі таварыства гісторыкаў - марксыстаў і на напярэджаньне з боку партыйных органаў (у часе чысткі).

Гэта поўнасьцю пацьвярджае тое, што Сосіс зьяўляецца непапраўным і сьвядомым праваднікам яўрэйскай нацыянал-дэмакратычнай лініі і што, увайшоўшы ў камуністычную партыю, Сосіс не парваў са сваім нацыяналістычным, меншавіцка-бундаўскім мінулым.

Выходзячы з гэтага, прэзыдыум Менскай гарКК пастанаўляе:

1. Сосіса І. Д., як яўрэйскага шавініста, нацыянал-апартуніста, праводзячага нацыянал-дэмакратычную, антыпартыйную лінію ў сваёй навуковай і грамадзкай рабоце,—з радоў КП(б)Б выключыць.

2. Бюро партыйнага калектыву пэдфаку БДУ за прыярэнчыя адносіны да нацыянал-апартуністычнай дзейнасьці Сосіса абвясьціць вымову.

Прапанаваць парткалектыву мабілізаваць грамадзкую думку студэнтаў пэдфаку, у прыватнасьці студэнтаў яўрэйскай сэкцыі пэдфаку, супроць яўрэйскай шавіністычнай дзейнасьці Сосіса, выкрываючы перад ус

УДАРНА ПРАВЕСЬЦІ МЕСЯЧНІК БАЛЬШАВІЦКІХ КАМПАНІЙ

ПЕРШЫЯ ДНІ

не даюць патрэбнага пералому

Рашуча зламаць сабатаж кулака, які ня выконвае цьвёрдага заданьня, бязьлітасна біць па праваапартуністычнай практыцы ў загатоўках

Забясьпечыць поўнае выкананьне плянаў

УСІМ РАЙКОМАМ КП(б)Б, УСІМ РВК, КОПІЯ УПАЎНАВАЖАНЫМ СНК І ЦК.

Абвешчаны X-ым зьездам саветаў матычнік ліквідацыі прарываў у загатоўках павінен забясьпечыць поўнае выкананьне плянаў загатовак хлеба, ільну, нянькі, ільняного семя, мяса. Асабліва адстаем ад усіх раёнаў Саюзу па загатоўцы хлеба, ільну і нянькі. Незадкладна забясьпечце ўключэньне ў месячнік усіх актыўных сіл раёну, забілізаваных у сяло, шырока прыцягвайце калгаснікаў і беднату па незадкладнае выяўленьне ўсіх кулацка-заможных гаспадарак, для дачы цьвёрдых заданьняў з разьліку ахопу 5-7 проц. гаспадарак раёну, з удзелам гэтых заданьняў у агульным плане раёну на 12-15 проц. Правядзеце паціск па невыконваючых у тэрмін цьвёрдых заданьняў, скарыстоўвайце штрафы, суды, незадкладнае забіраньне ільну. Таксама праверце кантрактацыю, адзначы пад суд злосных нядатчыкаў. Забясьпечце меры грамадзкае ўзьдзейнасьці па выкананьні плянаў у парадку самаабавязацельства, разгарнуўшы спаборніцтва паасобных гаспадарак, вёсак, сельсаветаў. Праверце работу сельсаветаў і загатоўшчыкаў, прыцягваючы да суда тых, хто бязьдзейнічае ў барацьбе з кулаком за лён. На працягу месячніка капчайце ў калгасах апрацоўку трэсты. Таксама правядзеце расьціл саломы, згодна паказаньня Наркамзему, прыцягваючы да адказнасьці кіраўнікоў калгасаў, дапусьціўшых разбазарваньне ільну замест здачы дзяржаве. Скарыстоўвайце мэтад аходу дваро ў і вядзеньне загатовак на месцы поўным разрахункам грашыма і прэміраваньнем. Забясьпечце сваячасовую прысылку зводак і інфармацый.

Сакратар ЦК ГЕЙ.
Старшыня СНК ГАЛАДЗЕД.

Забыты дагавор

Апартуністы райкалгассаюзаў і аддзяленьняў Белмяса зрываюць загатоўку адкормленых сьвіней

ПАМІЖ ПРАЎЛЕНЬНЕМ САЮЗМЯСА І КАЛГАСЦЭНТРАМ СССР ЗАКЛЮЧАНА ГЕНЭРАЛЬНАЯ ЗГОДА НА ЗДАЧУ КАЛГАСАМІ У 1931 Г. З АБАГУЛЬНАГА СТАДА І З ПАЛМЫ АДКОРМЛЕНЫХ СЬВІНЕЙ ДЛЯ МЯСАЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ. У АДПАВЕДНАСЬЦІ З ГЭТАЙ ЗГОДАЙ БЕЛМЯСА ЗАКЛЮЧЫЛА ДАГАВОР З КАЛГАСЦЭНТРАМ БССР НА ЗДАЧУ **147 ТЫС. АДКОРМЛЕНЫХ СЬВІНЕЙ КАЛГАСАМІ БЕЛАРУСІ.** СА СВАЙГО БОКУ БЕЛМЯСА АБАВЯЗАЛАСЯ ЗДАЦЬ КАЛГАСАМ 18.700 ШТУК СЬВІНАМАТАК. АСОБНЫЯ КАЛГАСЫ ПАВІННЫ БЫЛІ ЗАКЛОЧЫЦЬ ДАГАВАРЫ З РАЙАДДЗЯЛЕНЬНЯМІ БЕЛМЯСА. УСЮ РАБОТУ ПА АФАРМЛЕНЬНІ ДАГАВАРОЎ АБАВЯЗАЛАСЯ ПРАВЕСЬЦІ СЫСТЭМА КАЛГАСЦЭНТРУ.

ХАЦЯ ТЭРМІН ДА ЗАКЛОЧЭНЬНЯ ГЭТЫХ ДАГАВАРОЎ СКОНЧЫЎСЯ **15 ЛЮТАГА**, А ЗА ПЕРШЫ КВАРТАЛ СТУДЗЕНЬ-САКАВІК БЕЛМЯСА ПАВІННА БЫЛО АТРЫМАЦЬ АД КАЛГАСАЎ **20 ТЫС. АДКОРМЛЕНЫХ** сёнь[illegible] КАЛГАССАЮЗЫ ДА ГЭТ[illegible] **ЯШЧЭ НЕ ПРЫ**[illegible] **ЛЕНЬНЯ ДАГА**[illegible] ПА ТАВОРАЧЫЯ УЖО АД ІХ ВЫКАНАНЬНІ. ВАКОЛ ГЭТАГА ВАЖНЕЙШАГА ГАСПАДАРЧА-ПАЛІТЫЧНАГА ПЫТАНЬНЯ НЕ МАБІЛІЗАВАЦА ГРАМАДЗКАЯ ЎВАГА КАЛГАСЬНІКАЎ, НЕ РАЗГОРНУТА САЦСПАБОРНІЦТВА НА ВЫКАНАНЬНЕ ДАГАВАРОЎ ПАМІЖ АСОБНЫМІ КАЛГАСАМІ І НА ЗДАЧУ СЬВІНЕЙ ЛЕПШАЙ АДКОРМЛЕНАСЬЦІ.

РАЙКАЛГАССАЮЗЫ І АДДЗЯЛЕНЬНІ БЕЛМЯСА НАВАТ НЕ ІНФАРМАВАЛІ ПА ГЭТЫМ ПЫТАНЬНІ ПАРТЫЙНА-САВЕЦКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ РАЁНАЎ І НЯ ВЫКАРЫСТАЛІ МЯСОВЫХ ГРАМАДЗКІХ АРГАНІЗАЦЫЯЎ І ДРУКУ.

ТАКІХ АДНОСІН ДА ВАЖНЕЙШАЙ ПАЛІТЫЧНА - ГАСПАДАРЧАЙ СПРАВЫ ДАЛЕЙ НЕЛЬГА ЦЯРПЕЦЬ. **У БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ ТРЭБА ДАБІЦЦА КАРЭННАГА ПЕРАЛОМУ Ў ГЭТАЙ СПРАВЕ.** ПАРТЫЙНЫЯ І САВЕЦКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ НА МЯСЦОХ, ДРУК ПАВІННЫ ЎЗЯЦЬ ПАД АСОБНЫ НАГЛЯД ДАКЛАДНАЕ **ВЫКАНАНЬНЕ ГЭТАГА ДАГАВОРУ.** ТРЭБА РАШУЧА ЎДАРЫЦЬ ПА АПАРТУНІСТЫЧНАЙ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦІ І САМАЦЕКУ.

І. К.

Зусім слабыя тэмпы

КАПЫЛЬ. На 20-га лютага загатоўка ільнянога валакна ўсяго 12.1 проц. плану, кудзелі—6,0 проц.

Калгасы замест 237 цэнтнераў здалі ўсяго 22. Рад калгасаў правялі значную безгаспадарчасьць у адносінах апрацоўкі ільну. Калгас «Чырвоны Кастрычнік» абмалочаны лён аддаваў на подсьціл жывёле. Такое-ж становішча ў калгасе «Цімкавічы» і інш.

Там дзе былі арганізаваны чырвоныя абозы (в. Углы, Мазалі, Валешына і інш.), беднякі і сераднякі ахвотна здавалі лён.

Бюро РК КП(б)В, абмеркаваўшы на апошнім пасяджэньні становішча загатовак, канстатавала слабыя тэмпы выкананьня плянаў і зноў пакіравала рад работнікаў у сельсаветы для ўдзелу ў месячніку ліквідацыі прарываў.

Брыгада «Зьвязды»
КЛЮЙКО і ФРЫД.

Зруху няма, зрух павінен быць рашучы

На працягу месячніка ільнаканапляводчая кампэрыацыя павінна поўнасьцю ліквідаваць прарывы

Абвешчаны X-ым зьездам саветаў БССР з 25 лютага па 25 сакавіка месячнік па ліквідацыі прарываў у загатоўках павінен рашуча ўзварушыць сыстэму ільнаканапляводчай кампэрацыі на ліквідацыю дапушчаных ёю прарываў.

Становішча загатовак па лініі ільнаканапляводчай кампэрацыі паказвае ганебныя тэмпы ў ліквідацыі прарываў. Так, гадавы план па ільназагатоўках на 15 лютага выкананы ўсяго на 31 проц. па ільняным семі—на 50 проц., па насеньні канапель—на 39 проц., па сене—52,5 проц., па пяньцы—5 проц. і па бульбе—на 60 проц.

Ня лепшая справа і са зборам закантрактаванай прадукцыі. Па ільняным семі сабрана 70 проц., па ільнавалакне—62 проц. і па канопляхпх—усяго 33,5 проц., закантрактаваная пянька амаль зусім ня зьбіралася.

У галіне мабілізацыі сродкаў насельніцтва ёсьць яшчэ больш значныя прарывы. Студзеньскі плян па зборы паявых і ўступных капіталаў выкананы ўсяго на 2,8 проц., а па зборы спэцыяльных непадзельных капіталаў на 3.5 проц.

Побач з такімі ганебнымі тэмпамі па мабілізацыі сродкаў насельніцтва на складах райкаапсаюзаў штсмесячна павялічваюцца таварныя запасы (машыны, угнаеньне і інш.). Да 1-га лютага запас тавараў на складах райкаапсаюзу выяўляўся ў суме 3 міл. рублёў, што зусім параліжавала фінансавае становішча райкаапсаюзу.

Неабходна ўзмацніць збор сродкаў насельніцтва і пайшчыкаў у відзе зборaў уступных, паявых і спэцыяльных капіталаў. На працягу ўдарнага месяца трэба поўнасьцю ліквідаваць запазычанасьць па адкрытых рахунках, сабраць усе пратэрмінаваныя плацяжы, рэалізаваць таварныя запасы, якія вызначаны да весьнавой пасеўнай кампаніі і бягучыя таварныя запасы зьменшыць мінімум на 25 проц.

Праводзячы гэту асноўную работу на працягу ўдарнага месячніка, ні ў якім разе не павінна быць аслаблена ўвага да пытаньняў веснавой пасеўнай кампаніі, асабліва да пытаньняў пасеву тэхнічных культур—ільну і канапель.

Ажыцьцяўленьне павялічанага пляну засеву тэхнічных культур бязумоўна сустрэне жорсткае супраціўленьне з боку кулацтва. Для пасьпяховага адпору кулацтву, для поўнага выкананьня пляну павінна быць зьвернута асаблівая ўвага на работу сярод беднаты. Павінны быць афармлены групы беднаты пры вытворчых таварыствах і палепшана работа ўжо існуючых груп. Групы беднаты, уся бедната ў цэлым павінна быць прыцягнута для практычнай работы па ліквідацыі прарываў, для рашучага адпору кулацтва.

Кантрактацыя, як адзін з асноўных вагароў плянавага пасеву неабходных культур, павінна знаходзіцца ў цэнтры ўвагі, асабліва ўдарнага месяца, бо да 1-га красавіка, г. зн. да канца ўдарнага месяца, кантрактацыя павінна быць скончана.

Усе ўмовы для пасьпяховага выкананьня пляну пасеву і кантрактацыі тэхнічных культур у нас ёсьць. Насеньнем ільну па лініі мясцовых загатовак і завозу плян поўнасьцю забясьпечан.

Угнаеньня, сельска-гаспадарчых машын і прылад завезена ў гэтым годзе значна больш, чым у мінулым. Грашовых авансаў кантрактантам будзе раздана больш чым на 4 міл. рублёў. Усё гэта поўнасьцю забясьпечвае выкананьне вызначаных плянаў. Патрэбна толькі сапраўдная бальшавіцкая напружанасьць, кантроль і праверка выкананьня на мясцох ходу гэтай кампаніі.

ЛАЦІС.

Цьвёрдыя заданьні не даведзены да кулацкіх гаспадарак

СТАРЫЯ ДАРОГІ, 27. Ільназагатоўкі на раёне праходзяць самацёкам. У Дарагаваўскім сельсавеце цьвёрдыя заданьні не даведзены да кулацкіх гаспадарак. Партыйная і камсамольская арганізацыі бязьдзейнічаюць. На раёне выкананне пляну ільназагатовак усяго на 22,3 проц.

З кулакоў не спагнана ні аднаго кілё ільну

ВУЗДА. За апошні час па раёне дасягнуты некаторы зрух па выкананьні пляну ільназагатовак. На 25-та лютага плян выкананне на 41,9 проц. Гэты зрух тлумачыцца тым, што па раёнах былі арганізаваны выезды крамнікаў і абход бядняцка-серадняцкіх двароў, што здатчыкам давалі прэміі прамтаварамі адразу на мясцох.

Аднак у рабоце загатоўчых арганізацый і сельсаветаў дапушчана апартуністычная бязьдзейнасьць да спагнаньня ільну з кулацка-заможнай часткі вёскі. **За апошні двухдзяднік штурму ад кулацка-заможнай часткі вёскі ні аднаго кілё ільну не спагнана. Ні адна кулацкая гаспадарка за злоснае невыкананьне заданьняў ня прыцягваецца да судовай адказнасьці.**

Зусім слаба паступае лён ад калгасаў. Райкалгассаюз [illegible] ад[illegible] [illegible] кампаніі. Асабліва нядобайныя адносіны паглядзюцца з боку Расьнянскага і Магільнянскага сельсаветаў.

Партыйныя і савецкія арганізацыі Вузьдзенскага раёну павінны яшчэ больш узьняць тэмпы загатовак, з тым, каб ва ўдарным месячніку палкам выкапаць плян загатовак.

Брыгада «Зьвязды».

Учора пачаўся месячнік праверкі шэфства рабочых над савецкім апаратам

Шэфства—на вышыню задач перабудовы апарату

Пастанова прэзыдыуму ЦСПСБ

1. Прэзыдыум ЦСПСБ адзначае, што падшэфная установе, згодна з пастановы XVI зьезду партыі, ЦК і ЦКК УсеКП(б) ад 15 сакавіка 1930 году аб рабочым шэфстве над дзяржапаратам выконваюцца зусім незадавальняюча. У буйнейшых пралетарскіх цэнтрах (Менск, Віцебск, Гомель) за апошні час шэфства фактычна спынена пасьля чыстцкі савецкага апарату. Зусім адсутнічае шэфства ў Воршы, Бабруйску, Магілеве, Барысаве, Рэчыцы, Мазыры, што прэзыдыум ЦСПСБ разцэньвае, як праяву з боку прафарганізацый гэтым пытаньні грубай палітычнай недаацэнкі шэфства, як складнай з буйнейшых заданьняў у абсяг змаганьня з бюракратызмам, што патрэбна расцэньваць, як праяву правага апартунізму на практыцы.

2. Прэзыдыум лічыць неабходным дабіцца карэннага пералому і катэгарычна прапануе ўсім ЦК саюзаў, гар. і райпрафсаветам і ФЗМК па працягу бліжэйшага часу правесьці на аснове адпаведных пастаноў партыі шырокую растлумачальную работу ў рабочых масах і сярод служачых аб значэньні рабочага шэфства. У мэтах разгортваньня шэфскай работы лічыць неабходным сумесна з ЦКК-РСІ правесьці з 1 сакавіка па 1 красавіка месячнік праверкі і наладжаньня шэфскай работы, даручыўшы яго правядзеньне масаваму сэктару. Лічыць патрэбным правесьці ў Менску, Віцебску, Гомелі шырокія гарадзкія рабочыя канферэнцыі па шэфстве, у астатніх гарадох і прамысловых раёнах — правесьці спэцыяльныя нарады па гэтым пытаньні.

3. Ажыцьцяўленьне гіганцкіх задач сацыялістычнага наступленьня на ўсім фронце патрабуе ад усіх зьвенёваў савецкага, кааперацыйнага, гаспадарчага апарату хуткага пераключэньня на баявыя тэмпы і выразнага правядзеньня дырэктыў партыі.

Таму асноўная задача рабочага шэфства заключаецца ў тым, каб сталым масавым рабочым кантролем, сыстэматычнай праверкай з боку заводаў-шэфаў дабіцца выразнага выкананьня дырэктыў партыі і ўраду савецкім апаратам, вытрываньня ў ім элементаў апартунізму, шкодніцтва і інш. скажэньняў, на аснове ўкарэненьня мэтаду сацспаборніцтва і ўдарніцтва, рашуча выкрываючы праз шэфства ўсякія недаробы зьвяшчы апарату. Гэтага магчыма дасягнуць пры умове штодзеннага азнаямленьня рабочых з практычнай работай, ажыцьцяўленьнем пастановы ідэю т. Леніна аб тым, што мэтай нашай зьяўляецца бескаштоўнае выкананьне дзяржаўных абавязкаў кожным працоўным.

Перавод прадпрыемстваў на 7-мігадзінны працоўны дзень стварае ўсе магчымасьці для рэалізацыі гэтага паказаньня тав. Леніна і перадачы рабочым паасобных функцый дзяржаўнага апарату.

4. Прэзыдыум ЦСПСБ напрыпраўляе ўсе прафарганізацыі аб усёй шкодлівасьці і недапушчальнасьці бюракратычнага навядваньня шэфства зьверху, усякай рэгламентацыі і скоўваньня ініцыятывы рабочых зьнізу ў пытаньнях шэфства. Роля прафсаюзаў павінна заключацца ў тым, каб сумесна з органамі КК-РСІ [illegible] руху, растлумачыць рабочым [illegible] літычны сэнс гэтай справы, накіроўваючы шэфства на арганізацыю праверкі выкананьня пастаноў камісіі па чыстцы савецкіх устаноў, прымацоўваць рабочыя брыгады да паасобных частак падшэфнага апарату для пастаяннай праверкі і нагляду за правільнасьцю яго работы; практыкаваць вылучэньне груп рабочых-выканаўцаў, сіламі шэфскіх брыгад, практыкаваць праверку выкананьня пастаноў партыі, ураду і прафсаюзаў у тых палапшэньня яе работы праз актывы ўдзел шэфскіх брыгад у работе органаў рацыяналізацыі, эканомвараду, рашуча біць па маленькіх правых бюракратычных адносін да работага шэфства, расцэньваючы іх, як сабатаж і супрацўлеўшне справе масавага работага кантролю над дзяржапаратам. Даручыць ЦК саюзаў і райпрафсаветам сыстэматычна правяраць выкананьне гэтай пастановы, абагульваючы вопыт шэфскай работы, паказваючы рабочае шэфства над дзяржапаратам. Шэфства павінна быць разгорнута на ўсіх раёнах, дзе ёсьць фабрыкі і заводы, над паасобнымі зьвенямі савецкага апарату.

6. Для штодзённай арганізацыі і разгортваньня шэфскай работы лічыць неабходным, каб усе ФЗМК вылучылі часта па ФЗМК адказнага за гэту работу, узгадняючы ўсю работу па шэфстве з парт'ячэйкай і органамі КК-РСІ.

Даручыць загалічку сэктару масавай работы — тав. **Плешакову**, сумесна з КК-РСІ прапрацаваць рад пакаўзыўку аб практычным разгортваньні шэфскай работы і правядзеньні месячніка.

Пастанову абвясьціць у друку.

Фармальна „ўсё у парадку" а па сутнасьці...

10 студзеня па нараде прадстаўнікоў фабзаўкомаў пры ЦСПСБ **13 буйнейшых прадпрыемстваў Менску**—заводы «Камунар», імя Варашылава, «Дрэваапрацоўшчык», абутковая фабрыка, «Бальшавік», «Кастрычнік» і інш. **узялі шэфства над апаратам і сыстэмай МЦРК.** Асноўная задача шэфаў — дапамагчы МЦРК «перабудаваць работу ў бок бязумоўнага забясьпячэньня ў першую чаргу важнейшых вучастку, сацыялістычнага будаўніцтва і ўвязкі справы забесьпячэньня з выкананьнем вытворчых плянаў, павышэньнем прадукцыйнасьці працы, барацьбой з цякучасьцю рабочай сілы, з заахвочваньнем сацыялістычных форм арганізацыі працы» (з пастановы аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б).

Да кожнага з шэфаў прымацаван сэктар і прадпрыемства МЦРК, з якім ён павінен працаваць і ўстанавіць пал ім штодзенны рабочы кантроль.

МЦРК з свайго боку павінен трымаць пастаянную сувязь з шэфамі праз кааперацыйныя актыў на прадпрыемствах.

Як-жа выконваюць шэфы ўзятыя на сябе абавязкі?

Ца жаль, **вельмі слаба.**

Да заводаў **«Камунар» і імя Варашылава** прымацаваны два галоўныя сэктары і гаспаладкі МЦРК: да першага—сэктар загатовак і саўгас «Новы шлях», а да другога—будаўнічы сэктар і саўгас Міхайлава. Адпак, **шэфы дагэтуль яшчэ не разгарнулі ніякай работы.**

Эльвод і фабрыка «Кастрычнік» да шэфства адносіліся фармальна. Яны абмежваліся толькі паведамленьнем аб вылучэньні 2-х брыгад і... на гэтым паставілі крыжу. Больш нічога ня зроблена. Брыгады і не прыступалі да работы.

Больш-менш задавальняюча праводзяць работу гарбарня **«Бальшавік»**, якая шэфствуе над сэктарам разьмеркаваньня і саўгасам «Чырвоны транспартнік». Маса рабочых уцягнута ў гэту работу і прымае ў ёй актыўны ўдзел.

Завод **«Ударнік»** і гута **«Пралетары»** прынялі шэфства і вылучылі брыгады, якія прымацаваны да адкормачнага пункту № 2, садова-гародняй базы дастычнай сталоўкі, планавага бюро і дрывянога складу. Работа пакуль што ідзе слаба.

Завод **«Дрэваапрацоўшчык»** прыняў шэфства над хлебазаводам, але **работа дагэтуль яшчэ не наладжана.**

Мендуд зараз-жа пасьля пастановы ЦСПСБ ад 13 студзеня склікаў нараду старшынь рабкомаў, на якой рабкомы ўзялі шэфства і размеркавалі паміж сабой 5 прадпрыемстваў МЦРК. Але да гэтага часу **толькі рабкком № 1** аформіў шэфства над закрытым разьмеркавальнікам № 15, а іншыя рабкомы зусім не працуюць.

АГРАНАЎ.

Аб палітычнай памылцы газэты „Чырвонай Зьмена"

Пастанова бюро ЦК ЛКСМБ ад 28 лютага 1931 г.

1. Адзначыць, што [illegible] правільная палітычная лінія газэты «Чырвоная Зьмена», у прыватнасьці ў пытаньнях асьвятленьня на старонках газэты пытаньняў міжнароднага рэвалюцыйнага руху, «Чырвоная Зьмена» дапусьціла палітычную памылку ў крытычнай заметцы ад 26-II-31 г. аб газэце «Рабочий». На гэту памылку «Чырвонай Зьмены» газэты «Зьвязда» і «Рабочий» ад 27 лютага г. г. далі правільную крытыку.

«Чырвоная Зьмена», крытыкуючы загалоўкі ў газэце «Рабочий» ад 25-II-31 г., няправільна характызавала сучасны міжнародны рэвалюцыйны рух, кажучы аб тым, што зараз, пры наступленьні капіталу на рабочую клясу, адсутнічае контр-наступленьне пралетарыяту на капітал, адарвала самаабарону рабочых ад контр-наступленьня, ня даўшы глыбокага марксыцка-ленінскага аналізу сучаснага міжнароднага становішча. Гэтым самым няправільна арыентавала арганізацыю ЛКСМБ і савецкую грамадзкасьць па пытаньні сучаснага міжнароднага рэвалюцыйнага руху, што супярэчыць пастановам XVI зьезду УсеКП(б) аб тым, што:

«Пралетарыят адказвае на наступ[illegible] капіталу разьвіцьцём стачачнага руху, выступленьнямі сялянаў, палітычнымі дэманстрацыямі цы[illegible] паяўнасьці элементаў перарастаньня эканамічных баёў у баі палітычныя. Працякаючы ва ўмовах рэвалюцыйнага ўздыму сусьветнага рабочага руху і рэвалюцыйных мас калёніі, які ўжо пачаўся, крызіс уздымае на больш высокую ступень контр-наступленьне пралетарыяту, вядучы да перарастаньня ў некаторых краінах крызісу эканамічнага ў крызіс палітычны і паскарае развязваньне грамадзянскіх войн у калёніях».

Бюро ЦК ЛКСМБ расцэньвае дапушчаную палітычную памылку «Чырвонай Зьмены», як права-апартуністычную.

2. Прыняць да ведама заяву рэдактара «Чырвонай Зьмены» тав. Платава аб прызнаньні дапушчанай палітычнай памылкі.

3. Прапанаваць рэдакцыі газэты «Чырвоная Зьмена» даць на старонках газэты крытыку сваёй памылкі, а таксама больш сыстэматычна асьвятляць пытаньні міжнароднага рэвалюцыйнага рабочага руху.

Пастанову апублікаваць у друку.

Паведамленьні

— **2-га сакавіка**, у 7 гадз. веч., у памяшк. таркому, Культпропам таркому КП(б)В склікаецца **НАРАДА РЭДАКТАРОЎ ШМАТТЫРАЖАК І НАСЬЦЕНГАЗЭТ** наступных прадпрыемстваў: чыгунка, «Полымя рэвалюцыі», «Энергія», «Бальшавік», «Ударнік», абутковая ф-ка, шчацінная ф-ка, «Камунар», «Дрэваапрацоўшчык», «Пралетары», «Беларусь», «Камунарка», «Кастрычнік», «Беларуская», скарняная, «Чырв. текстыльшчык», хлебазавод, Эльвод, ф-ка 8-та сакавіка, друкарня імя Сталіна, Менбуд, Белдзяржбуд, ф-ка рымароў, каўбасная ф-ка, «Чырв. хэмік», лямпавая ф-ка, Белсамупрамсаюз, Камвуз. Акрамя усіх вышэйпаказаных—абавязкова.

— **Дом Камуністычнае Асьветы імя Карла Маркса.** 2 сакавіка ў 19 гадз., пав. № 19,—групавая кансультацыя для дакладчыкаў—**аб дні 8 сакавіка.**

— 3 сакавіка, а 18 гадз. у Доме Камасьветы імя Карла Маркса (19 пакой) Агітмасаддзелам ЦК КП(б)Б склікаецца нарада ўпаўнаважаных ЦК і СНК па пасеўкампаніі.

— 3 сакавіка, у 18 гадз. адбудзецца пасяджэньне Мэтад-Бюро Культпропу ЦК КП(б)Б.

Павінны зьявіцца: **Лур'е, Поташ, Ошэраў, Клімковіч, Яцкевіч, Шокаль, Залатароў, Тартакоўская, Радзецкі;** запрашаюцца **Старавойтаў (БДВ) і Ноткін** (БДУ).

— **Культпроп Менгаркому КП(б)Б** паведамляе усіх слухачоў вячэрніх курсаў гарпартактыву, што 3 сакавіка ў 19 гадз., у залі Дому Камасьветы адбудуцца чарговыя заняткі. Заключная лекцыя тав. **Айзэнберга** па тэму: «Ленінская тэорыя імпэрыялізму».

— 4 сакавіка ў 19 гадз., у залі пасяджэньняў ЦСПСБ, адбудзецца інструктыўная нарада па пытаньні правядзеньня паказанага месячніку, павінны прадпрыемствам над савецкімі, гаспадарчымі ўстановамі. Усе вылучаныя на лінію ЦК саюзаў таварышы для правядзеньня паказанага месячніку, павінны зьявіцца сваячасова.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

Кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" Ад панядзелка, 2 сакавіка
НОВЫ АМЭРЫКАНСКІ ПРЫГОДНІЦКІ ФІЛЬМ
У СЬЛЕД
У галоўн. ролі выдатн. АЎЧАРКА РЫН-ЦІН-ЦІН
Рэжысэр ДЖЭРОМ СТОРМ
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ КІНО-ХРОНІКА САЮЗКІНО № 4 ЗА 1931 год.
Штодзённа 4 сэансы: Пачатак 1 сэансу ў 6 гадз. 2 " 7 гадз. 30 мін. 3 " 9 гадз. 4 " 10 гадз. 30 мін.
Папярэдні продаж білетаў у тэатр. рабоч. касе.
Асобы, якія спазьніліся, на сэанс НЕ ДАПУСКАЮЦЦА.
Каса адкрыта для 1 сэансу ад 4 з пал. гадз.

Кіно-тэатр КУЛЬТУРА Ад панядзелка, 2 сакавіка
новы савецкі фільм вытворчасьці трэсту Дзяржкінапрам-Грузіі ўсесаюзнага кіно-фота аб'яднаньня „Саюзкіно"
ВЕЛЬМІ ПРОСТА
драма ў 6-ці частках.
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ гастролі лепшых музычных сатырыкаў
ГАРЫНА і СЛАВЯНСКАГА
БІМ-БОМ
Каса адкрыта з 5 гадз. Пачатак сэансаў: у 7 г., 8 г. 45 м. і 10 г. 30 м.
Асобы, якія спазьніліся, на сэанс не дапускаюцца.

Сёньня, 2 САКАВІКА АДКРЫТЫ СПЭКТАКЛЬ Пач. а 8 гадз.
Беларускі другі дзяржаўны тэатр В Кіршон.
РЭЙКІ ГУДУЦЬ
П'еса ў 5 дзеях, 12 абразох.

Кіно „ЮНЫ ПІЯНЭР"
Апошнія тры дні 2-га, 3-га і 4-га сакавіка
эпізод барацьбы з бармацтвам
ШАКАЛЫ РАВАТА
ў 9-ці частках.
Пачатак сэансаў а 1 гадз. дня.
Каса—з 12 гадз. дня.

Кіно ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ Сёньня і штодня
савецкі фільм, вытворчасьці „Межрабпомфільм"
ДЗЯЎЧЫНКА са СКРЫНКАЙ
камэдыя ў 6-ці частках.
Рэжысэр Б. Барнэт.
У галоўных ролях: Анна Стэн, В. Фогель, І. Каваль-Самборскі, П. Поль.
Звыш праграмы: палітасьветфільм вытворчасьці «Саюзкіно»
МАРОЗАМ
Пачатак 1-га сэансу ў 6 гадз. Каса—з 4 гадз. 30 м.
Дзеці да 16-ці год НЕ ДАПУСКАЮЦЦА.

Камісія ЦКК РСІ даводзіць да ведама, што працяг сходу студэнтаў супольна з рабочымі па справаздачы КАТЭДРЫ АНТРАПАЛЁГІІ Беларускай Акадэміі Навук адбудзецца СЁНЬНЯ ў 19 гадз., у анатамічным корпусе (універсытэцкі гарадок).
На сход запрашаюцца навуковыя працаўнікі БАН, БДУ, дактары і настаўнікі.

Прыём заяў ад паступаючых У МЭДІНСТЫТУТ ПРАЦЯГНУТ да 10 САКАВІКА
Мэдработнікі павінны прадставіць даведкі райЗдраву, або адпаведных устаноў, якім яны падпарадкаваны, што ў выпадку залічэньня іх у мэдінстытут, яны будуць вызвалены ад працы.
Іспыты пачынаюцца з 3-га сакавіка.
ДЫРЭКЦЫЯ МЭД. І-ТУ.

БЕЛАРУСКІ БУДАЎНІЧЫ ІНСТЫТУТ
абвяшчае
ВЯСЕНЬНІ ПРЫЁМ
на БУДАЎНІЧАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ ІНСТЫТУТУ ў колькасьці 88 чал.:
па фабрычна-заводзкім будаўніцтве—22 чал.
па жыльлёвым " " —22 чал.
па агра-індустрыяльным " —22 чал.
па апалу і вэнтыляцыі " —22 чал.
УСЯГО—88 чал.
Прыём заяў з 25-га лютага па 10-га сакавіка г. г., штодзённа ў канцылярыі інстытуту з 9 да 12 гадз. дня.
Прыймовыя іспыты для тых, хто ім падлягае, пачнуцца 15-га сакавіка г. г.
Прыём праводзіцца згодна правіл прыёму, апублікаваных у даведніку НКА Беларусі БССР для асоб, паступаючых у навучальныя установы БССР на 1930-31 нав. год.
Адрас: МЕНСК, рог Універсытэцкай і Чырвонаармейскай № 42/8.
Дырэктар будаўнічага інстытуту Шаліма.

Праўленьне МЦРК даводзіць да ведама, што
КРАМА МЦРК № 89 (Ленінская, 3)
з 1 красавіка пераходзіць у
завры ты разьмеркавальнік прамтавараў ДЛЯ СТУДЭНЦТВА
гор. Менску.
4-га сакавіка роўна ў 8 гадз. вечара, у памяшканьні арг. мас. сэктару МЦРК (Савецкая, 43, 3-ці паверх, пакой № 4)
склікаецца
НАРАДА КААПБЮРО ЎСІХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ
на пытаньні сыстэмы разьмеркаваньня тавараў і выбараў крамнай камісіі пры разьмеркавальніку вышэй паказанай крамы
Праўленьне МЦРК.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ" Ад панядзелка, 2-га сакавіка
савецкі фільм вытворчасьці «Межрабпом-фільм»
БЕЛЫ АРОЛ
Драма ў 6-ці частках.
У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ: народныя артысты рэспублікі
В. І. Качалаў, Вс. Э. Мэйерхольд
і артысты Анна Стэн, К. І. Чувелёў.
Звыш праграмы—ПАЛІТАСЬВЕТФІЛЬМ
ЧЫРВОНАЯ МАЛАНКА
Штодзённа 4 сэансы: Пачатак 1-га сэансу а 6 гадз., 2-га—7 г. 30 м., 3-га—9 гадз., 4-га—10 гадз. 30 м.
Каса адкрыта з 4-х гадз.

Кіно „СПАРТАК" Ад панядзелка, 2 сакавіка
2-гі ТЫДЗЕНЬ 2-гі
пашыраны фільм
„НАПОЛЕОН-ГАЗ" у 7 частк.
Пач. сэансаў: I—7 г., II—8 г. 45 м., III—10 г. 30 м.
Каса—з 5 гадз.

Для здачы АБВЕСТКІ у газэту „ЗЬВЯЗДА" званеце па тел. 7-81

Менск, друкарня «Зьвязды».
Менск, галоўлітбел № 357.